Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

22 ВЕРАСНЯ 2007 г.
СУБОТА
№№ 180–181
(26045–26046)
Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

НА «ДАЖЫНКІ» — ДОБРАЕ НАДВОР'Е

У гэтыя выхадныя дні Беларусь будзе знаходзіцца пад уплывам вобласці павышанага ціску, таму будзе пераважаць сухое і малавоблачнае надвор'е, паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава. Уначы і ўдзень у асобных раёнах згусціцца туман. Ноччу будзе халаднавата і тэмпература паветра складзе 2—8 градусаў цяпла.

Па паўднёва-ўсходняй палове рэспублікі на глебе, а месцамі і ў паветры, чакаюцца замаразкі да мінус 3 градусаў. У сувязі з гэтым Рэспубліканскі гідраметэацэнтр рэкамендуе сельскім гаспадаркам не пакідаць у полі выкапаныя бульбу і караняплоды. У дні правядзення рэспубліканскага фестывалю-кірмашу для працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2007» у Рэчыцы сіноптыкі абяцаюць сухое і малавоблачнае надвор'е. Гэтай ноччу тут будзе 2—5 градусаў цяпла. На глебе месцамі слабыя замаразкі ад нуля да мінус 3 градусаў. Удзень у Рэчыцы ў гэтыя выхадныя дні будзе да 15—18 градусаў цяпла.

БЕЛТА.

КАЛІ ХЛЕБНА ДЫ ЦЁПЛА, ТО І ЖЫЦЬ ДОБРА

У Рэчыцы праходзіць рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2007». Сёння з удзелам кіраўніка Беларусі Аляксандра Лукашэнкі адбудзецца цырымонія ўшанавання пераможцаў рэспубліканскага спаборніцтва.

Фота Мікалая БЯЛЬКОВІЧА.

А ўчора Рэчыца трымала экзамен перад усёй рэспублікай на ўменне прымаць гасцей і адзначаць самае галоўнае вясковае свята, калі падводзяцца вынікі напружанай работы. А гасцей тых было многія тысячы. І гэта не толькі афіцыйныя дэлегацыі ўсіх абласцей краіны, пераможцы рэспубліканскага спаборніцтва, але і дэлегацыі з гарадоў Свіднік (Польшча), Камрат (Малдова), раён Паўночнае Бутава Масквы (Расія), якія з'яўляюцца пабраціма-мі Рэчыцы. На свята прыехалі таксама госці з суседніх абласцей Гомельшчыны (Бранскай і Чарнігаўскай) і Паўднёва-Заходняй адміністрацыйнай акругі Масквы.

Чакалі на свята працы ўсіх, хто хацеў папрысутнічаць на ім. З гэтай мэтай, напрыклад, 21 і 22 верасня былі арганізаваны спецыяльныя аўтобусныя рэйсы з Гомеля, і інтэрвал паміж імі складаў 20—25 хвілін. Акрамя таго ў сродках масавай інфармацыі было аб'яўлена, што ўсе ахвотныя могуць прыехаць у Рэчыцу і на сваіх аўто. На ўсіх пад'ездах да горада былі ўстаноўлены пано, на якіх змешчана інфармацыя аб напрамках руху да трох парковак. Шлях да іх таксама ўказвалі спецыяльныя знакі і інспектар Дзяржаўтаінспекцыі. Ад месцаў парковак у цэнтр горада і назад людзей перавозілі аўтобусы і маршруткі. Працавала і патрульная паставая служба.

Горад сустрэў гасцей сонцам, асенняй пазалотай і барвамі дрэў, клумбамі-кветкамі, шматлікімі стэндамі, бігбордамі, расцяжкамі, добраўпарадкаванымі вуліцамі і прыгожымі будынкамі.

Цэнтральная вуліца горада — Савецкая. Тут з дзевяці гадзін раніцы пачала працаваць выстава «Горад майстроў», дзе шырока і маляўніча былі прадстаўлены бондарства, разьба па дрэву, скань, саломапляценне, ткацтва, ганчарства, вышыўкі, гальванапластыка і ювелірная коўка, і нават карамельнае мастацтва.

Пераходзім з аднаго боку вуліцы на другі і здзіўляемся разнастайнасці вырабаў, у якіх адчуваецца цяпло руплівых рук, талент і старанне майстроў. Вось Святлана Ушакова з Полацкага дома рамёстваў дэманструе прадметы вязання — панчохі, гетры, накаленнікі і іншыя тавары з вярблюджай і сабачай поўсці.

Побач размясціўся са сваімі ганчарнымі вырабамі народны майстар з Мазыра, удзельнік міжнародных выстаў у Бельгіі, Югаславіі, Фінляндыі, Індыі, Італіі, Польшчы, Іране Міхаіл Васкоўскі, які дэманструе фігуры півавара, ганчара, мазырскага ваяводы. Адна з работ называецца «А я хачу лятаць». Усё зроблена выдатна і з лёгкім гумарам.

Шмат народу сабралі ткачыхі Астаповіч Настасся і Ганна з вёскі Дуброва Лельчыцкага раёна, адна з якіх працуе на станку, а другая цягне кудзелю. Жанчынам за 70 гадоў, але яны яшчэ заўзята спяваюць у хоры. Ганна Сямёнаўна пры гэтым яшчэ і маці-гераіня. У яе 11 дзяцей, і ўжо 12 праўнукаў.

А вось у Сяргея Клімовіча са Светлагорска іншае хобі і даволі рэдкае. У яго — мастацкая апрацоўка сярэдневяковых ювелірных вырабаў з металу. На вачах у людзей ён робіць копіі старажытнарускіх манет. Тут жа і рыцарскія даспехі, выраблены яго рукамі. Хто хоча, можа апрануцца ў іх, узяць у рукі кап'ё і сфатаграфавацца.

Міма іх праходзяць у кальчугах, шлемах і іншых рыцарскіх прыкідах (сякеры, нажы і г.д.) члены клуба ролевых гульняў і гістарычнай рэканструкцыі СВВ (садружнасці вольных вандроўнікаў), навучэнцы Гомельскага каледжа машынабудавання Аляксандр Шэін і Аляксандр Фёдараў, і ўвага людзей адразу пераключаецца на іх. Нехта з прысутных цікавіцца, можа і тыя ўступяць у паядынак. Не, не дачакаліся.

А што гэта там дружна тоўпяцца мужыкі і ўсё стараюцца сфатаграфавацца? Аказваецца, на адной пляцоўцы група прыгожых дзяўчат, жывых манекенаў, якія як бы ўяўляюць сабой мімозу, бярозку, лесавінку, баярыню і г.д. Іскрынка ў тым, што на дзяўчатах — вопратка з такіх нетрадыцыйных для яе матэрыялаў, як каласы збажыны, камыш, валакно пальмавых дрэў, бяроста, пілавінне і нават яловыя шышкі. Гэта патлумачыла кіраўнік гуртка «Фларыстка», майстар і выкладчык Гомельскага аграрна-тэхнічнага каледжа Таццяна Ярац.

Шмат цікавага можна было пабачыць яшчэ на вуліцы Савецкай, але вось ужо пад гукі аркестра па ёй крочаць афіцыйныя дэлегацыі абласцей, пераможцы рэспубліканскага спаборніцтва, творчыя калектывы. Яны накіроўваюцца да гарадской плошчы, дзе знаходзіцца галоўная канцэртная пляцоўка. Там і адбылося ўрачыстае адкрыццё рэспубліканскага фестывалю-кірмашу і ўшанаванне яго ўдзельнікаў, якія занялі другія і трэція месцы. Ганаровыя дыпломы, каштоўныя падарункі і грашовыя прэміі ім уручалі старшыня арганізацыйнага камітэта фестывалю-кірмашу, намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Іван Бамбіза і міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід Русак.

На свяце бойка ішоў гандаль, народ з цікавасцю глядзеў выступленні прафесійных і самадзейных артыстаў. Рэчыца гуляла і весялілася да позняга вечара, калі неба над горадам расквецілася яркім феерверкам.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Фота БЕЛТА.

Каля стэнда Рэчыцкага хлебазавода.

Фота Мікалая БЯЛЬКОВІЧА.

Узнагароды хлебаробам уручае намеснік прэм'ер-міністра Іван БАМБІЗА.

«ДЭТЭКТАР РЫЗЫКІ» ДЛЯ ЗАКОНАПРАЕКТАЎ

Беларусь першая на постсавецкай прасторы будзе выяўляць «крымінальныя схільнасці» законаў на стадыі іх падрыхтоўкі.

Недасканаласць заканадаўства не толькі істотна ўскладняе працу праваахоўных органаў, натхняе непакараных злачынцаў на новыя лічбы справы, але падчас «моцна б'е» па сумленных людзях, шкодзіць усяму грамадству. Вось чаму вельмі важна, каб у краіне прымаліся бездакорныя і эфектыўныя законы. А для гэтага патрэбна не толькі грунтоўна працаваць над адпаведнымі праектамі, але і на стадыі падрыхтоўкі заканадаўчых актаў выяўляць у іх «слабыя месцы».

Своеасаблівым «дэтэктарам рызыкі» для законапраектаў будзе Навукова-практычны цэнтр (НПЦ) праблем умацавання законнасці і правапарадку Генеральнай пракуратуры краіны. Менавіта на гэтую ўстанову прэзідэнцкім указам № 244 ад 29 мая 2007 года былі ўскладзены абавязкі па правядзенню крыміналагічнай экспертызы законапраектаў. Праўда, паколькі гэтая справа новая, невядомая на прасторах СНД, то спецыялістам цэнтра давялося шмат папрацаваць над методыкай. Адпаведныя рэкамендацыі былі зацверджаны Генеральным пракурорам Пятром Міклашэвічам 17 верасня гэтага года. А рэальна крыміналагічная экспертыза законапраектаў, як паведаміў кіраўнік памянёнага цэнтра Уладзімір Хоміч, пачнецца з 5 кастрычніка. Беларусь стане першай на постсавецкай прасторы краінай, якая будзе выяўляць «крымінальныя схільнасці» законаў на стадыі іх падрыхтоўкі. Пакуль што невядома, які канкрэтна законапраект першым трапіць у поле зроку экспертаў цэнтра. Паводле слоў Уладзіміра Хоміча, да яго па тэлефоне паступіла ўжо першая заяўка: праверыць на фактары крымінальнай рызыкі праект закона «Аб правах спажыўцоў сацыяльна-бытавых паслуг». Між іншым, гэты дакумент, калі яму наканавана стаць законам, датычыць літаральна кожнага з нас, бо будзе рэгуляваць нашы ўзаемаадносіны з прадпрыемствамі жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Што датычыць дзеючых нарматыўных актаў, то праводзіць іх экспертызу ў цэнтры пакуль яшчэ не гатовыя. Адпаведныя метадычныя рэкамендацыі з'явяцца, напэўна, не раней 2010 года. Зрэшты, гэта не азначае, што цяперашнія законы і кодэксы засталіся па-за ўвагай спецыялістаў памянёнай установы. Як паведаміў Уладзімір Хоміч, зараз эксперты цэнтра вывучаюць праблемы, звязаныя з пакараннем за крымінальныя злачынствы. На думку дырэктара НПЦ, за некаторыя злачынствы ў нашай краіне прадугледжана празмерна жорсткае пакаранне, тэрміны зняволення неапраўдана доўгія. Да канца 2007 года эксперты павінны прадставіць свае высновы на гэты конт і, магчыма, калі да іх прыслухаюцца парламентарыі, беларускае крымінальнае заканадаўства праз некаторы час будзе «мякчэйшым».

Апроч таго, спецыялістам НПЦ да лістапада гэтага года неабходна вызначыць пералік адміністрацыйных правапарушэнняў карупцыйнага характару.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

У БЯЛЫНІЧАХ ЗАЦВІЛІ ЯБЛЫНІ

Ігар ГАЙДА паказвае зацвіўшую галінку з пладамі і кветкамі.

Фота БЕЛТА.

НА ВЯСКОЎЦА ЎПАЛА... ПЛІТА

23-гадовы вясковец апынуўся пад шасціметровай жалезабетоннай плітой, якая, упаўшы, прыціснула ногі пацярпелага.

Здарэнне адбылося ў вёсцы Казенкі Мазырскага раёна. Як паведаміў «Звяздзе» памочнік начальніка Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў, гэта адбылося пры рамонце на тэрыторыі воданапорнай вежы. На момант прыбыцця выратавальнікаў на месца здарэння жыхарам прылеглых дамоў з дапамогай дамкратаў удалося прыпадняць пліту і вызваліць пацярпелага. Вясковец з пераломам правага сцягна быў дастаўлены ў бальніцу.

Ігар ГРЫШЫН.

МАЦІ ПАКІНУЛА ДЗІЦЯ... У КАНТЭЙНЕРЫ

Жыхарка пасёлка Ноўка, што ў прыгарадзе Віцебска, у кантэйнеры для смецця знайшла... немаўля. Паведаміла аб гэтым у міліцыю. Хлопчыка шпіталізавалі ў рэанімацыйнае аддзяленне Віцебскай абласной клінічнай бальніцы.

Установлена, што дзіця каля 11 гадзін раніцы нарадзіла ў сваёй кватэры 43-гадовая жанчына. Яна ў цяжкім паслядродавым стане была шпіталізавана ў гінекалагічнае аддзяленне радзільнага дома. За свой жудасны ўчынак жанчына можа быць пазбаўлена волі на тэрмін да 5 гадоў, альбо атрымаць абмежаванне свабоды таксама на «пяцігодку».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЕЎРА ПЕРАСЁК МЯЖУ Ў ТРЫ ТЫСЯЧЫ РУБЛЁЎ

Грошы

Сёлетняя восень выдалася надзвычай складанай для долара ЗША: рэпутацыя цвёрда-канверсоўнай валюты істотна падпсавана на сусветным валютным рынку, дзе абменны курс USD у адносінах да еўра ставіць рэкорд за рэкордам па падзеннях.

Учарашні дзень не стаў выключэннем: рэкорднае ўмацаванне еўравалюты ў адносінах да долара на сусветных біржах працягвалася. Напрыклад, каля 11 гадзін раніцы за 1 еўра плацілі 1,4110 долара, тады як гадзінай раней за 1 еўра давалі 1,4095 долара. Гэта значыць, за параўнальна невялікі час еўрапейская валюта падаражала ў адносінах да валюты ЗША на сусветным рынку на 0,1 працэнта. Ціск на долар, паводле меркаванняў экспертаў, аказвае значнае зніжэнне працэнтных ставак Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША, на якое Злучаныя Штаты пайшлі, каб не дапусціць крызісу на рынку нерухомасці.

Рэха сусветных падзей дакацілася і да Беларусі — курс еўра пераскокнуў мяжу ў тры тысячы рублёў за 1 еўра.

— Звязана гэта з тым, што курс еўра павысіўся ў адносінах да курсу долара на сусветным рынку, — каментуе сітуацыю **начальнік упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі Анатоль ДРАЗДОЎ.** — Курс беларускага рубля прывязаны да долара ЗША, таму калі USD падае ў адносінах да еўра, то падае і курс беларускага рубля. Мы не рэгулюем курс долара і курс еўра — гэта праблема Еўрапейскага Цэнтрабанка і Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША. Наша самая галоўная задача зрабіць так, каб захаваць стабільнасць нацыянальнай валюты і стабільнасць цэн у краіне, з чым зараз мы спраўляемся.

Эксперт «Звязды», дэкан эканамічнага факультэта БДУ, прафесар Міхаіл КАВАЛЁЎ выказаў у размове з нашым карэспандэнтам меркаванне, што долар ў адносінах да еўра крыху яшчэ выраўняецца. Праўда, на доўгім адрэзку часу — на працягу аднаго-двух гадоў — дойдзе да суадносінаў — 1,5 долара за 1 еўра.

— Тады, — сказаў эксперт, — 1 еўра будзе каштаваць каля 3,5 тысячы беларускіх рублёў. Аднак нічога страшнага, на думку Міхаіла Кавалёва, не адбудзецца. Беларусь прадае тавары сёння ў асноўным у Еўропу, у зону еўра, і іх канкурэнтаздольнасць будзе павышацца. Для айчынных вытворцаў такі расклад толькі на руку.

— А што датычыцца насельніцтва? — запыталіся мы ў прафесара.

— Стане даражэй ездзіць на адпачынак у краіны, дзе ходзіць еўра. Аднак можна адпачываць там, дзе карыстаюцца доларам, напрыклад, у Егіпце.

Нялішнім таксама будзе перагледзець насельніцтву і адносіны да захоўвання сваіх зберажэнняў, лічыць Міхаіл Кавалёў.

— Няма нічога больш выгаднага, як трымаць свае зберажэнні ў беларускіх і расійскіх рублях, — рэкамендуе эксперт. — Расійскі рубель у адносінах да долара ўмацоўваўся ўвесь год і наступны год — не выключэнне. Калі вы ўкладзяце сёння 100 долараў у расійскі рубель, то да канца наступнага года ў вас напэўна будзе ўжо 120 долараў. 20 працэнтаў — гэта сёння вельмі нядрэнная даходнасць.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ФЕСТЫВАЛЬ ПРЫГАЖОСЦІ «БЕЛЫЯ РОСЫ»

У мінскім Палацы мастацтваў праходзіць першы Міжнародны фестываль прыгажосці «Белыя росы», у якім бяруць удзел больш як 100 цырульнікаў, візажыстаў, дызайнераў пазногцяў і фатографаў з краін СНД. Удзельнікі на працягу трох дзён будуць змагацца за Кубак «Садружнасці». Спаборніцтвы праходзяць у чатырох блоках: «Мастацтва прыгажосці», «Фатаграфія», «Выяўленчае мастацтва» і «Ды-джэінг».

БЕЛТА.



Фота БЕЛТА.

КУРСЫ ВАЛЮТ	Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.09.2007 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
	1 долар ЗША	2 149,00	USD	25,0540
	1 еўра	3 026,54	10 UAH	49,7844
	1 латвійскі лат	4 277,47	1000 BYR	11,6469
	1 літоўскі літ	876,30	EUR	35,3186
	1 чэшская крона	109,86	Курс у гандлёвых кампаніях (на 21.09.2007 г.)	
	1 польскі злоты	803,50	USD	2135 / 2210
	1 расійскі рубель	85,77		
	1 украінская грыўня	428,13		

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісацца на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ISSN 1990 - 763X

РЭЦЭПТ БАГАТАГА КАРАВАЮ

Гаспадаркі Клеччыны нарошчваюць аб'ёмы вытворчасці, раўняюцца на моцных суседзяў і не забываюць пра гістарычныя традыцыі

Механізатар Сяргей Янучок задаволены: сёлета па выніках жніва ён быў прызнаны лепшым. Атрымаў грашовую прэмію і, што, напэўна, не менш важна, павялічыў свой «рэйтынг» сярод калег. Сяргей вось ужо шэсць гадоў працуе ў сельскагаспадарчым вытворчым кааператыве «Кухчыцы», прыйшоў сюды адразу пасля войска. Янучок родам з суседняй вёскі Тучы, а тры гады таму ён пераехаў у Кухчыцы, дзе атрымаў сучасны катэдж з усімі гарадскімі выгодамі. Жонка зараз у дэкрэтным водпуску — даглядае дзесяцімесячную дачку. Увогуле ў сям'і Янучкоў двое дзяцей (гадуецца яшчэ чатырохгадовы сынок), так што на бацькоўскія заробкі ўсе спадзяванні. Аднак грошай хапае — калі добра папрацуеш, то і атрымаеш няблага. Напрыклад, за жніво (якое ў гаспадарцы завяршылі даволі хутка — дзесьці за два тыдні) Сяргей зарабіў 1,5 мільёна рублёў, у дзень выходзіла каля 100 тыс. Так што стымул для плённай працы ёсць. Ды і тэхніка добрая — летась напрыканцы жніва Янучок пачаў «абкатваць» сучасны камбайн «Лексіён-560». Сёлета шмат у чым дзякуючы гэтай машыне і выйшаў у перадавікі.

Аднак, зразумела, не толькі за гэтага і вынікі падводзіліся па сукупнасці паказчыкаў. Таму насупраць кожнага прозвішча механізатараў пазначаны спачатку незразумелыя «ўмоўныя» тоны збожжа. Тут усё ў парадку і тоны самыя што ні на ёсць сапраўдныя, аднак камбайны ва ўсіх розныя. Каб адназіцъ справядлівасць і выводзіўся пэўны каэфіцыент. Самыя жорсткія патрабаванні да якасці работ: дапусціў брак — сыходзіш з дыстанцыі ў барацьбе за лідарства. Старшыня СВК «Кухчыцы» Міхаіл Кедык тут бескампрамісны, бо лічыць, што ўсё неабходна выконваць сумленна, рабіць «як для сябе». Гаспадарка даволі вялікая па плошчы — каля 5,8 тысячы гектараў сельскагаспадарчых палеткаў. У «Кухчыцах» трымаюць 3,5 тысячы свіней і 2,3 тысячы галоў буйной рагатай жывёлы (з іх 1,1 тыс. кароў). Жывёлагадоўля — галоўная крыніца даходаў, паколькі продаж малака і мяса адбываецца на працягу ўсяго года, а большасць прадукцыі земляробства рэалізуецца толькі са жніўня па снежань. Тым не менш, тут таксама заўсёды трэба «трымаць руку на пульсе» — дакладна вывучаць кан'юнктуру рынку. Дзяржаўны заказ трэба выконваць, яго ніхто не аспрэчвае, аднак па-за гэтымі абавязацельствамі — прастора для ініцыятывы. Адпаведна, у «Кухчыцах» звярнулі сур'ёзную ўвагу на рапс, як на адну з найбольш рэнтабельных сельскагаспадарчых культур. І амаль удвая пашыраюць плошчы пад ім, паколькі падлічылі, што такім чынам магчыма атрымаць добры даход. Трэба заўсёды грунтоўна пралічваць кожны крок, тады будзе прыбытак — так лічаць у «Кухчыцах».



Сяргей ЯНУЧОК — лепшы камбайнер сёлетняга жніва.

Як заўважыў Міхаіл Кедык, гаспадарка пад поўную патрэбу нарыхтоўвае ўласных кармоў, дадаткова закупляецца толькі бялковая сыравіна — у асноўным соевы і сланечнікавы шрот. Таксама сеюць больш чым 800 гектараў кукурузы, з іх каля 100 га ўбіраецца на зерне. Лепшыя ўраджаі збіраюць на ўчастках, дзе ўнесены арганічныя ўгнаенні — гной буйной рагатай жывёлы. Ён таксама ідзе на ўгнаенне кармавых севазваротаў, дзе вырошчваюцца кармавыя культуры. Ад якасці гною шмат у чым залежыць і ўраджайнасць палёў, на якіх ён укладзены.

Старшыня СВК «Кухчыцы» Міхаіл КЕДЫК і механізатар Ігар КАНДРАТОВІЧ на восеньскай сяўбе.

Фота Мікалая БЯЛЬКОВІЧА.

Удзельнік «Дажынак» — вадзіцель Дзмітрый ЖДАНОВІЧ.

Каб тут займалася не толькі вясковыя хлопчыкі і дзяўчынкі, а прыязджала і дзятва з райцэнтра.

— Трэба не толькі выраблять неабходную сельскагаспадарчую прадукцыю належнай якасці, — лічыць першы намеснік старшыні Клецкага райвыканкама Уладзімір Навумовіч, — а і паспяхова ёй гандляваць, рэалізоўваць з найбольшым прыбыткам. Вельмі важны момант — належныя ўмовы вытворчасці. Толькі такім чынам магчыма прыцягнуць у вёску неабходныя працоўныя рэсурсы. Многія сельгаспрадпрыемствы ўжо адмовіліся ад таго, каб падчас жніва альбо сяўбы арганізоўваць харчаванне механізатараў прама на полі, возяць работнікаў у сталовыя, дзе можна камфортна паесці. Нельга на людзях эканоміць, але павінны існаваць і патрабаванні — напрыклад, падчас выдзялення жылля. Летась у гаспадарках было пабудавана больш чым 70 дамікаў, кожны з іх на выканкаме атрымлівае статус службовага жыльфонду, абы каго сюды не засяляем, толькі патрэбных работнікаў.

Сёлета ў Клецкім раёне намалочана 83,2 тысячы тон збожжа, у сярэднім з кожнага гектара збіралі амаль па 40 цэнтнераў. Вынік мог быць і лепшым, калі б не капрызы надвор'я. Ужо ў бліжэйшыя некалькі гадоў на Клеччыне мяркуюць выйсці на мяжу ў 100 тысяч тон. Вяскоўцы шмат у чым раўняюцца на суседні Нясвіжскі раён, а таксама ўзгадваюць слаўныя традыцыі яшчэ радзівілаўскіх часоў, калі ў кожнага селяніна былі свае «рэцэпты» вырошчвання хлеба. Сённяшнія хлебаробы імкнуцца быць вартымі сваіх славутых продкаў. Дзмітрый Ждановіч заняў па Беларусі ганаровае трэцяе месца сярод маладых вадзіцеляў па адвозцы збожжа. Хлопец перайшоў на чацвёрты курс Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, займаецца на інжынерным факультэце. На канікулах дапамагае роднай гаспадарцы — СВК «Кухчыцы». Падчас жніва бацька працуе на камбайне, а Дзіма садзіцца за руль самазвала. І нядрэнна атрымліваецца...

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.
Клецкі раён.

Государственное производственно-торговое объединение «Белхудожпромыслы» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион по продаже: Лот № 1: административное здание (об. пл. 480,2 кв. м), здание склада (об. пл. 35,0 кв. м), расположенных по адресу: г. Борисов, ул. Минская, 21. Площадь земельного участка — 0,2509 га. Начальная цена — 115 500 000 бел. руб.; Лот № 2: вагончик (об. пл. 18 кв.м), пристройка для печатания ярлыков и марок (об. пл. 22,0 кв. м), производственный цех (об. пл. 842,3 кв. м), проходная (об. пл. 160,3 кв. м), расположенных по адресу: г. Борисов, ул. Комсомольская, 78. Площадь земельного участка — 0,1578 га. Начальная цена — 237 130 000 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект должна быть осуществлена в течение 30 календарных дней после подписания договора купли-продажи. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 23 октября 2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 22 октября 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. **Телефон (8017) 224-61-34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

Отдел образования Червенского райисполкома (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион по продаже здания школы (об. пл. 1082,6 кв. м), сарая кирпичного (72 кв. м), уборной (5 кв. м), котельной (83,3 кв. м), водонапорной башни-скважины, расположенных по адресу: Минская область, Червенский район, Смиловичский с/с, д. Кулики. Площадь земельного участка 3,1203 га (целевое назначение — для обслуживания зданий и сооружений Государственного учреждения образования «Куликовская базовая школа»). Начальная цена — 552 241 062 бел. руб. Задаток 10 % перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект должна быть осуществлена в течение 30 календарных дней после подписания договора купли-продажи. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 30 октября 2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 29 октября 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. **Телефон (8017) 224-61-34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

В извещении о проведении открытого аукциона по продаже административно-производственного здания (общ. пл. 734,8 кв.м), расположенного по адресу: г. Орша, ул. Белинского, 1а, опубликованном в газете «Звязда» от 18.09.2007 г., изменяется начальная цена: вместо 213 580 000 читать 222 760 000 бел. руб. с НДС.

На кантролі ўрада

ЭНЕРГІЯ ЛЕСУ

Драўняны апад, сухастой, ветравалы... сагрэюць малыя і сярэднія гарады

Можна шмат разважаць пра тое, якія страты панесла Беларусь пасля сумнавядомых у нашай краіне падзей з пастаўкамі расійскіх энерганосьбітаў. Выдаваць песімістычныя прагнозы наконт будучыні айчыннай эканомікі і чакаць з мора надвор'я. Урэшце, гэта прывядзе да яшчэ большых праблем. Іншая справа — не сядзець склаўшы рукі, а шукаць выйсце з няпростай сітуацыі. І трэба зазначыць, што шмат захадаў у гэтым напрамку ў рэспубліцы ўжо зроблена.

Як вядома, кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача, каб кожная чацвёртая гігакалорыя і кожная чацвёртая КВт/г у нашай краіне вырабляліся на мясцовых відах паліва. Паводле меркавання спецыялістаў, задача рэальная. А галоўнае — яна стварае перспектывы энергетычнай бяспекі для Беларусі. Урадам ужо прынята праграма пераходу на будаўніцтва мініЦЭЦ на мясцовых відах паліва для малых і сярэдніх гарадоў. А вось як яна ўкараняецца ў жыццё і якія праблемы тут існуюць? — адказ на гэтыя пытанні прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі шукаў падчас паездкі ў Вілейскі раён, дзе ён азнаёміўся з працай раённай мініЦЭЦ, арганізацыяй нарыхтоўкі, тэхналогіяй вытворчасці, транспарціроўкі і захоўваннем паліўнай шчапы для такіх мініЦЭЦ.

Вілейская мініЦЭЦ працуе на мясцовай сыравіне — драўняных шчэпках. Паводле меркавання міністра лясной гаспадаркі Пятра Сямашкі, каштоўнасць гэтага паліва ў тым, што яно цалкам узнаўляльнае. Прычым ніхто не вядзе гутарку пра тое, што неабходна ўвесь лес у рэспубліцы пусціць пад сякеру, каб ацяпляць жыллё людзей. Між тым, сёння ўся лясная высечка галоўнага карыстання больш як на 80 працэнтаў узнаўляецца ляснымі культурамі ўжо праз год. Да таго ж, драўнінны рэсурс — гэта не столькі высечка дрэў: на шчэпкі ідзе матэрыял, які літаральна валяецца пад нагамі — апад, сухастой, ветравалы. А значыць, гэты від паліва мае шэраг пераваг: ён дасць людзям цяпло, святло, ачысціць лес ад смецця. Больш за тое, нарошчванне яго выкарыстання адаб'ецца і на кошце электраэнергіі ў бок зніжэння. Калі цяперашняя цана газу складае каля 120 долараў за тону ўмоўнага паліва, то тона ўмоўнага паліва ў выглядзе шчэпак — «заважвае» прыкладна на 80 долараў.

А таму, лічыць намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Леў Дубовік, раённыя цэнтры, якія размешчаны ў лясістай мясцовасці, павінны ацяпляцца менавіта драўняным палівам. Што ж датычыцца газу, то для мініЦЭЦ ён стане запасным — будзе выкарыстоўвацца толькі ў асобных выпадках, напрыклад, пры моцным пахаладанні, ці ў выпадку перабояў з драўняным палівам.

На сёння ж у Беларусі рэалізуецца тры розныя пілотныя праекты мініЦЭЦ на мясцовых відах паліва, паведаміў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі. У Асіповічах на цеплаэлектрацэнтралі ўстаноўлена расійскае абсталяванне, у Вілейцы — сумесны праект з выкарыстаннем расійскага абсталявання, у Пружанах выкарыстоўваецца шведскае абсталяванне. «Гэта робіцца для таго, каб упэўніцца, — які праект для нашай краіны больш эфектыўны», — патлумачыў прэм'ер. У бліжэйшыя чатыры гады ў рэспубліцы плануецца пабудаваць 10 мініЦЭЦ. Пераход на мясцовыя віды паліва і стварэнне 10 мініЦЭЦ дазволіць зэканоміць 220 мільёнаў кубоў газу. А таму «такія станцыі для нашай краіны з'яўляюцца перспектыўнымі, паколькі яны дазваляюць не быць залежнымі ад газу», — зазначыў Сяргей Сідорскі.

Адказваючы на пытанне журналістаў наконт прадастаўлення Расіяй стабілізацыйнага крэдыту, нашай краіне Сяргей Сідорскі нагадаў, што дамоўленасць аб гэтым была дасягнута паміж прэзідэнтамі абедзвюх краін. Наш урад зрабіў усё для таго, каб сёлета адпрацаваць пакет дакументаў. У сваю чаргу міністэрствы фінансаў РФ і Беларусі ўзгаднілі ўсе неабходныя дакументы. Зараз яны знаходзяцца на разглядзе ў расійскім урадзе. На думку беларускага прэм'ера, дасягнутыя паміж двума прэзідэнтамі дамоўленасці павінны спрацаваць.

Ігар ШЧУЧЭНКА,
Мінск — Вілейскі раён.

Ёсць нагода

У госці да сланоў. Пешшу

А вы спрабавалі з'есці... слана? І не трэба. Асабліва сёння. Бо 22 верасня адзначаецца Міжнародны дзень абароны слоноў — калі гэтых жывёл не трэба ні раздаваць, ні купляць, ні есці, — выключна ўзгадваць, што, нягледзячы на свае памеры і сілу, слоны маюць патрэбу ў абароне. Найперш ад нас, людзей.

У гэты дзень ладзіцца асабліва свята ў Пермскім заапарку, дзе жыве любімец публікі, індыйскі слон Джоні. Яму ўжо больш за 40 гадоў (у няволі слоны жывуць 70—80 гадоў), але ад урачыстасцяў у свой гонар, а тым больш ад традыцыйнага пачастунку — торціка — Джоні ніколі не адмаўляецца. Паралельна ў заапарку звычайна праходзіць конкурс дзіцячага малюнка, прысвечаны сланам.

А вось па пасольстваў Тайланда, наадварот, у многіх краінах свету актывісты з аб'яднанняў абароны жывёл у гэты дзень праводзяць пікеты, накіраваныя супраць жорсткага абыходжання са сланамі. У Тайландзе некалькі тысяч (!) слоноў рэдкага віду выкарыстоўваюцца для таго, каб забаўляць турыстаў — дрэсіроўшчыкі вельмі жорсткімі метадамі прымушаюць жывёл танцаваць, маляваць, іграць на музычных інструментах, вазіць людзей. Каб прымусіць слоноў выконваць «заданні», іх пазбаўляюць вады і ежы, б'юць палкамі з цвікамі, а то і забіваюць сланіх, якія не хочуць разлучацца з дзецьмі... Пратэст сустрэць эксплуатацыі слоноў, трэба заўважыць, падтрымалі многія вядомыя палітыкі і зоркі шоў-бізнэсу, такія, як фотамадэль Імоген Бэйлей, акцёр Сцівен Сігал і іншыя. Аб'яднанні абароны жывёл заклікаюць турыстаў не наведваць краіну, у якой практыкуюцца такія жорсткасці, да той пары, пакуль не будзе прыняты спецыяльны закон у абарону слоноў.

Дарэчы, 22 верасня шмат у якіх краінах з'яўляецца знакавай датай і яшчэ па адной прычыне — гэта Сусветны дзень без аўтамабіляў. Гараджанам прапануюць скарыстацца грамадскім транспартам, веласіпедам, а то і «транспартам нумар 11» — сваімі нагамі, — каб хоць крыху зменшыць экалагічную шкоду і небяспеку на дарогах. Магчымасць прыгадаць, што такое чыстае паветра сёлета будуць выкарыстоўваць больш за 1000 еўрапейскіх гарадоў.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Ніжняя Тошчыца, што на Быхаўшчыне, — незвычайная вёска. Тут у сем'і ўзялі з сацыяльных прытулкаў 14 дзяцей. Малыя, якіх кінулі бацькі, выхоўваюцца ў чатырох прыёмных і дзвюх апякунскіх сем'ях. Больш нідзе ў акрузе няма такіх вёсак, дзе б знайшлі столькі новых бацькоў гаротныя дзеці.

ПРЫЁМНАЯ ВЁСКА

У двух Кірылаў будучыня будзе не змрочнай, а светлай і нават яркай.

У 6-гадовага Сяржы з'явіліся свае цацкі.

Насця і Оля ОСІПАВЫ разам з прыёмнай маці Надзеяй.

«Камарыкі» Раманьковых

На скрыжаванні вуліц у Ніжняй Тошчыцы спыняецца школьны аўтобус, з якога радасна вывальваецца дзятва. У дом Раманьковых спяшаецца цэлая група школьнікаў: 10-гадовыя двайняты Коля і Ваня, іх аднакласніца Саша і яе старэйшая сястра 15-гадовая Таня. Усе яны — прыёмныя дзеці Таісіі Фёдараўны і Рыгора Уладзіміравіча Раманьковых.

Раманьковы выгадавалі траіх сваіх дзяцей, якія цяпер дарослыя і самастойныя людзі. Гаспадар збірае малако для гаспадаркі, а яго энергічная жонка аднойчы засумавала ад надта спакойнага жыцця. Але ўбачыла ў раённай газеце аб'яву і адразу паехала ў Быхаўскі прытулак для дзяцей «Незабудка».

— Там напісалі, што можна ўзяць малых з прытулка, — тлумачыць Таісія Фёдараўна. — І я ўбачыла хлопчыкаў: маленькіх, хударлявых, у такіх жаласлівых калготачках. Коля і Ваня Камаровічы мне спадабаліся адразу. Гэта было тры гады таму, у 7 гадоў адзін важыў 17 кілаграмаў, а другі — 13! Нічога, вырашыла я, адгадуем гэтых «камарыкаў»!

Двайняты да сустрэчы з новай маці два гады жылі ў прытулку. Іх маці адправілі лячыцца ад алкагалізму, а бацька зусім адмовіўся ад дзяцей.

На ганку новага дома іх сустракаў Рыгор Уладзіміравіч, якога хлопчыкі адразу сталі называць бацькам. Суровы мужчына і гаспадар так расчуліўся, што і цяпер, калі ўзгадвае той дзень, горла мімаволі перахоплівае...

— Я прывык да іх, яны цяпер як мае дзеці, — толькі і сказаў нешматслоўны вясковец. — Мае дзеці! І больш не ведаю, што сказаць і як вам гэта растлумачыць.

Таісіі Фёдараўне тады расказалі, што ў хлопчыкаў запаволенае развіццё, і будуць праблемы. Але Коля ў першы дзень так хутка пералічыў буслоў на даху суседскай хаты, што, прабачце, у тупасць сваіх прыёмных дзяцей маці не паверыла. І праз месяц малыя паспяхова прайшлі камісію і пайшлі ў школу. У першы ж год адзін з іх прынёс пахвальную грамату. Цяпер 4-класнікі прыносяць са школы адзнакі не ніжэйшыя за 7.

Безумоўна, дзеля гэтага даводзіцца працаваць. Спачатку так цяжка было выпісваць літары, што і алоўкі ламаліся. Ды і цяпер маці ўважліва правярае памылкі — даводзіцца адно практыкаванне перапісваць да чатырох разоў, а бацька строга прымае залік па табліцы множання.

Час ідзе, Коля і Ваня перасталі хаваць цукеркі і іншыя гасцінцы пад падушкамі. Паступова бацькам удалося пераканаць малых, што ў іх ніхто нічога не адбярэ.

— Я не ведаю, як бы мы без іх жылі, — прызнаецца Таісія Фёдараўна са слязамі ў вачах. — Гэта нашы дзеці, і ўсё!

Без ежы, бялізны і любові

Калі з двайнятамі ўсё так добра склалася, прыёмную маці сталі ўгаворваць узяць на выхаванне яшчэ дзяцей. «Чаму б і не?» — памеркавалі Раманьковы. Так у іх сям'і з'явіліся дзве сястрычкі — Таня Стасева і Саша Шываннікава. Каб выдзеліць дзяўчынкам асобны пакой, гаспадарам давялося правесці перапланіроўку дома. Затое цяпер сёстры жывуць у прасторным светлым пакоі з печкай.

За сталом каля акенца яны старанна робяць урокі. Саша спачатку прыносіла са школы «чырвоны» ад ручкі настаўнікаў дзённік, а ў ім — пераважна двойкі. Не, на яе нікто не лаяўся, а дзяўчынку ўсімі сіламі імкнуліся падтрымаць і дапамагчы ёй. Проста раней не было каму займацца яе вучобай.

— Маці піла, і трэба было ёй тазікі насіць, калі станавілася дрэнна, — прастадушна расказвае дзіця. — А тут маці Таіса дапамагае мне рабіць урокі і... любіць мяне.

Таня нават здзіўляецца пытанням, ці падабаецца ёй у доме Раманьковых. Проста дапытлівым дарослым цяжка зразумець, як яны вялікай сям'і. Бульбу збіралі талакой, цяпер перайшлі на моркву. Дзяўчынкі дапамагаюць на кухні, а хлопчыкі — у двары. Усе дзеці разумеюць (і нават ганарацца гэтым), што дом і гаспадарка — гэта таксама і іх, а таму ім не трэба нагадваць, што трэба пакарміць куранят альбо дапамагчы бацьку ў рамонце.

Таісія Фёдараўна называе сваіх дзяцей малочнікамі, таму што ўсе яны велькі любяць хатнія малочныя прадукты. У двайнят любімая страва — малочны суп. А бацька да выхадных выпек тазік рэзнікаў. Разам з малаком альбо віна-градна-сунічным кампотам — неўзялі дзяцей, афармілі дакументы і чакаюць рашэння ўладаў яшчэ дзве.

— Не, я не чула пра другую такую вёску ў суседніх сельсаветах, дзе было б столькі прыёмных дзяцей, — прызнаецца старшыня Верхнятошчыцкага сельскага Савета Ларыса Перапечына. — Мне падаецца, што гэта з добрага прыкладу і лёгкай рукі Раманьковай у нас пайшла такая справа.

Да слова, у Таісіі Фёдараўны ёсць два браты. І іх жонкі, гледзячы на свячку, таксама ўзялі да сябе дзяцей. Ларыса Калбасава — прыёмная маці брата і сястры. А другая нявестка, Алеся Калбасава была яму квіток на праезд і прагнала з дому.

Цяпер у яе зноў вялікая сям'я і шмат клопатаў, але Надзея Расімаўна толькі ўсміхаецца і запэўнівае, што праблем няма. Ну, амаль няма — калі шчыра. Цяпер Надзеі Расімаўне трэба раней уставаць, пазней класціся, а вольны час проста знік. Але ўсё гэта зусім не псуе настрой гаспадыні і, дарэчы, станоўчым чынам адбілася на фігуры.

— Самае цяжкае — гэта школа і ўрокі, — прызнаецца прыёмная маці. — Малыя зусім адсталі, асабліва ў вывучэнні моў. Я тут разам з імі нават нямецкую мову вымушана ўзгадваць. Але думаю, настаўнікі дапамогуць. Галоўнае, што дзецям тут падабаецца, а мяне яны сталі адразу называць мамай.

11-гадовая Насця не хоча ўзгадваць ранейшае жыццё. Маўляў, жылі дрэнна, і ўсё.

— Дзяўчынцы ў жыцці дасталося гора: пры бацьках-п'яніцах менавіта ёй даводзілася даглядаць меншых дзяцей і паралізаваную бабулю, — расказала Надзея Расімаўна. — Яна і прала, і ежу здабывала. Мне казалі, што малыя жылі на сметніках і там жа харчаваліся... А цяпер мы разам пачалі новае жыццё!

У доме хапае месца і цяпла

У Зінаіды Мацвееўны Кавальковай ужо два гады жывуць два Кірылы, сімпатычныя 5-гадовыя хлопчыкі. Яна ніколі і не думала, што калі-небудзь стане прыёмнай маці.

— Так, дзеці сталі дарослыя і з'ехалі вучыцца, але гэта не самая галоўная прычына, — гаворыць жанчына. — Калі бачыш, як шмат абдзеленых увагай дзяцей, то ўзнікае вялікае шкадаванне і жаданне дапамагчы. Калі мы можам, то чаму б і нам гэта не зрабіць?

Ідэю ўзяць дзяцей на выхаванне Надзеі Расімаўне падказалі дарослыя дзеці. Праўда, яна іх будзе выхоўваць адна, без мужа. Той калісьці стаў так піць, што жанчына вырашыла прадаць карову, нарыхтаваць сена і ўсё, што ёсць у хаце, прапіць, а потым з'ехаць. Але ў апошні момант перадумала. Карову прадала, а грошы аддала мужу, каб ён купіў сабе кватэру. Ён купіў, але ў ёй не жыве, а толькі прапісаны.

Яна расказала, як прыязджала ў прытулак і знаёмілася з Кірылам. Там шмат дзяцей, і кожны стаіць і чакае, што гэта прыехалі па яго. Першы Кірыл у тры гады трапіў у прытулак з праблемнай сям'і з Магілёва. А Кіра (так цяпер у новай сям'і клічуць аднаго з хлопчыкаў, каб не блытацца) родам з Бялыніцкага раёна, ён апынуўся ў прытулку ў паўгода і цяпер абсалютна забыўся на сваё ранейшае жыццё.

— Ён нічога не памятае і кажа, што гэта яго дом, — гаворыць яго новая маці. — І запэўнівае, што нікуды адсюль не паедзе. Што ж, цяпер абодва Кірылы — гэта неадэмная частка нашай сям'і. А ў нас у доме ўсяго хапае: пакояў, цацак, мульцікаў і, самае галоўнае, душэўнага цяпла і клопату.

Хлопчыкі з радасным іганнем носяцца па дварэ на сучасным самакаце і бесперапынна смяюцца. За імі з любоўю назірае бабуля Марыя Афанасьеўна. Яна, дарэчы, адразу сказала сваё важкае «так», калі дачка з мужам падзяліліся з ёй планамі ўзяць на выхаванне сірот.

— Я сабе не ўяўляю, калі шчыра, што б без іх рабіла, — паведаміла старая. — Дзеці — на працу, а я што? Сесці на лаўку? А так з малымі і пасмяёмся, і пасядзім-пагаворым. Я люблю іх. Ды і як малых не любіць? Яны такія добрыя — паглядзі...

Зінаіда Мацвееўна ўпэўнена, што яе прыёмных сыноў чакае зусім не змрочная і не воблачная, а светлая і нават яркая будучыня. Яны атрымаюць адукацыю і працу. Верагодна, што на гэтым шляху будзе яшчэ нямала праблем. Аднак Кавальковы лічаць, што ўсё можна пераадолець разам.

— Мы будзем расці і вучыцца, — гаворыць Зінаіда Мацвееўна. — Дай толькі Божанька, каб усё склалася.

Соль — не ў грашах, а ў дзецях

Дзіцячым галасам і ажыўленню ў вёсцы вельмі рады. Можа, гэта і ёсць перспектыва для гэтых мясцін?

Ніжняя Тошчыца — хоць цяпер і цэнтр сельскага Савета (тут жыве больш за 150 чалавек), але мясцовую гаспадарку, як даволі слабую, далучылі да суседняй. Працу знайсці цяжка, дзеці вяскоўцаў едуць у іншыя мясціны па заробкі і жытло. Ці верагодна, што тут застануцца прыёмныя дзеці, і Ніжняя Тошчыца атрымае другое дыханне і новае жыццё? Сёння, напэўна, сказаць цяжка. Пакуль жа вёска — проста рай для малых сірот, якія тут знаходзяць новых бацькоў і дамы, дзе яны адчуваюць сябе абароненымі.

— Бясспрэчна, мы радыя, што дзеці тут знайшлі сабе сем'і, — гаворыць Ларыса Перапечына. — Усе прыёмныя бацькі — людзі добрыя, і добра ставяцца да дзяцей. Глядзіш на малых і сэрца сціскаецца — такія яны пакрыўджаныя лёсам. Але калі яны знаходзяць новую сям'ю, то мяняюцца з часам. Я гэта бачу. З замкнёных яны ператвараюцца ў нармальных, вясёлых дзяцей, якія адчуваюць сябе на сваім належным месцы — у сям'і, дзе іх любяць.

Ніхто ў Ніжняй Тошчыцы нікога не ўгаворвае браць дзяцей. Працэс ідзе сам сабой. Будзем шчырымі, вяскоўцы па-рознаму ставяцца да прыёмных і апякунскіх сем'яў. Некаторыя лічаць, што прыёмнымі бацькамі становяцца, каб атрымліваць грошы. Тым больш, калі іншай працы не знайсці. Што ж, можа часткова гэта і праўда. Але чаму б не паверыць, што матэрыяльны інтарэс можа гарманічна спалучацца з імкненнем дапамагчы сіротам?

— Мне падаецца, што не ўся соль — у грашах, — выказала сваё меркаванне старшыня сельскага Савета. — Проста людзі любяць дзяцей.

— Гэта добрыя сэрцы і разумненне дзіцячага гора, — лічыць Зінаіда Кавалькова. — Хочацца няшчасных дзетак падтрымаць, дапамагчы ім жыць.

У Верхнятошчыцкім сельскім Савеце ўпэўнены, што вяскоўцы выгадуюць з прыёмных дзяцей дастойных людзей і работнікаў. Тут яны навучацца зносіцца з людзьмі і жывёламі, працаваць у сялянскай гаспадарцы. І нават калі не застануцца жыць у гэтых мясцінах, яны, атрымаўшы добрае выхаванне, заўсёды змогуць зарабіць сабе на жыццё і знойдуць сваё месца пад сонцам.

— Я хачу пажадаць, каб прыклад прыёмных і апякунскіх сем'яў з Ніжняй Тошчыцы стаў, у лепшым сэнсе, заразным, — падводзіць вынік Ларыса Перапечына. — Я зычу малым сямейнага цяпла. А іх новым бацькам — здароўя, каб гадавалі дзяцей.

Ілона ІВАНОВА,
Быхаўскі раён.

Таня СТАСЕВА і Саша ШЫВАННІКАВА збіраюць моркву для ўсёй вялікай сям'і, якую сёстры лічаць сваёй роднай.

Таісія РАМАНЬКОВА і два яе любімыя «камарыкі» — двайняты Коля і Ваня КАМАРОВІЧЫ.

ЖЫВЁЛЫ ВІНАВАТЫЯ Ў АВАРЫЯХ

Сёлета на тэрыторыі Віцебскай вобласці ўжо адбылося пяць наездаў на розных жывёл. Зарэгістравана таксама восем наездаў на гужавы транспарт.

Як паведамілі супрацоўнікі групы агітацыі і прапаганды ДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама, быў выпадак, калі нават у салоне аўтамабіля жывёла стала прычынай ДТЗ, у выніку чаго загінула жанчына-вадзіцель. Кошка, якая была побач з пасажыркай на заднім сядзенні, адцягнула ўвагу вадзіцеля. Кіроўца не справілася з упраўленнем, машына перакулілася...

А нядаўна на аўтадарозе Лепель—Полацк ля вёскі Семянец маладыя палачанін наехаў на дзікага кабана, які раптам выбег на дарогу. «Жыгулі» ў выніку выкінула на сустрэчную паласу руху, дзе машына сутыкнулася з «Аўдзі-100», што ехала насустрач. Вадзіцель ВАЗа быў шпіталізаваны.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Прыёмная кампанія-2008

НА СТАРЦЕ АБІТУРЫЕНЦКАГА МАРАФОНУ

Прайшоў усяго месяц, як у беларускіх ВНУ фінішавала прыёмная кампанія, а абітурыенты ўжо распачалі падрыхтоўку да новых уступных выпрабаванняў. Балазе, галоўныя «правілы гульні» прэтэндэнтам на студэнцкі білет добра вядомыя — у наступным годзе, як, дарэчы, і два апошнія гады, асноўнай формай здачы ўступных іспытаў застанецца цэнтралізаванае тэсціраванне. Праўда, кіраўнікі творчых ВНУ лічаць, што дзеючы сёння парадак залічэння ў ВНУ па агульнай суме балаў (профільны экзамен плюс вынікі тэсціравання плюс атэстат) для творчых спецыяльнасцяў не вельмі падыходзіць. А дакладней, атэстаты і агульнаадукацыйныя веды будучых майстроў мастацтва часта падводзяць. Паводле меркавання кіраўнікоў вышэйшых навучальных устаноў, якія павінны «вырошчваць» славутых мастакоў, акцёраў, музыкантаў і рэжысёраў, пры залічэнні ў творчую ВНУ трэба ў першую чаргу глядзець на аднаку за прафілюючы экзамен, а астатнія ўлічваць да яе дадаткова.

Аднак ці будуць пачутыя іх прапановы ў Міністэрстве адукацыі, мы даведаемся крыху пазней, а пакуль будучым абітурыентам трэба рыхтавацца да новага цэнтралізаванага тэсціравання. Усе ўжо даўно прызвычаіліся, што паступленне ў ВНУ без дадатковай пазашкольнай падрыхтоўкі амаль немагчыма, — усё ж такі колькасць прэтэндэнтаў на студэнцкі білет сёння ўтрая перавышае магчымасці ВНУ, і ніхто з іх не хоча заставацца за бортам. А паколькі ёсць устойлівы попыт, то будзе і прапанова. Рынак прыватнага рэпетытарства існаваў ва ўсе часы, але сёння гэта ніша, відаць па ўсім, асабліва прыбытковая — каб у гэтым пераканацца, дастаткова адкрыць любое рэкламнае выданне. З'явіліся нават цэлыя агенцтвы рэпетытараў з шырокім спектрам адукацыйных паслуг і рэпетытарамі некалькіх тыпаў: ад выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў да настаўнікаў школ, гімназій, ліцэяў і студэнтаў старшых курсаў. Выбірайце самі, што вам па кішэні (ад 3 да 10 умоўных адзінак за 2 акадэмічных гадзіны)... Дакладныя навукі каштуюць даражэй за гуманітарныя.

«Я не гарантую паступленне ў ВНУ. Усе мае вучні паступаюць і без гарантый. Усе без выключэння» — такія «сціплыя» рэкламныя аб'явы сёння можна сустрэць на старонках нават вельмі ўплывовых друкаваных выданняў. Сустракаюцца таксама і прапановы паскаранай падрыхтоўкі — рэпетытары бяруцца падрыхтаваць ахвотнікаў прайсці цэнтралізаванае тэсціраванне ў рэкордныя тэрміны і зноў-такі з гарантыяй паступлення. Многія маладыя людзі і сапраўды аддаюць перавагу заняткам з рэпетытарамі. Некаторыя спалучаюць гэтыя заняткі з заняткамі на падрыхтоўчым аддзяленні ВНУ ці падрыхтоўчых курсах пры навучальнай установе.

У верасні—кастрычніку якраз ажыццяўляецца набор абітурыентаў на доўгатэрміновыя васьмімесячныя падрыхтоўчыя курсы. Восем месяцаў — дастатковы тэрмін для таго, каб засвоіць новы матэрыял, ліквідаваць прабелы ў школьнай падрыхтоўцы і дэталёва разабрацца усе тэмы, пытанні і складаныя выпадкі. Фактычна падрыхтоўчыя курсы з'яўляюцца ўзаконеній формай рэпетытарства, са сваімі перавагамі і недахопамі.

Да плюсоў падрыхтоўчых курсаў можна аднесці іх кошт, больш даступны ў параўнанні, скажам, з аплатай працы рэпетытараў. Падругое, сама атмасфера ВНУ і зносіны з іх выкладчыкамі ўсяляюць у абітурыентаў упэўненасць. Да таго ж, на курсах можна супаставіць узровень уласнай падрыхтоўкі з патрабаваннямі вышэйшай навучальнай установы. І толькі падрыхтоўчыя курсы даюць магчымасць рыхтавацца да паступлення завочна, гэта калі ВНУ адпраўляе сваім слухачам кантрольныя работы і ўсе рэкамендацыі па выпраўленню памылак па пошце. Акрамя выканання кантрольных работ слухачы курсаў раз у месяц маюць магчымасць асабіста атрымліваць кансультацыі ў выкладчыкаў ВНУ. У некаторых навучальных установах існуюць таксама і дыстанцыйныя курсы, калі ўсе зносіны са слухачамі адбываюцца пры дапамозе электроннай пошты. Але мінусы ў гэтай формы падрыхтоўкі таксама ёсць. Напрыклад, на курсах не навучаюць з «азоў», а толькі сістэматызуюць і паглыбляюць вашы веды. Да таго ж, калі ў групе адначасова навучаюцца 25 чалавек, то не можа быць і размовы аб індывідуальным падыходзе.

Той, хто хоча больш увагі да сябе, павінен спыніцца на індывідуальнай падрыхтоўцы, якую сёння таксама прапануюць многія ВНУ. Групы індывідуальнай падрыхтоўкі налічваюць 3—5 чалавек, але гэта і больш дарагі від падрыхтоўкі.

Асобнай увагі заслугоўвае вопыт рэгіянальнага цэнтра тэсціравання і прафесійнай арыентацыі моладзі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Так, напрыклад, цэнтр праводзіць зрэз ведаў па прадметах уступных іспытаў пры паступленні на курсы і атэстацыю ў працэсе вучобы, а затым працуе з абітурыентам, так бы мовіць «кропкава», ліквідуючы прабелы і праблемныя пытанні. Супрацоўнікі цэнтра прапануюць таксама індывідуальныя псіхалагічныя і прафарыентацыйныя кансультацыі, а таксама групавыя заняткі з элементамі трэнінгу. Удзел у групавых кансультацыях дазваляе пазбегнуць тыповых памылак падчас уступных выпрабаванняў, псіхалагічна настроіцца і ўвогуле правільна арыентавацца ў патоках інфармацыі ў перыяд уступных выпрабаванняў.

Як сведчыць вопыт папярэдніх гадоў, даволі часта няўдачы абітурыентаў абумоўлены не недахопам ведаў, а недастатковай іх псіхалагічнай і «тэхналагічнай» падрыхтоўкай. Да таго ж, не сакрэт, што падчас выканання тэста многае залежыць ад хуткасці мыслення, уменя разумець прапанаваныя фармулёўкі заданняў і правільна распараджацца адведзеным часам. Але як і дзе можна набыць неабходныя для выканання тэстаў навыкі? Для гэтага існуе рэпетыцыйнае тэсціраванне. Для абітурыентаў удзел у рэпетыцыйным тэсціраванні — гэта ўнікальны шанц выявіць свае прабелы ў ведах, знайсці шляхі для іх устаранення і крытычна сябе ацаніць, паколькі школьная адзнака далёка не заўсёды адлюстроўвае рэальны ўзровень падрыхтоўкі. Да таго ж, падчас так званай «рэпетыцыі» ёсць магчымасць набыць навыкі работы з тэстамі, што асабліва важна для абітурыентаў, якія скончылі школу даўно і малазнаёмыя з тэставымі тэхналогіямі. А сёння пры паступленні нават на завочную форму ВНУ экзамены здаюцца пераважна ў тэставай форме.

Падрыхтоўкай і правядзеннем рэпетыцыйнага тэсціравання займаецца Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў, які, дарэчы, праводзіць і цэнтралізаванае тэсціраванне.

— І колькасць заданняў у тэсце, і структура тэста, і час, адведзены на яго выкананне, і нават бланк адказаў нічым не адрозніваюцца ад цэнтралізаванага тэсціравання, — тлумачыць дырэктар інстытута Мікалай Фяськоў. — Мы забяспечваем навучальныя ўстановы тэставымі матэрыяламі, а затым займаемся праверкай усіх тэстаў. Усяго мы плануем правесці тры раўнды рэпетыцыйнага тэсціравання. Першы раўнд пройдзе ў кастрычніку—снежні. Другі раўнд — у студзені—лютым і трэці раўнд — у сакавіку—красавіку. Рэпетыцыйнае тэсціраванне будзе праводзіцца па 14 вучэбных дысцыплінах: беларускай, рускай мовах, матэматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі, англійскай, французскай, нямецкай, іспанскай мовах, гісторыі Беларусі, геаграфіі, Сусветнай гісторыі навейшага часу і курсу «Чалавек. Грамадства. Дзяржава». Трэба заўважыць, што ў адрозненне ад цэнтралізаванага тэсціравання, на рэпетыцыйным тэсціраванні кола дысцыплін, па якіх можна праверыць свае веды, нікто не абмяжоўвае. Да таго ж удзельнічаць у «рэпетыцыі» прыёмнай кампаніі могуць і дзесяцікласнікі — нікто ім гэта не забараняе.

Для старшакласнікаў-мінчан Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў арганізуе рэпетыцыйнае тэсціраванне сумесна з Камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама на базе сталічных агульнаадукацыйных школ, гімназій і ліцэяў. Выпускнікі мінулых гадоў, навучэнцы прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, а таксама старшакласнікі з іншых рэгіёнаў змогуць прайсці рэпетыцыйнае тэсціраванне на базе ўстаноў, з якім Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў заключыў адпаведныя дагаворы. Мінскія старшакласнікі таксама могуць пратэсціравацца на базе ВНУ, хоць зразумела, што ў роднай школе экзаменаваць сябе больш камфортна і зручна. Але і да аўдыторыі ВНУ ім таксама не пашкодзіць прызвычаіцца...

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў звяртаюць увагу абітурыентаў на тую акалічнасць, што пад выглядам падрыхтоўкі да ЦТ асобныя дзяржаўныя і прыватныя ўстановы адукацыі правадзяць сваё так званае рэпетыцыйнае тэсціраванне. Але тэсты і тэхналогіі апрацоўкі вынікаў такога тэсціравання не маюць нічога агульнага з цэнтралізаваным тэсціраваннем. Таму, каб не стаць ахвярай падману, трэба ўважліва азнаёміцца з пералікам устаноў, упаўнаважаных праводзіць рэпетыцыйнае тэсціраванне па тэстах Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў ***(глядзі табліцу).***

— Падчас падрыхтоўкі да сёлетняга цэнтралізаванага тэсціравання на рэпетыцыйным тэсціраванні мы праверылі 185,5 тысячы чалавека-тэстаў і заўважылі, што яго ўдзельнікі зацікаўленыя не столькі ў высокім выніку, колькі ў аб'ектыўнай ацэнцы сваіх ведаў. І, як сведчыць наш вопыт, часцей за ўсё вынікі першых этапаў аказваюцца горшымі, чым пры паўторных спробах, — падкрэсліў Мікалай Фяськоў. — Трэці раўнд рэпетыцыйнага тэсціравання мы правядзём па спецыфікацыі цэнтралізаванага тэсціравання 2008 года. Спецыфікацыя — гэта своеасаблівы алгарытм, па якім складаецца тэст: яна вызначае яго структуру, колькасць заданняў у тэсце па кожнай дысцыпліне, узровень іх складанасці і гэтак далей. І хоць удзел у рэпетыцыйным тэсціраванні не можа гарантаваць прэтэндэнтам на студэнцкі білет стопрацэнтны поспех на цэнтралізаваным тэсціраванні, але дазваляе ім правесці своеасаблівую «разведку боем». На маю думку, гэтай магчымасцю трэба скарыстацца...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Установы адукацыі, на базе якіх будзе праходзіць І раўнд рэпетыцыйнага тэсціравання

№ п/п	Установа адукацыі	Месца размяшчэння пункта рэгістрацыі, тэлефон
1	Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі	г. Мінск, вул. Гікала, 9, к. 422, тэл. 293-86-49, 293-80-40
2	Міжнародны дзяржаўны экалагічны ўніверсітэт ім. А.Д. Сахарава	г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23, к. 107, тэл. 230-73-72
3	Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт	г. Мінск, вул. Захарава, 21, тэл. 284-78-03
4	Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт	г. Мінск, пр. Незалежнасці, 65, тэл. 237-39-25, 292-38-42
5	Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт	г. Мінск, пр. Незалежнасці, 99, тэл. 267-05-92, 267-72-68
6	Мінскі дзяржаўны політэхнічны каледж	г. Мінск, пр. Незалежнасці, 85, тэл. 292-12-34, 292-81-05
7	Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт	г. Брэст, вул. Маскоўская, 267, тэл. 8-0162-42-04-92
8	Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт	г. Віцебск, пр. Маскоўскі, 72, тэл. 8-0212-47-72-34
9	Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Я. Купалы	г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, тэл. 8-0152-73-01-01, 72-36-80
10	Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт ім. П.А. Сухога	г. Гомель, пр. Каст

У Беларусі з 2008 года будуць дзейнічаць новыя правілы забеспячэння дзяцей-сірот жыллём

Прэзідэнт Беларусі 20 верасня падпісаў указ № 439, якім унёс дапаўненні і змяненні ва Указ ад 29 лістапада 2005 года № 565 «Аб некаторых мерах па рэгуляванню жыллёвых адносінаў».

Дакумент выдадзены ў мэтах забеспячэння рэалізацыі дзецьмі-сіротамі і дзецьмі, якія засталіся без апекі бацькоў, канстытуцыйных правоў на жыллё, а таксама ўдасканалення прававога рэгулявання асобных пытанняў пастаноўкі грамадзян на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і прадастаўлення жылля.

Дзяржава пастаянна праяўляе клопат аб дзецях-сіротах і дзецях, якія засталіся без апекі бацькоў, і не можа пакінуць без увагі праблему забеспячэння іх жыллём.

У сувязі з гэтым указ дакладна вызначае дзяржаўныя органы, якія ажыццяўляюць пастаноўку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Гэта мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы або па месцы першапачаткаванага атрымання дзецьмі названага статусу, або па месцы прадастаўлення ім першага рабочага месца. Раней гэта ўскладалася на мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, якія прынялі рашэнне аб уладкаванні дзяцей на выхаванне, што выклікала пэўныя складанасці на практыцы ў выпадку, калі такія рашэнні прымаліся неаднаразова рознымі мясцовымі органамі ўлады.

Ва ўказе замацаваны абавязак мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў загадзя ўдакладняць даныя аб дзецях-сіротах і дзецях, якія засталіся без апекі бацькоў, маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў (штогод да 1 красавіка). Па выніках удакладнення гэтых даных будуць фарміравацца спісы дзяцей для забеспячэння іх сацыяльным жыллём у чарговым каляндарным годзе і планавацца сродкі на будаўніцтва (набыццё) такога жылля.

У мэтах выключэння неабгрунтаванай жыллёвай ільготы членам сем'яў разглядаемай катэгорыі дзяцей у адпаведнасці з дзеючымі правіламі ўказ вызначае, што жылыя памяшканні сацыяльнага карыстання будуць прадастаўляцца гэтым дзецям без уліку членаў іх сям'і. У адпаведнасці з новымі правіламі грамадзянам, якія ўзялі на выхаванне трох і больш дзяцей-сірот, сацыяльнае жыллё будзе прадастаўляцца не толькі на дзяцей-сірот, якія выхоўваюцца, але і з улікам непаўналетніх дзяцей саміх грамадзян. У выпадку спынення выканання функцый па выхаванню дзяцей названыя грамадзяне падлягаюць высяленню з сацыяльнага жылля. Пры гэтым ім прадастаўляецца раней займаемае жылое памяшканне або раўнацэннае на ўмовах заключанага раней дагавора найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду. Дадаткова адносна дзеючых правілаў дакумент замацоўвае права на атрыманне сацыяльнага жылля для асобаў, якія на дзень уступлення ў сілу ўказа за 29 лістапада 2005 года № 565 навучаліся ў дзяржаўных установах адукацыі па дзённай форме навучання, страцілі статус дзяцей-сірот у сувязі з дасягненнем узросту 23 гадоў і не знаходзіліся на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў з-за адсутнасці ў іх пастаяннага месца жыхарства (бацькі або адмовіліся ад іх пры нараджэнні, або не мелі пастаяннай прапіскі на момант пазбаўлення бацькоўскіх правоў). У мэтах забеспячэння сацыяльнай абароны названых асобаў сацыяльнае жыллё будзе прадастаўляцца ім пасля заканчэння ўстаноў адукацыі па месцы прадастаўлення першага рабочага месца або па месцы першапачатковага працаўладкавання.

Указам таксама ўдакладнены некаторыя пытанні пастаноўкі грамадзян на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і прадастаўлення жылля.

У прыватнасці, прадугледжваецца, што пры вызначэнні памеру агульнай плошчы жылля, якое прадастаўляецца грамадзяніну пры зносе аднаквартэрнага (блакіраванага) жылога дома, будынкаў і збудаванняў пры ім, якія належалі або належаць яму на момант зносу на праве ўласнасці, у сувязі з адабраннем зямельнага ўчастка для дзяржаўных патрэб не ўлічваюцца наймальнікі, а таксама грамадзяне, якія ўсяліліся ў жылы дом пасля прыняцця рашэння аб яго зносе (акрамя ўласніка, яго непаўналетніх і паўналетніх непрацаздольных дзяцей, непрацаздольных бацькоў, жонкі (мужа), а таксама непаўналетніх і паўналетніх непрацаздольных дзяцей членаў сям'і ўласніка).

Грамадзяне, якія прыбылі ў сталіцу з іншых населеных пунктаў, не прымаюцца на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў на працягу пяці гадоў з дня іх рэгістрацыі па месцы жыхарства ў Мінску. Паводле дзеючых правілаў, грамадзяне, якія пагоршылі свае жыллёвыя ўмовы ў сувязі з рэгістрацыяй па сваім месцы жыхарства ў Мінску грамадзян з іншых населеных пунктаў, не прымаюцца на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў на працягу пяці гадоў з дня пагаршэння жыллёвых умоў. Гэта абмежаванне створыць роўныя ўмовы пастаноўкі на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў для ўсіх грамадзян. Указ уступае ў сілу з 1 студзеня 2008 года.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Ян ВАСІЛЕЎСКІ, старшыня Гродзенскага райвыканкама:

«Не бывае года без прыродных катаклізмаў, але змагацца з імі можна»

Хлебаробы Гродзенскага раёна ўжо традыцыйна займаюць лідзіруючыя пазіцыі не толькі ў вобласці, але і ў цэлым у краіне. Не стаў выключэннем і гэты год — першае месца на Гродзеншчыне з сярэдняй ураджайнасцю 54 цэнтнеры збожжавых і зернебабовых культур з гектара. А ў СВК «Прагрэс-Верцялішкі» — 78, у СВК імя Дзеншчыкова — 65, у сельгаскааператывах «Абухава» і «Кастрычнік-Гродна» — па 60 цэнтнераў з гектара. Лічбы, аб якіх пераважнай большасці айчынных аграрнікаў пакуль даводзіцца толькі марыць, у Гродзенскім раёне для многіх сельгаспрадпрыемстваў — зусім не сенсацыя, а ўжо норма. І цалкам заканамерна, што шмат яго прадстаўнікоў і сёлета сярод пераможцаў і прызёраў рэспубліканскага спаборніцтва: Аляксандр Максімік з СВК «Зарэчны Агра» (трэцяе месца сярод камбайнераў), Віктар Рапецкі з СВК «Азёры» Гродзенскага раёна і Валерый Мілаховіч з СВК «Пагранічны»(першае і другое месца сярод камбайнераў кормаўборачных машын), Валянцін Сідлярэвіч з СВК «Пагранічны» (другое месца сярод вадзіцеляў), Антон Эйсмант і Аляксандр Башко з гэтай жа гаспадаркі (трэцяе месца сярод вадзіцеляў), Міхаіл Акуліч з СВК «Капцёўка» (другое месца сярод маладых камбайнераў), Антон Будрэвіч з СВК «Пагранічны» (першае месца сярод маладых вадзіцеляў).

Тым не менш старшыня райвыканкама Ян Васілеўскі, мяркуючы па нашай гутарцы напярэдадні рэспубліканскіх «Дажынак», далёкі ад нейкай эйфарыі, бачыць не толькі поспехі, але і недапрацоўкі, праблемы.

— Ян Янавіч, прагнозы ў сельскай гаспадарцы — рэч, вядома ж, няўдзячная і, тым не менш пэўныя арыенціры заўсёды вызначаюцца. Ці спраўдзіліся вашы спадзяванні па выніках сёлетняга жніва?

— Мы разлічвалі на большае. Сабралі 173 тысячы тон збожжа, а планавалі атрымаць каля 185 тысяч тон. І ўсё было зроблена на належным узроўні — гэта датычыцца і насення, і ўгнаенняў, і аховы раслін. Але засуха, на жаль, адыграла сваю негатыўную ролю. Шкада, безумоўна, але ў цэлым вынік можна лічыць дастойным, не горшым за мінулагодні. На кармавыя мэты для жывёлы збожжа хапае, наадварот, прадаём лішкі іншым. Да таго ж, у нас заўсёды ёсць такі выдатны рэзерв, як кукуруза на збожжа, якога сёлета плануем сабраць больш за 30 тысяч тон.

— Ці згодныя вы з тым, што беларускім сельгасвытворцам даводзіцца працаваць ва ўмовах рызыкоўнага земляробства?

— Сапраўды, усю Беларусь можна назваць зонай рызыкоўнага земляробства, паколькі ўжо не бывае і года без тых ці іншых прыродных катаклізмаў. Але змагацца з імі можна — у першую чаргу адпаведнымі гатункамі сельскагаспадарчых культур, сучаснымі тэхналогіямі іх вырошчвання. У прыватнасці, мы ў раёне прааналізавалі структуру пасяўных плошчаў і прыйшлі да высновы, што недабор збожжа адбыўся менавіта на яравых культурах — ячмені, аўсу, а азімыя практычна не пацярпелі. Значыць, трэба больш сеяць апошніх. З іншага боку, паколькі не абысціся і без яравых культур, вельмі адказныя задачы стаяць не толькі перад сельгасвытворцамі, але і перад нашай аграрнай навукай. Айчынныя гатункі, як правіла, надта высокасцябловыя, а да цяперашніх умоў надвор'я больш прыстасаваны культуры з таўсцейшым сцяблом, нізкарослыя. І гэта трэба лічыць пры распрацоўцы новых гатункаў.

— Вы сочыце за тым, як працуюць аграрнікі ў іншых рэгіёнах нашай краіны?

— Безумоўна. Калі працаваў на Бераставічыне, то сачыў за работай Гродзенскага раёна. Цяпер — за працай тых жа бераставічан, калег з Мастоўскага, Шчучынскага, Карэліцкага раёнаў Гродзеншчыны і іншых рэгіёнаў краіны. Кіраўнікі і спецыялісты нашых сельгаспрадпрыемстваў вельмі зацікаўленыя ў вывучэнні і ўкараненні ў сябе новых тэхналогій, перспектыўных гатункаў і разам з тым гатовыя падзяліцца сваім вопытам з іншымі. Той, хто прыязджаў да нас, са мной пагодзіцца.

— У чым жа, скажам так, асноўны канёк, дзякуючы якому Гродзенскі раён яшчэ з савецкіх часоў з'яўляецца флагманам беларускай сельгасвытворчасці?

— У першую чаргу, на мой погляд, раён моцны сваім кадравым складам, старшынёўскім корпусам. Адраджэнне вёскі ў нас пачалося не ўчора: яшчэ за савецкім часам у раёне будавалі шмат жылля і прыязджалі кадры з усёй краіны — і не горшыя, а добрыя. Важна і тое, што ў нас хутчэй праводзілася тэхнічнае пераўзбраенне, мадэрнізацыя сельгасвытворчасці. Укараняюцца лепшыя гатункі культур, перадавыя тэхналогіі, сучасная тэхніка сусветнавядомых марак... Даручы, варта адзначыць, што беларуская збожжаўборачная тэхніка з кожным годам становіцца лепшай. Спадзяёмся, што вытворцы будуць яе ўдасканальваць для эфектыўнай працы на плошчах не толькі з сярэдняй, але і з самай высокай ураджайнасцю.

— Відавочна, што павялічваць тую ж ураджайнасць збожжа з узроўню 20—30 цэнтнераў з гектара — гэта адно, і зусім іншае — з 50-ці...

— Далёка не ўсе рэзервы яшчэ задзейнічаны і ў нашым раёне. Ёсць гаспадаркі, дзе ўжо не лічаць за нейкае дзіва атрымліваць 70—80 цэнтнераў збожжа з гектара, а вось у іншых ураджайнасць на парадак ніжэйшая, хоць землі практычна такія ж.

Не супакойваемся мы на дасягнутым і ў малочнай жывёлагадоўлі. Так, у цэлым паказчыкі дастойныя: сярэдні ўдой на карову сёлета за восем месяцаў у параўнанні з тым жа перыядам мінулага года павялічыўся на 102 і склаў 4164 кілаграмы, а ў СВК «Кастрычнік-Гродна» — 5314, у СВК імя Дзеншчыкова — 5105 кілаграмаў. Кармоў дастаткова. Аднак яшчэ не ўсе фермы адпавядаюць сучасным патрабаванням, што з улікам нашага суседства з абласным цэнтрам, стварае яшчэ і кадравыя праблемы. Таму ў раёне зроблена стаўка на рэканструкцыю існуючых і будаўніцтва новых фермаў еўрапейскага ўзроўню з боксавым утрыманнем кароў і даянням у дайльных залах. У СВК «Кастрычнік-Гродна» такіх фермаў ужо чатыры, а ўвогуле ў гаспадарках раёна — семнаццаць. Неўзабаве ў сельгаскааператывах «Індура», «Путрышкі», «Прагрэс-Верцялішкі», «Скідзельскі» будуць уведзены ў эксплуатацыю яшчэ чатыры. Тым самым будзе зроблены яшчэ адзін крок у накірунку не толькі павышэння эфектыўнасці малочнай галіны, але і стварэння належных умоў для яе кадравага забеспячэння.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Фота БЕЛТА.

Сярод пераможцаў сёлетняга жніва — Мікалай ВАНДЗІЛОЎСКІ з Магілёўскай вобласці.

Па аўтамашыну і пашану

Дэлегацыю Баранавіцкага раёна, якая сабралася на «Дажынкі-2007», удалося сфатаграфаваць у самы апошні момант — прадстаўнікі раёна падышлі ўжо да аўтобуса.

На рэспубліканскія «Дажынкі», як правіла, едуць лепшыя працаўнікі, але сярод іх ёсць і самыя-самыя. Уладзімір Ганчароў з СВК «Крошын» намалаціў 2,5 тыс. тон збожжа і цяпер едзе ў Рэчыцу па аўтамашыну, бо заняў сярод камбайнераў Брэстчыны першае месца. Трэба адзначыць, што У. Ганчароў працуе ў кааператыве шафёрам, але падчас жніва перасеў на камбайн «Джондзір» і стаў лепшым у вобласці, абышоўшы канкурэнта з кааператыва на 500 тон.

Але ў СВК «Крошын» вызначыўся і маладзёжны экіпаж. Сяргей Стаўбунік, якому яшчэ няма 18 гадоў, і Валерый Пархановіч занялі сярод маладых камбайнераў другое месца па Беларусі. Так што для адной гаспадаркі такая колькасць лаўрэатаў — нямала.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Старшыня Маларыцкага райвыканкама Казімір ЛАПІЧ:

«Калі ёсць у нас сціплыя поспехі, то заслуга ў гэтым усяго двухтысячнага калектыву сельскіх працаўнікоў раёна»

Маларыцкі раён — самы паўднёвы ў краіне. Тыповае Палессе: 75 працэнтаў сельгасугоддзяў размешчаны на меліяраваных землях, якія, як казалі раней, маюць вельмі нізкі бал, гэта значыць, малаўрадлівыя. Яшчэ нейкія пяць-сем гадоў таму раён устойліва займаў апошнія радкі ў вобласці, асабліва па паказчыках развіцця жывёлагадоўлі. Апошнім жа часам выніковыя лічбы маларытчан набліжаюцца да раёнаў-лідараў. А што датычыць работы з кармамі для грамадскага статка, то, магчыма, у Маларыту хутка і па вопыт паедуць. Тут няма традыцыйна моцных гаспадарак, як у іншых раёнах вобласці, куды возяць дэлегацыі ды запрашаюць замежных гасцей. Але людзі на маларыцкіх сельгаспрадпрыемствах — працаўнікі, не горшыя за тых, каму пашчасціла жыць і працаваць у знакамітых гаспадарках. Пра развіццё сельскай гаспадаркі ў раёне мы гутарым са старшынёй райвыканкама Казімірам Лапічам.

— Казімір Віктаравіч, па выніках года вас, здаралася, хвалілі на розных нарадах. Удой на карову склаў амаль 4200 кілаграмаў. Для Маларыцкага раёна добры паказчык. Як прыйшлі да гэтага?

— Спачатку мы разам з кіраўнікамі галіны і спецыялістамі вызначылі арыенціры далейшага развіцця гаспадарак. Улічваючы, што нашы глебы — у пераважнай большасці пясчаныя, вельмі адчувальныя да ўсіх прыродных анамалій, — мы прыйшлі да высновы, што ў такіх умовах найбольш выгадна займацца малочнай жывёлагадоўляй. Малако дае пэўны прыбытак кожны дзень, гэта выстворчасць у доўгага гаспадара заўсёды прыносіць выгаду. Трымаючы ў памяці мудрае народнае выслоўе аб тым, што малако ў каровы на языку, распрацавалі сістэту работы з кармамі. Любы, не вельмі далёкі ад сельскай гаспадаркі чалавек, ведае, што самыя танныя і самыя эфектыўныя кармы — травы. У кожнай гаспадарцы імкнёмся наладзіць кармавы канвеер з найменшымі затратамі. Вельмі ўважліва падыходзім да падбору сумесяў траў, стараемся больш выкарыстоўваць злакавыя травы. Чаргуем кармавыя ўгоддзі з пашай, вар'іруем пасевы з улікам нашага няўстойлівага клімату. Словам, так сеем, каб не атрымалася, што бугор згарэў, унізе вымакла — і збірань няма чаго. У нас, як паказвае практыка, кожнае лета дэфіцыт вільгаці, дождж на рыхлых пясках патрэбен праз дзень. Але ж так не бывае. Таму падбіраем адпаведныя культуры, актыўна сеем проса, траву, якая называецца пайза. У гэтых траў перыяд вегетацыі складае 40 дзён. Ад пасеву да збору ўраджаю — крыху больш за месяц.

Праўда, не ўдаецца пакуль як след забяспечыць травы мінеральнай падкормкай. На гэтыя палеткі мінеральныя тукі трапляюць паводле астаткавага прынцыпу. Угнаенні зараз дарагія, і гаспадаркі не могуць, на жаль, дазволіць сабе іх пад поўную патрэбу. Стараемся, дзе можна, кампенсаваць такі дэфіцыт арганікай. Фермы паступова пераходзяць на сучасныя тэхналогіі работы, гэта значыць, стойлавае ўтрыманне жывёлы. З'яўляецца магчымасць больш нарыхтоўваць якасных кампостаў.

— Наколькі я ведаю, адну з гаспадарак вашага раёна будуць адзначаць на «Дажынках»...

— Так, СВК «Чырвоны партызан» атрымаў нядрэнныя вынікі ў нарыхтоўцы кармоў. Але ж адзнаку гаспадарка атрымала ў многім, так бы мовіць, авансам. Пры іх умовах шмат яшчэ трэба прыбаўляць у тэмпах развіцця. Нядрэнна выглядаюць па нарыхтоўцы кармоў і іншыя нашы сельгаспрадпрыемствы. У СВК «Ланская», напрыклад, назапашана 38 цэнтнераў кармавых адзінак на ўмоўную галаву жывёлы. У СВК «Ляхаўцы» ёсць 42 цэнтнеры. А нарыхтоўка яшчэ далёка не скончана. Мяркуем, што сёлетняю зіму сустрэнем з паўтарагадовым запасам корму.

— У мінулыя гады на рэспубліканскіх фестывалях-кірмашах, што падводзілі вынікі хлебаробскага года, не раз адзначалі мехатрады Маларыцкай райагрпрамтэхнікі. Як у гэтым годзе выглядаюць поспехі названага калектыву?

— Сёлета не падводзілі вынікі сярод механізаваных атрадаў, бо яны мала дзе засталіся ў краіне. Але ў індывідуальным спаборніцтве нашы механізатары занялі прызавыя месцы. Гэта камбайнер Сяргей Сцяпанавіч Юнкевіч і трактарыст Мікалай Васільевіч Алесюк. Яны, вядома, будуць ушанаваны па заслугах. Але варта сёння сказаць слова падзякі і ўсім астатнім, хто шчыраваў на палетках ад зары да зары, асабліва ў гарачую пару пасяўной, уборкі, кормanарыхтоўкі. І калі дабіўся рэальнага ўзроўню ў аграрнай галіне, то гэта заслуга ўсяго двухтысячнага калектыву працаўнікоў сельскай гаспадаркі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Хочаш у Вялікабрытанію — здай адпячаткі пальцаў

З 27 верасня Пасольства Вялікабрытаніі пачне выдаваць біяметрычныя візы, для афармлення якіх неабходны асабістая падача дакументаў, электроннае сканіраванне адпячаткаў пальцаў і лічбавы фотаздымак таго, хто хоча наведаць Злучанае Каралеўства.

— Наш адказ глабалізацыі — адкрытасць і адаптацыя, — адзначае Найджэл Гулд-Дэвіс, Часовы Павераны ў справах Вялікабрытаніі ў Беларусі.

Ідэнтыфікацыя па біяметрычных дадзеных якраз і ёсць той сродак рэагавання на сучасныя дынамічныя змены ў грамадстве, калі міграцыйныя патокі павялічваюцца, а разам з імі расце і колькасць ахвотных іміграваць нелегальна. Адпячаткі пальцаў не даваднесца здаваць (паводле брытанскага заканадаўства) дзецям да 5 гадоў і ўрадавым чыноўнікам, якія едуць у Вялікабрытанію па справах.

Вялікабрытанія далёка не першай уступіла на шлях «біяметрызацыі»: ёй папярэднічалі Францыя і іншыя еўрапейскія краіны, пры гэтым Беларусь — не першая дзяржава, у якой Брытанскае пасольства працуе ў такім рэжыме — літаральна нядаўна новаўвядзенні адбыліся ва Украіне, а дагэтуль — ажно ў 63 іншых краінах. Біяметрычны «аналіз» пройдуць не толькі госці Злучанага Каралеўства, але і пастаянныя жыхары — мяркуецца, што ў 2009 годзе ў грамадзян Вялікабрытаніі будуць біяметрычныя пашпарты.

Што да самога працэсу афармлення візы, ён будзе выглядаць прыкладна так: спачатку трэба падаць заяву (прычым робіцца гэта ў рэжыме он-лайн) і запісацца на прыём у пасольства ў зручны час, пасля таго трэба з'явіцца туды з раздрукаванай заявай і пашпартам. У самім пасольстве будуць знятыя біяметрычныя даныя. У далейшым гэта інфармацыя пераносіцца ў базу, дасылаецца ў Вялікабрытанію, дзе параўноўваецца з заявамі, што падаваліся ў мінулым, і базай даных аб парушальніках брытанскага іміграцыйнага заканадаўства. Вынікі параўнання вяртаюцца ў мінскі візавы аддзел і служаць абгрунтаваннем для выдачы візы або адмовы ў гэтым. Пры неабходнасці заяўніка могуць запрасіць на гутарку зноў і яшчэ раз зняць біяметрычныя даныя.

Тэрмін афармлення біяметрычных віз не падоўжыцца: ён па-ранейшаму будзе займаць не больш за суткі. Не зменіцца таксама і кошт віз.

Візавы афіцэр Брытанскага пасольства Кевін Чэпмэн пераканаў журналістаў у тым, што біяметрычныя даныя надзейна захоўваюцца і перасылаюцца па бяспечных лініях. Тэрмін захоўвання ў базе складзе 10 гадоў, пасля гэтага адпячаткі і фотаздымак будуць сцёртыя.

Прынамсі, да 27 верасня Брытанскае пасольства будзе зачынена: трэба ўстанавіць абсталяванне і падрыхтаваць персанал. Вопыт іншых краін паказаў, што біяметрычныя візы сябе апраўдваюць, спадзяёмся, новаўвядзенні ў нашым краі не стануць выключэннем.

Ала МАЧАЛАВА.

Леанід САВІНСКІ: «Я не скарджуся на стомленасць і не п'ю гарэлку. Трэба працаваць — значыць, трэба!»

Вадзіцель «Вучгас БДСГА» Горацкага раёна Леанід Мікалаевіч Савінскі стаў пераможцам Рэспубліканскага спаборніцтва па ўборцы збожжавых культур у Магілёўскай вобласці.

Леанід Мікалаевіч — жыхар аграгарадка Паршына. Яму 44 гады, больш за 20 гадоў ён працуе ў адной гаспадарцы. Дырэктар «Вучэбнай гаспадаркі Горацкай сельгасакадэміі» Мікалай Блахін (які сам, дарэчы, заняў другое месца ў Рэспубліканскім спаборніцтве як кіраўнік гаспадаркі) гаворыць, што Савінскі — выключна добры работнік: веды на ўзроўні спецыяліста і вельмі добрасумленны чалавек. «Калі б усе былі такімі, як вадзіцель Савінскі, мы б камунізм хуценька пабудавалі!» — усміхаецца кіраўнік гаспадаркі. Вынікамі працы лепшага вадзіцеля ў «Вучгасе» задаволены: і сабе грошай на ўборачнай зарабіў, і — гонар для сваёй гаспадаркі.

— Леанід Мікалаевіч, вы бераце ўдзел у «Дажынках-2007» у Рэчыцы. Хвалюецеся напярэдадні?

— На рэспубліканскае свята я ўжо еду шосты раз! Што ж, не буду хаваць, што мне прыемна быць лепшым. На сваім ГАЗ-53, у якога грузапад'ёмнасць 4 тоны, я перавёз за ўборку 2340 тон збожжа.

— Натуральна, давялося шмат папрацаваць для такога выніку?

— Даўно ў нас не было такога вялікага ўраджаю. У «Вучгасе» сёлета валавы збор збожжа склаў каля 20 тысяч тон, пры ўраджайнасці 59,2 цэнтнера з гектара. Можа і летась на палях было столькі ж, але ж страты з-за непагадзі былі вялікія. А сёлета ў сэнсе надвор'я ўборка была нармальная. І ўражай добры: угнаенні, новая тэхніка, сучасныя тэхналогіі — усё гэта адыграла сваю ролю. А мая роля — вазіць збожжа з поля на элеватар.

— Як вы працавалі ў час уборкі?

— Як і заўсёды: спаў роўна столькі гадзін, колькі патрэбна для аднаўлення сіл. Ніякага расслаблення. Раніцай пад'ём а 6-й гадзіне, і паехаў. Увечары да 22—23 гадзін, ды яшчэ сутак праз трое трэба дзяжурыць. З жонкай, якая працуе выхавацелькай у дзіцячым садку, ды дочкамі-студэнткамі нават не было калі пагаварыць. Сыходжу — яны яшчэ спяць, прыходжу — ужо спяць.

— У час вялікіх сельскагаспадарчых кампаній так працуюць многія, але менавіта вам удалося стаць лепшым.

— Я не скарджуся, што стаміўся, не прашуся адпачыць і не спяшаюся дадому. Я, напэўна, прызвычаіўся. Трэба працаваць — значыць, трэба! Пайшоў — і ўсё!

— Якія якасці характару трэба мець, каб дасягаць добрых вынікаў?

— Самадысцыпліна шмат значыць. І яшчэ я ніколі не захапляўся алкаголем. А таксама немалаважна хацець зарабіць. Для вяскоўца ўборачная — гэта магчымасць атрымаць больш грошай. Хочацца, каб вынікі працы адбіваліся на заробках.

— Вы цяпер адпачываеце пасля працоўных подзвігаў?

— Безумоўна, не. Я працую цяпер у жывёлагадоўлі. Але хутка трэба будзе вазіць буракі — і зноў паеду на палеткі.

— Які падарунак за сваю перамогу ў спаборніцтве вы разлічваеце атрымаць?

— Я мяркую, што гэта будзе камп'ютар. Праўда, я ўжо атрымліваў раней два камп'ютары і тры тэлевізары. Усе тэлевізары аказаліся дарэчы ў хаце. Адзін камп'ютар аддалі дачцэ, якая вучыцца ў Магілёве. Другі пакінулі дома — я ў Інтэрнэце правяраю вынікі латарэйных розыгрышаў. Калі сапраўды атрымаю яшчэ адзін камп'ютар, то ён паедзе ў Віцебск — там цяпер вучыцца мая другая дачка.

— Чаго чакаеце ад «Дажынак-2007»?

— Ведаеце, хораша ісці з калегамі ўрачыстым шэсцем па вуліцы. Але хочацца яшчэ і вольна паглядзець на горад, прайсціся па гандлёвых радах — на гэта вечна не стае часу. Можа, сёлета нарэшце атрымаецца?..

— Што б вы пажадалі ўдзельнікам свята ў Рэчыцы?

— Толькі адно: каб у наступным годзе яны зноў сталі пераможцамі і ўдзельнікамі новых «Дажынак»!

Гутарыла Ілона ІВАНОВА.

ЗУБР НАПАЎ НА КАМБАЙН І ПАКАШТАВАЎ КААПЕРАТЫЎНЫХ БУРАКОЎ

Зубр амаль на паўдня прыпыніў уборку буракоў у сельскагаспадарчым выторчым кааператыве «Доцішкі» Воранаўскага раёна. Аб гэтым паведамілі ў адміністрацыі СВК.

Зубр выйшаў на поле з ляснога масіву, спыніўшы работу механізавана звяна бураказдаў. Вялізная, прыкладна 800-кілаграмовая жывёліна перагарадзіла дарогу бураказборачнаму камбайну «Форвайт», механізатар якога каля трох гадзін цхенька прасядзеў у кабіне. Спецыяліст і два паляводы сельгасарганізацыі зусім рэціраваліся з поля. Акупаваўшы тэрыторыю, зубр разы тры спрабаваў бадноўць самаходны механізм. Затым, не спяшаючыся, еў буракі і валяўся на іх. У рэшце рэшт, грунтоўна патаптаўшы ўчастак буракоў, волат знік у лесе. Як адзначылі ў СВК, за час вымушанага прастою механізатар змог бы ўбраць больш як 40 тон буракоў.

Рычард САЛАТА, БЕЛТА.

«МТС — аграгарадкам»

ЗУБАВА: ЦЯЖКІ КОЛАС АРШАНШЧЫНЫ

Калі я прыехаў у чарговы раз у старажытную Оршу, адразу кінуліся ў вочы прыемныя змены. Наўкол нешта будуецца. Быццам увесь горад пераўтварыўся ў гіганцкую будаўнічую пляцоўку. Напрыклад, ужо да канца гэтага года плануюць дабудаваць новы аўтавакзал побач з чыгуначным. І ён стане сапраўднымі сучаснымі «аўтаваротамі» ў гэты буйны горад і край з багатай гісторыяй. Мясцовым жыхарам і іншагароднім гэта будзе вельмі зручна.

Орша знаходзіцца на скрыжаванні дарог. Тут кругласутачна дзейнічае буйны чыгуначны вузел. На старым аўтавакзале і зараз заўсёды вялікі паток пасажыраў, якія едуць у розныя канцы Беларусі. Пакуль людзі на аўтавакзале чакаюць «маршруткі» і аўтобусы, яны могуць зазірнуць у адзін з дылерскіх пунктаў МТС, суставага аператара, які лідзіруе ў краіне па колькасці абанентаў. І МТС яднае ўсіх, хто прыязджае сюды ці жыве ў прыгожым горадзе на беразе Дняпра...

Аршанскі павет Віцебскага ваяводства быў створаны яшчэ ў сярэдзіне XVI стагоддзя. Шмат таленавітых людзей нарадзілася на Аршаншчыне. Славуты, вядомы далёка за межамі краіны пісьменнік Уладзімір Караткевіч — таксама аршанец.

Разам з горадам другое жыццё атрымліваюць і навакольныя вёскі. Добра, што клапоцяцца ўлады і пра сельскую мясцовасць. У прыватнасці, у Аршанскім раёне да 2010 года на базе ўжо існуючых населеных пунктаў плануецца стварыць 15 аграгарадкоў. Першай «ластаўкай» стала вёска Зубава — цэнтральная сядзіба СВК «Купалаўскі».

У Зубаве пабудаваны новыя дамы. Праведзены работы па газіфікацыі. Адрамантаваны будынкі сельскага выканаўчага камітэта, дзіцячага садка, комплекснага прыёмнага пункта, урачэбнай амбулаторыі, лазні, аддзялення сувязі, крамы, кацельнай і г.д. Рэканструяваны будынкі сярэдняй школы і фізкультурнага-аздараўленчага цэнтра (на фота). А яшчэ правялі добрае ўпарадкаванне стадыёна. Па-сучаснаму зараз выглядаюць вуліцы. Не забылі і пра вытворчыя плошчы. У прыватнасці, адрамантавалі дарожнае пакрыццё механізаванага двара, пад'ездаў да пляцовак для захоўвання збожжа і да жывёлагадоўскіх фермаў... І не дарэмна: Аршанскі раён на працягу больш як 30 гадоў у Віцебскай вобласці з'яўляецца лідарам па вытворчасці збожжа. Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых перавышае 30 цэнтнераў з гектара. І сёлета традыцыйна сабралі багаты ўраджай.

Стабільнасць і добрыя перспектывы спрыяюць паляпшэнню дэмаграфічнай сітуацыі. Як паведамілі нам у Аршанскім райвыканкаме, за апошні год насельніцтва ў Зубаве павялічылася амаль што на 50 чалавек.

Безумоўна, аператар мабільнай сувязі МТС паклапаціўся, каб надзейная сувязь заўсёды была да паслуг вяскоўцаў, тых, хто прыязджае ў аграгарадок і наогул у раён. Якасная і даступная па цане сувязь ад МТС — гэта прыкмета новага жыцця вёскі XXI стагоддзя. Вялікія сродкі кампанія МТС выдаткавала, каб «мабілізаваць» Зубава, іншыя вёскі. І кожны аграгарадок, кожная вёска павінны атрымаць такую ж падтрымку ад МТС. Безумоўна, так і будзе. У прыватнасці, летась у Аршанскім раёне мабілізаваны аграгарадкі Арэхаўск і Вусце, а ўсяго ў Прыдзвінскім рэгіёне ў зоне доступу МТС каля сотні пасёлкаў новага тыпу, а колькасць базавых станцый сувязі МТС набліжаецца да 300! І гэта — вынік штодзённай напружанай работы тэхнічнага персаналу кампаніі МТС.

У той жа Аршаншчыне налічваецца больш як 260 населеных пунктаў, дзе пражываюць каля 38 тысяч чалавек. І, бясспрэчна, трэба зрабіць многае, каб кожны жыхар раёна мог заўсёды заставацца на сувязі. Асабліва ў гэтым маюць патрэбу тыя, хто жыве ў далёкіх вёсках.

У краі актыўна развіваецца турызм. Напрыклад, населены пункт Копысь нядаўна ўключаны ў адзін з турыстычных маршрутаў Прыдзвінскага краю. Турысты не пашкадуюць, калі возьмуць у дарогу мабільнік, падключаны да сеткі МТС.

Кампанія МТС, акрамя таго, што своечасова плаціць значныя падаткі ў мясцовы бюджэт, укладвае вялікія грошы ў падтрымку самых розных сацыяльных праектаў. І старыя і маладыя нашы землякі робяцца сведкамі сацыяльных ініцыятыў МТС. Хлопцы і дзяўчаты, у прыватнасці, атрымліваюць магчымасць праявіць свае выканаўчыя і мастацкія таленты падчас конкурсаў і фестываляў, якія падтрымлівае мабільны аператар.

Разам з МТС заўсёды зручна, дзе б ты ні знаходзіўся!

Вядучы рубрыкі Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Аршанскі раён — Віцебск.

ШЧОДРАЯ НІВА «КРЫЎСКА»

Сцяной стаіць пшаніца залатая… Як выходзіў летам у поле ці выязджаў туды Аляксандр Паўлавіч, дык заўсёды на памяць прыходзілі радкі гэтай песні. Напэўна, таму, што перад вачыма рассцілалася цэлае мора збажыны, налітай тугім зернем. Пшаніца, жыта, ячмень, трыцікале. 657 гектараў. Гуляюць па іх ветрыкі, гойдаюць на сваіх крылах каласы ды сонечным святлом ахоплена ўсё поле.

Важкі будзе ўраджай, большы за леташні, думаў у такія хвіліны старшыня сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва, звяраючы свае меркаванні з папярэднімі ацэнкамі галоўнага агранома Васіля Ананьева. Ага, важкі, згаджаўся той. Хоць зямлю і спякота, падобная на афрыканскую, душыла, і дажджы «расперазаліся», і віхурай збажыну паклычыла-пакруціла, але ўраджаю — быць! Бо вельмі ўжо стараўся калектыў аднадумцаў СВК «Крыўск», па навуцы ўсё рабіў, смела ішоў на эксперымент і шліфаваў яго.

Узяць хоць бы тую самую адмову па традыцыі араць поле пад збожжавыя культуры плугамі і замену гэтай тэхналогіі на безадвальную апрацоўку глебы. Што гэта дае? Аператыўнае правядзенне пасяўных работ, эканомію гаруча-змазачных матэрыялаў — да сар

Тэлесеткі

НАРОД ТРОЙЦУ ЛЮБІЦЬ

Падводзячы вынікі конкурсу на ролю «народнага вядучага», кіраўніцтва праграмы «Белорусское времечко» нечакана прызнала пераможцам не аднаго, а адразу трох кандыдатаў. Як і планавалася з самага пачатку, новымі вядучымі стануць харызматычныя мужчыны з пэўным жыццёвым вопытам — усе старэйшыя за 30 гадоў, жанатыя і сямейныя (у кожнага па двое дзяцей).

Нагадаем, на конкурс, які доўжыўся з 30 мая да 14 верасня, першапачаткова паступіла каля 400 заявак, з іх толькі 100 канкурсантаў былі дапушчаны на «кастынг» перад тэлекамерамі, і толькі 5 удзельнікаў выйшлі ў фінал. На мінулым тыдні гледачы канала «ЛАД» з дапамогай SMS-паведамленняў вызначаліся са сваімі перавагамі, і сімпатыі размеркаваліся амаль раўнамерна паміж Міхаілам Стрыжовым, Паўлам Філіпчыкам і Уладзімірам Сосніным. Зараз усе яны па чарзе будуць выконваць ролю трэцяга вядучага падчас прамых эфіраў праграмы «Белорусское времечко».

Мінчаніну Уладзіміру Сосніну да тэлебачання не прывыкаць — у свой час, скончыўшы ў Ленінградзе Касмічную акадэмію імя Мажайскага, ён быў размеркаваны на Байканур, дзе супрацоўнічаў з мясцовымі тэлевізійнікамі, нават вёў уласную гумарыстычную праграму «Музразвоз». Зараз ён займаецца камерцыйнай дзейнасцю, але навыкі працы ў эфіры, відаць, захаваліся добра.

За плячыма ў 41-гадовага Паўла Філіпчыка — музычная школа і армейская служба ў Германіі, а таксама праца следчага і вопыт кіравання фірмай па пашыўцы штор. Так што карысныя парады гледачам ён можа даць як мінімум у чатырох сферах.

Саміму старэйшаму з новых вядучых Міхаілу Стрыжову — 57 гадоў, і на дадзены момант ён займаецца культурна-арганізацыйнай работай у Баранавіцкім тэхналагічным каледжы. А яшчэ ён піша вершы і п'есы і мае вопыт рэжысёрскай працы ў тэатры.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Глядзіце!

ШЛЯХ ДА СЭРЦА ЖАНЧЫНЫ ЛЯЖЫЦЬ ПРАЗ... ПЕСНІ, ТАНЦЫ І ЎСЯКІЯ ХІТРЫКІ?

23 верасня на АНТ нарэшце пачнецца рэаліці-шоў «Тры халасцякі» — у сэнсе, з дзевяці прэтэндэнтаў застануцца толькі тры, якія набралі найбольшую колькасць анкет ад магчымых нявест. І тады ўжо мужчыны пачнуць выбіраць. Спачатку дзесяць паненак, якія найбольш спадабаліся завочна, потым — трох, якія пацвердзілі гэтае ўражанне пры знаёмстве. З трыма дзяўчатамі (ну літаральна як у песні пра султана) кожны з халасцякоў накіруецца на рамантычную вячэру і вечарынку ў клубе, дзе «адсеецца» яшчэ адна кандыдатка. Далей «тройкамі» — халасцяк і дзве нявесты — удзельнікі шоў амаль на два тыдні паедуць у Егіпет, а па вяртанні ў Мінск павінны будуць выбраць толькі адну, тую самую... Лепшую з трох пар, якая ў выніку атрымаецца, выберуць тэлегледачы. Што адметна, вяселля ў фінале ніхто з арганізатараў шоў не абяцае, хоць і спадзяюцца на гэта — а як інакш пераможцы падзеляць галоўны прыз, сямейны аўтамабіль? Але ўсё гэта будзе яшчэ не хутка. Пакуль жа нам удалося зазірнуць за кулісы першага шоў, на якім дзевяць халасцякоў дэманстравалі свае таленты.

Фота Сяргея ЧОРНАГА.

Прынцып лато: 3 з 9

Адзін з кандыдатаў падрыхтаваў міні-інсцэніроўку з «Рамео і Джульеты» Шэкспіра, прычым нават з дапамогай прафесійнай актрысы. Другі вырашыў здзівіць публіку сваімі танцавальнымі здольнасцямі — таксама з дапамогай прафесіянала, чэмпіёнкі Беларусі па спартыўных танцах, — відаць, спадзяваўся даказаць, што не ўсе партнёры дзяўчатам ногі адтоптваюць. Трэці расказваў анекдоты ў вобразе «новай рускай бабкі». Чацвёрты, заўзяты ігрок у КВЗ, зняў відэаролік — пародыю на серыял «Не радзіся прыгожай» (памойму, ва ўсіх дзяўчат пасля гэтага да яго павінны быць асабістыя рахункі). Двое спявалі — адзін у суправаджэнні акардэаніста, другі з пасільнай дапамогай вядучай шоў, Іны Афанасьевай.

— Разышліся тут... Хоць бы адзін бульбу пачысціў, ці што, — з'едліва каментаваў агляд талентаў нехта з гледачоў у нас за спінай. Можа, і варта было кандыдатам прадэманстраваць нейкія свае гаспадарчыя якасці. Але ж сярод халасцякоў — толькі адзін студэнт і адзін выкладчык, астатнія ўсё больш прадпрымальнікі ды кіраўнікі, а ім, самі разумееце, не да бульбы. Увогуле незразумела — што тут робяць усе гэтыя паспяховыя, і, відаць, самадастатковыя мужчыны?

— Яны добра іграюць на публіку, але ўсё ж хваляванне прысутнічае, — каментуе псіхолаг праекта, кандыдат псіхалагічных навук Анатоль Амяльковў. — Да мяне чалавекі тры падыходзілі, вучыліся здымаць напружанне. Увогуле, трэба разумець: халасцяк — гэта праблема. Калі чалавек малады, у яго бывае няўпэўненасць ва ўласных сілах, у старэйшых, наадварот, як правіла, ужо вельмі высокая самаацэнка, у некаторых абуджаецца спажывецкае стаўленне да жанчын.

— Ці можа ўвогуле фармат тэле-шоў вырашыць гэтую праблему?

— Ён можа спрацаваць у пазнавальным плане — адукаваць людзей, даць ім асэнсаваць, што гэта сапраўды праблема. Па-другое, ёсць тэрапеўтычны эфект — чалавек атрымлівае магчымасць паглядзець на сябе збоку, выправіць памылкі ў паводзінах, пачаць працаваць над сабой. Зараз ужо большасць удзельнікаў пачынае вучыцца кантактам, вучыцца глядзець на жанчын па-іншаму.

— Многія нашы чытачы, дарэчы, абураліся — чаму гэта халасцякі маюць прывілеі выбіраць дзяўчат, як быццам тавар?

— Прабачце, але ў мужчыны ёсць толькі ілюзія выбару — насамрэч, яго заўжды робіць жанчына. Менавіта яна вырашае, што ёй падыходзіць, і менавіта яна мае права на многія, так скажам, «жаночыя штучкі», якія моцнаму полу проста недаравальныя.

Дарэчы, наконт жанчын. Паводле меркавання псіхолага, усіх, хто даслаў анкеты на тэлевізійнае шоў, можна падзяліць на тры катэгорыі. Адны — сапраўды шчыра вераць, прычым ва ўсё: у гараскопы, гаданні, тэле-шоў. Другія — жанчыны-цынікі, якія імкнуцца «развесці» кавалераў на пасядзелкі ў рэстаране, адпачынак, падарункі ці што там яшчэ. Трэція не зусім адэкватна ўспрымаюць рэальнасць, і ім патрэбная ўжо сур'ёзная дапамога псіхолага, каб вырашыць унутраныя канфлікты.

— Вам трэба дапамога! — перарываючы размову, звяртаецца псіхолаг да вядучага праекта Жэні Булкі, які ў гэты момант спрабуе на дыбачках абысці нас.

— Мне? — палохаецца Жэня. — Мне не трэба!

— Трэба. Вам патрэбна менш націскаць на сваю сувядучую, даваляць ёй праявіць сябе.

— Ведалі б вы, як яна на мяне цісне, — скардзіцца Булка, але з парадай не спрачаецца.

— Трэба любіць людзей, і ўсе праблемы вырашацца, — з хітрынкай усміхаецца псіхолаг.

Стаўкі па-рознаму

Халасцякі, у строгіх чорных смокінгах, асцярожна абыходзяць дзверы з шыльдай «Паліцыя нораваў» (гэтыя дзяўчаты на кастынгу правяралі пашпарты — на прадмет пасведчання аб шлюбе, а на самім шоў менавіта яны «дастаўляюць» і забіраюць удзельнікаў са сцэны). Робяць выгляд, што прагульваюцца. Цікавімся, ці моцна хвалюцца.

— Ні кроплі, — упэўнена адказвае Валерый Елістратаў, прадпрымальнік, які займаецца абуткам. — Адчуваю толькі драйв. І канкурэнцыі ніякай не баюся — мне проста нецікава, што будуць рабіць іншыя ўдзельнікі, я пакажу сябе такім, які я ёсць. Мой сябар Яўген Курасаў напісаў песню, буду яе сёння спяваць. Па якіх крытэрыях выбіраў дзяўчат? Калі на фотаздымку бачыў бляск у вачах, а па анкеце пераконваўся, што жанчына разумная, вясёлая, без комплексаў... (Паводле даных АНТ, Валерый аддае перавагу бландзінкам. — **Аўт.**).

Самы старэйшы з удзельнікаў, 51-гадовы кіраўнік аўдытарскай фірмы Сяргей Коцехаў, патлумачыў свой удзел проста:

— Я стаю ля рэстарана — замуж позна, у зямлю рана... Вось і ў мяне тая ж сітуацыя. Быў жанаты, дзеці ўжо дарослыя і жывуць самастойна; дарэчы, сёння яны ў зале мяне падтрымліваюць. Зараз я вырашыў — чаму б не паспрабаваць яшчэ раз, калі ёсць такая магчымасць і ёсць выбар? Калі жанчына піша, што яна хоча мець сям'ю і дзяцей, гэта адразу ў мой бок, калі сустракаю фармулёўку «дажываць разам старасць», гэта, хутчэй, мінус. Безумоўна, звяртаў увагу на знешнасць кандыдатак, але важна яшчэ, каб гэта была разумная жанчына, добрая гаспадыня і чалавек, здольны выклікаць жаданне быць побач з ім...

Яшчэ адназм з удзельнікаў вядучыя задалі даволі вострае пытанне:

— У вас уласны бізнэс, тры тэлефоны, ноўтбук у якасці запісной кніжкі... Навошта вам яшчэ жонка?

— У ноўтбука вуглы вострыя, спаць нязручна, — выкруціўся кандыдат.

У ранейшых рэаліці-праектах АНТ абавязкова ўдзельнічалі прадстаўнікі канала. А вось на «Трох халасцяках» іх не будзе — і нават не таму, што ніхто не хоча жаніцца, проста гэта забаронена правіламі.

Спыніся, імгненне! А то будзе дубль

Калі вы думаеце, што апладысменты, крыкі, свіст і ўсякія іншыя эмоцыі ў зале — гэта мантаж, то нічога падобнага. Але і зусім натуральнай такую рэакцыю не назавеш. Проста па-за камерамі стаіць спецыяльны чалавек з плакатамі, на якіх намаляваны падказкі: «У» — гэта агульны расчараваны выдых, «А» — гэта зацікаўлена-радасны крык, ёсць таксама некалькі ступеняў апладысментаў — ад звычайных да доўгіх і бурных авацый. Зрэшты, напрыканцы здымак на плакаты ўсе забыліся і апладзіравалі ўжо так, ад душы.

— Кранчык, ідзі сюды! Гулі-гулі-гулі! — угаворвае прадзюсар Ягор Хрусталёў ці то тэхніку, ці то тэхнікаў. Трэба зрабіць «замалёўкі» груп падтрымкі, а яны, як быццам назнарок, уздымаюцца з месцаў і крычаць зусім не ў тыя моманты, калі трэба па сцэнарыю. Вось рэжысёры і ідуць на хітрасць — запісваюць крычалкі і плакаты асобна, а потым ужо манціруюць, куды трэба, у рэаліці-шоў.

— А пераможа ў нашым шоў той, хто знойдзе гузік! — вядучы Яўген Булка настолькі ўвайшоў у вобраз гангстэра, што не разлічыў рухаў, і яго пінжак пазбавіўся аднаго з неабходных элементаў. Увогуле, Жэня часам захапляўся ўсякімі імправізацыямі, якія потым даводзілася перапісваць — затое з яго перапалак з сувядучай і з рэжысёрам цалкам можна было б зрабіць асобнае шоў...

Дарэчы, адзін з халасцякоў, з кім мы размаўлялі да эфіру, прайшоў у фінал, другі — не. Каму і ў якім сэнсе пашанцавала, глядзіце 23 верасня на АНТ.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Прым'ера рубрыкі

ЗАБЫТАЕ? НОВАЕ? ВЕЧНАЕ!

Сённяшняй публікацыяй мы распачынаем новую рубрыку. Калі пераважная большасць папярэдніх артыкулаў была вынікам нашых навуковых пошукаў, разважанняў і высноў, то гэтыя прадугледжваюць і новы фармат нашых узаемаадносінаў з чытачамі і ўсімі людзьмі, якія цікавяцца традыцыйнай спадчынай беларускага народа. Хацелася б спадзявацца, што настаў той час, калі можна распачаць з вамі «жывы» дыялог (нешта накшталт «гарачай лініі»).

Мы шчыра спадзяёмся, што старонкі газеты «Звязда» стануць своеасаблівым завочным «круглым столам», вакол якога пачэснае месца «зоймуць» носьбіты і захавальнікі традыцый, удзельнікі і кіраўнікі фальклорных гуртоў, якія зацікаўлены ў пераемнасці традыцый, а таксама навукоўцы розных напрамкаў дзейнасці — адным словам, усе тыя, хто жыве ў рэчышчы традыцыі, хто сагравае душу яе святлом і верыць у тое, што наша на-РОДНАЯ культура яшчэ доўгі век будзе служыць беларускаму на-РОДУ, яднаючы яго і асвятляючы дарогу ў заўтрашні дзень.

Традыцыі і памяць, жывая повязь часоў, унукі і спадчына дзядоў, духоўны патэнцыял сучаснай моладзі, гонар за тых людзей, якія душой і сэрцам прыгарнуліся да адвечнага слова, песні, танцаў, паданняў і знаходзяць у іх асалоду і веліч — вось тое кола пытанняў, якое хацелася абмеркаваць у гэтай рубрыцы.

Мы гатовыя і да таго, каб паслухаць аповеды і паданні пра святыя крыніцы той ці іншай мясцовасці, пра сакральныя дрэвы і камяні, пра азёры, свяшчэнныя гаі і іншыя аб'екты сакральнай геаграфіі нашай роднай Беларусі. І, адпаведна, адказаць на вашы пытанні. Так сумесна, разам, агульнымі намаганнямі мы будзем ствараць незвычайную энцыклапедыю памяці і шчырай падзякі шматлікімі пакаленнямі нашых папярэднікаў. Магчыма, праз нейкі час гэта калектыўная энцыклапедыя будзе запатрабавана нашымі нявыпмслівымі ўнукамі не толькі ў якасці архіўнага дакумента, каб пацвердзіць свой радавод, а ў якасці сямейнага падручніка па гісторыі традыцыйнай культуры, па выхаванні адвечных абрадаў, рытуалаў і звычаяў.

Мы чакаем вашых лістоў на адрас рэдакцыі і тэлефонных званкоў з пытаннямі па нумары 292-21-03.

Ці вінаватая бабуля?

«У нашай сям'і на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў расказваюць паданне аб нечаканым здарэнні. Пасля вайны на хутары мае родныя пабудавалі хату. У дзень улазін бабуля ўзяла двух унукаў і пайшла да новабудоўлі. У адной руцэ несла гаршчок з кашай, а другой трымала малодшага ўнука. Другога — старэйшага — яна пусціла перад сабой. Праз чатыры гады старэйшы хлопчык утапіўся. З таго часу ў гібелі ўнука абвінавачваюць бабулю. Ці можна якім-небудзь чынам пракаментаваць гэта здарэнне?».

Марына К. *г. Гомель.*

Вытокі гэтага здарэння і абвінавачання трэба шукаць у глыбокай даўніне славянскіх традыцый. У акрэсленай сітуацыі сышліся дзве праблемы: асваенне «новага», а таксама роля і доля «першага» ў шматпланавай абрадавай практыцы. Аднак давайце па парадку. Нават яшчэ з часоў Старажытнага Егіпта, Рыма, культуры Міжрэчча, а пазней і славянскіх народаў вядомы звесткі аб тым, што ў парозе храма, палаца, замка, хаты, хлява закопвалі якую-небудзь ахвяру. Археолагі сцвярджаюць, што ў ахвяру маглі прыносіць чалавека, жывёлу, хатнюю птушку, нарэшце бронзавую выяву (у залежнасці ад прызначэння пабудовы). Гэта ахвяра прызначалася духу новабудоўлі. У XIX—XX стст. ролю такой ахвяры дамавіку выконвала сярэбраная або залатая манета, якую клалі ў чырвоным куце паміж трэцім і чацвёртым вянкамі.

Разам з тым этнаграфічныя звесткі мінулага сведчаць, што старыя людзі не вельмі хацелі праходзіць жыць у новае жытло, таму што існавала павер'е: той, хто першым пераступіць парог новай хаты, на працягу першага года жыцця ў новабудоўлі памрэ. Таму абачлівы беларус і прыдумаў вельмі эфектыўны ход вырашэння гэтай дылемы: паперад сябе людзі пускалі ў хату чорнага ката (радзей — чорнага пеўня). Так, жывёлу свядома прыносілі ў ахвяру. Аднак выбар прыпадаў менавіта на чорнага ката. Людзі верылі: ён абавязкова знойдзе паразуменні з нябачным духам новабудоўлі — дамавіком — і застанецца жывым.

Мы ўжо не раз у сваіх артыкулах расказвалі пра сімволіку ПЕРШАГА ў абрадах беларусаў. Зараз узгадаем некалькі прыкладаў. З аднаго боку, існавала павер'е: як сустрэнеш першы дзень Новага года, такім ён (год) і будзе. Або: што першым зойдзе ў хату ў Новым годзе, такім і будзе ўвесь год: калі мужчына — шчаслівым, калі жанчына, то нешчаслівым. Няпісаное правіла традыцыйнай культуры сцвярджае: што першым пакідае могілкі падчас пахавання, той першым сюды і вернецца (памрэ). Менавіта таму існавала правіла: першым з могілак павінен выйсці самы старэйшы сярод прысутных, той, хто нёс крыж.

Такім чынам, выходзячы з народных уяўленняў, можна меркаваць, што паданне, якое бытуе ў гэтай сям'і, мае пад сабой пэўныя падставы.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

У Брэсце праходзяць першыя Еўразійскія гульні

Першыя Еўразійскія гульні сярод юнакоў і дзяўчат пачаліся ў Брэсце. На парадку дня спаборніцтваў 11 відаў спорту: лёгкая атлетыка, кулявая стральба, вольная, барацьба на паясах, самба, дзюдо, веславанне на байдарках і каноэ і акадэмічнае, спартыўная гімнастыка, хакей на траве, валейбол.

Самыя вялікія дэлегацыі спартсменаў прыбылі з Расіі — 282 чалавекі і з Казахстана — 220 чалавек. Беларусь прадстаўляюць 227 юных спартсменаў. Вялікія групы ўдзельнікаў накіравалі таксама Таджыкістан, Узбекістан, Кыргызстан, Украіна, Малдова, Азербайджан.

Падчас урачыстага адкрыцця гульняў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар зачытаў прывітанне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ўдзельнікам спаборніцтваў, а Генеральны сакратар Еўразійскага Эканамічнага Згуртавання Георгій Рапота — прывітанне старшыні міждзяржаўнага савета ЕўрАзЭС Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Дзённік Вікі Ц.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

Не магла сабрацца з думкамі добры дзесятак дзён. Не тое нават каб не было што пракаментаваць — літаральна рука на паперу не паднімалася. А потым як быццам шкарлупінне трэснула, і адтуль паказалася дзюбка птушаняці. Думка прыйшла...

Проста пашанцавала

22.09.2007

Хоць бы раз на месяц знаходжу ў дзелавой пошце дзівакавацыя пасланні, нешта накшталт «дашлі гэты ліст як мінімум 4/9/20 блізкім табе людзям, і на працягу тыдня табе абавязкова пашанцуе». І абавязковыя запэўніванні напрыканцы — маўляў, можаце не верыць, але гэта працуе! А вось калі перарваць ланцужок і адпраўіць ліст у смецце, не будзе табе шчасця доўгі-доўгі час. Прычым да мяне пасланні перасылаюць добрыя знаёмыя, цалкам адэкватныя, сур'ёзныя, разумныя... Як быццам.

Раней, у давіртуальныя часы, мы называлі гэтыя лісты «пісьмамі шчасця». У нашым раёне, памятаю, іх пісала роўным вучнёўскім почыркам на аркушах са сшыткаў у клетку жанчына няпэўнага ўзросту, а потым упарта раскідвала лісты па паштовых скрынях (кодавых замкоў на пад'ездах яшчэ таксама не было). Іх падкідваў невядома хто ў партфелі, ляпіў на дзверы ліфта, прымацоўваў пад лічбамі кватэрных нумароў. Тэкст заўжды быў прыкладна адналькавы: «гэты ліст абышоў Зямлю тры (або трыццаць тры) разы і цяпер прыйшоў да цябе. Перапішы яго N разоў і на працягу N дзён адпраў далей. Калі ўсё гэта выканаеш, ужо ў бліжэйшы месяц чакай добрых вестак. Калі пакінеш у сябе, здарыцца непрыемнасць». З аднаго боку, непрыкрыты слоўны шантаж злаваў і выклікаў жаданне не тое што далей адправіць — на дробныя шматкі гэты ліст парваць, а потым яшчэ для вернасці спаліць! З другога — такая ўжо чалавечая псіхіка, усе мы прымхлівыя ў пэўных выпадках — думалася: а мо і праўда здарыцца непрыемнасць? А мо ўсе непрыемнасці апошніх дзесяці гадоў звязаны з тым, што я ў дзяцінстве ТОЙ ліст без увагі пакінула?.. Мабыць, таму і не перарываецца шлях «лістоў шчасця», колькі б ні тлумачылі псіхолагі існую шкоду — ты іх у сметніцу, а яны да цябе ў партфель, у віншавальнай паштоўцы хаваюцца, ты іх у акенца, а яны па e-mail пачкамі ідуць. Ну адкажы-ы — глядзіш, пашанцуе?

Увогуле, шанцаванне — рэч невытлумачальная, ніякая логіка тут і блізка не начавала. Часам бачыш чалавека — такая дрэнь, што і добрае слова аб ім сказаць агідна, а звязвацца тым больш. Думаеш: ну нічога, яшчэ расстаўіць усё на належныя месцы. А выпадае так, што ўсё ў яго коціцца, як сыр па маслу — кар'ера, кватэра, у князі з грозі і вялікае асабістае шчасце. Ды яшчэ ў латарэю, гад, выйграе. Насуперак усім прынцыпам сусветнай справядлівасці. Але, быць можа, гэта толькі «завідушчым вачам» падаецца збоку, што чалавек тройчы пераможца гульні з жыццём «Эх, шчасліўчык?».

Вось, скажам, галівудская «зорачка» Ліндсі Лохан, якая нядаўна была названа адной з самых жаданых жанчын у свеце. Дзіця з сям'і мільянераў, якое і само з трох гадоў стала зарабляць здымкамі ў рэкламе — прычым, заўважым, грошы атрымлівала немалыя. Больш за дзесяць год паспяховай акцёрскай кар'еры, 5 год у якасці папулярнай спявачкі. Выдатніца ў школе і ўніверсітэце, спартсменка, мадэль. На дадзены момант у 21-гадовай рыжавалосай прыгажуні Ліндсі — ганарары, блізкія да лічбы 10 мільёнаў долараў за фільм (!) і «імянная» лялька Барбі. А яшчэ — некалькі аўтамабільных аваryй, сур'ёзныя запоі і не менш сур'ёзныя праблемы з наркотыкамі (двойчы актрысе даводзілася праходзіць курс лячэння ў рэабілітацыйным цэнтры). Або «поп-прынцэса» Брытні Спірс, якую, нягледзячы на творчыя дасягненні і шматмільённыя прыбыткі, праследуюць нявыдачы: з двума дзецьмі на руках «зорную» фарбаваную бландзінку пакінуў муж, давялі да істэрыкі бясконцыя скандалы папарацы, а з суіцыдальнага настрою і наркатычнай залежнасці Брытні потым выцягвалі ўрачы (заўважым, у той жа клініцы, што і міс Лохан). Ну і хто рызыкне сказаць, што дзяўчатам пашанцавала ў жыцці? Безумоўна, можна скептычна заўважыць, маўляў, нам бы іхнія праблемы — але, паверце, быць бедным і здаровым (ва ўсіх сэнсах) усё ж лягчэй, чым багатым і хворым...

Адзін знаёмы псіхолаг у якасці «хатняй» тэрапіі прапаноўвае лічыць, што табе УЖО шанцуе, і знаходзіць ва ўсім пазітыўныя моманты. Не выйграў у латарэі? Ну дык што, затое і не прайграў. Не павысілі на пасадзе? Нервы цалейшымі будуць, не давядзецца разбіраць кожны канфлікт падначаленых. Нявеста/жаніх пакінулі дзеля другога чалавека? Як у песні спяваюць, «яшчэ невядома, каму пашанцавала». Ну і далей па тэксту: калі ў вас няма сабакі, яе не атруціць сусед, калі ў вас няма цёткі, то вам яе і не згубіць... Абсурд? Не меншы, чым перапісваць «пісьмы шчасця», пляваць цераз плячо пры сустрэчы з чорным катом, або за кіламетр абыходзіць жанчыну з пустымі вёдрамі. (Думаеце, гарадскім такая сітуацыя незнаёмая? Ого! Калі адключалі халодную ваду, у нас увесь раён цягаўся да калонкі). Хто ў што верыць, як кажуць. Асабіста я, напрыклад, не пазбавілася дзіцячай звычкі гадаць на нумарах машын. Лічыцца, што калі сустрэнеш машыну са «шчаслівым» нумарам — скажам, 22-33, або 71-71, або найлепей 44-44, то трэба хутка загадаць невялічкае жаданне, і яно збудзецца. З адным удакладненнем: жаданне трэба чамусьці загадваць, калі пасля «шчаслівай» машыны ўбачыш яшчэ мужчыну ў акулярах; і да гэтага моманту нельга ні з кім размаўляць. Глупства, канешне — але час ад часу лаўлю сябе на тым, што запамінаю нумар, шукаю ў натоўпе патрэбны персанаж, і загадваю: «Няхай пашанцуе!». Каму, у чым, калі пашанцуе — дадумаць ужо не паспяваю. Проста чамусьці веру, што гэта спрацуўае. Каму-небудзь. Няхай проста пашанцуе...

У суд Міёрскага раёна Віцебскай вобласці паступіла заява аб аб'яўленні адсутным без вестак **БЕРБЕРЫ Мансура Ігаравіча** 16 сакавіка 1982 года нараджэння, ураджэнца г. Самарканда Рэспублікі Узбекістан, апошняе вядомае месца жыхарства г. Міёры, вул. Дзяржынскага, дом 12. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць нейкія звесткі пра Берберы М.І., паведаміць іх суду Міёрскага раёна Віцебскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

ІНТЭРВ'Ю з «літаратурным неграм»

Літаратурны негр — гэта той, хто піша тэксты для іншых аўтараў. Часцей за ўсё размова ідзе пра літаратуру, якую адносяць да масавай культуры — так званае «чытво». Самы вядомы літаратурны негр — Агюст Маке, які пісаў чарнавікі для раманаў Дзюма. Вядома некалькі імёнаў і сучасных «літаратурных апрацоўшчыкаў» — як іх яшчэ называюць. Але вядомыя яны вузкаму колу літаратараў, а калі і прасочваюцца ў сродкі масавай інфармацыі, то ўсё роўна не запамінаюцца. Ды і навошта? Гэтыя людзі свядома абралі такі спосаб творчасці і заробку. Умовы — не раскрываць імёны заказчыкаў і не прэтэндаваць на ўласнае аўтарства — першыя, на якія яны гатовыя пайсці. Але вось чаму яны гэта робяць і што думаюць пра вынікі сваёй творчасці — пра гэта і была нагода распытаць уласна мне знаёмага «літаратурнага негра», які гатовы адказаць на інтэрв'ю, таксама паставіўшы ўмову: ніякіх імёнаў. Ну, амаль ніякіх...

— Раскажы, з чаго ўсё пачалося?

— Я пазычыў грошы. Буйную суму. Каб купіць кватэру.

Жонка была цяжарная другім дзіцем, а жыць не было дзе. І тут на працы ў жонкі прапанавалі будаўніцтва жылля. Але грошы — 5 тысяч долараў — трэба было ўнесці праз тыдзень. Мы пазычылі іх пад працэнты. Вось тады я і стаў «літаратурным неграм». Мае сябры яшчэ раней перайшлі на гэты хлеб. Яны і мне прапаноўвалі, але я адмаўляўся. Лічыў, што мая прафесія больш цікавая. Да таго ж, размова ішла не пра мастацкую літаратуру, а пра даведачную. Нешта кшталту папулярных энцыклапедый, гістарычныя серыі. Я пабаяўся, што ў мяне не хопіць ведаў. Але боязь гэтую давялося адкінуць, калі ўзнікла большая — не аддаць пазычаныя грошы і працэнты ў тэрмін.

— Табе выдаўцы таксама далі жорсткія тэрміны для напісання кнігі?

— Так, вельмі жорсткія, — месяц. І я іх не вытрымаў. З першай кнігай я здорава пакутаваў — пісаў марудна. Разам з тым мне вельмі падабалася пісаць. Нядаўна я падвозіў чалавека на вуліцу, дзе начамі пісаў першую сваю заказную кнігу... Камп'ютара ў мяне тады не было. Таму ноччу я ехаў у рэдакцыю маленькай газеткі, дзе мне дазволілі карыстацца камп'ютарам. Дык вось, праз дванаццаць гадоў я ў думках пакланіўся гэтаму месцу — бо ўдзячны лёсу за гэты перыяд свайго жыцця.

— Ноччу ты працаваў літаратурным неграм, а днём на асноўнай працы. Калі ж спаў?

— Я аддключаўся гадзін у пяць-шэсць. А потым прасынаўся пад гукі «Радыё-рокса». Тады там круцілі вельмі добрую музыку. Адну са сваіх любімых песень «Энігмы» я пачуў аднойчы такой раніцай. Цудоўныя былі дні.

— Значыць, з першай кнігай ты ў тэрміны не ўклаўся?

— Я, магчыма, увогуле яе не дапісаў бы, калі б мой таварыш не дапамог мне набраць апошнія 400 радкоў. Я ўвогуле паў духам і баяўся нават падыходзіць да камп'ютара. Настолькі быў спустошаны маральна і фізічна.

— І тым не менш ты ўзяўся за другую.

— Адразу. Цяпер я ўжо ведаў, што, калі не вытрымаю тэрміны, пра якія кажа выдавец, ніхто забіваць мяне не стане.

— Выдаўцы ніякіх дагавораў з табой не заключалі?

— Не.

— І нідзе ў кнізе не было твайго імя?

— У нейкай з наступных кніг было маё прозвішча ў радку «літаратурная апрацоўка». На вокладцы стаяла англа-саксонскае прозвішча.

— Якое было патрабаванне выдаўца да твайго тэксту?

— Што тычыцца мастацкай літаратуры, то трэба было пагаварыць пэўны фільм і пераказаць літаратурна яго сюжэт, змяняючы прозвішчы персанажаў, і сам сюжэт перанесці зусім на іншую глебу. Напрыклад, ёсць казка пра Царэўну-жабу. Трэба перанесці гэтую фабулу ў нейкую далёкую будучыню...

Дык вось гэтае патрабаванне — перакладваць фабулу — я ніколі не выконваў. Чамусьці мне здавалася гэта зневажальным. Я рабіў выгляд, што так раблю, гэта значыць, на першай старонцы даваў зразумець выдаўцу, што размова ідзе пра азначаных герояў, каб ён не прыдзіраўся. А далей я прыдумваў сюжэт сам. Калі шчыра, напэўна, сюжэтчык з мяне не вельмі добры. Цяпер я прызнаю, што чужыя сюжэты былі больш прадуманыя, больш дакладна выбудаваныя, чым мае. Але я разумею і тое, чаму так рабіў. Я не імкнуўся толькі адбіваць радкі, толькі зарабляць грошы. Мне здавалася, што я зраблю нешта такое, што дазволіць мне называцца пісьменнікам. Я, вядома ж, памыляўся.

— І колькі ты напісаў такіх кніжак?

— Не памятаю. Спачатку я іх лічыў. Даваў чытаць сябрам. Гэта было магчыма таму, што рэальнага чалавека, прозвішча якога стаяла на вокладцы, не існавала. Радаваўся, калі сябры хвалілі. Але сярод знаёмых былі і такія, хто з пагардай выказваўся: «Такую літаратуру не чытаю!» Нават не зазірнуўшы пад вокладку. Я не крыўдзіўся. Потым перастаў кнігі даваць. Перастаў пра іх гаварыць. І перастаў іх лічыць. Калі колькасць кніг пераваліла за паўтара дзесятка... Але ўсё роўна кожная з іх — кавалак жыцця і частка мяне самога. Кожная адгукаецца ў душы...

— Плацілі табе спраўна?

— Ніколі, здаецца, не падманвалі. За першую кніжку я атрымаў 200 долараў. Гэта быў 1994 год. Па дагавору за старонку. Потым цану падняслі: па паўтара долара за старонку. Потым — пяць долараў за старонку, гэта ўжо былі заваражальныя расцэнкі, яны нараджалі такія мары!

— І ты кінуў асноўную сваю работу...

— Яна знікла сама па сабе. Кантора, у якой я працаваў, абанкруцілася і перастала існаваць. І я застаўся толькі з кніжкамі.

— Табе хапала гэтага заробку?

— У рынцыпе, калі атрыманыя грошы падзяліць на колькасць месяцаў, на працягу якіх пісалася кніга, то атрымлівалася даволі нядрэнная сума. Але гэта былі выплаты нерэгулярныя, таму час ад часу сям'я адчувала нястачу.

— Ты спрабаваў дабіцца, каб на вокладцы паставілі тваё прозвішча?

— Спрабаваў. Мне адказалі: жадаеш сваё прозвішча — пішы. Але ў нас іншая ніша. Мы можам табе нават падказаць людзей, якія, магчыма, надрукуюць кнігу пад тваім прозвішчам. Але тады з грашыма будзе іншы расклад. І выдавец паказваў мне сваю кнігу і казаў: «Вось, за яе выданне я заплацію тры тысячы долараў. Гэта мая кніга, пад маім прозвішчам, тут напісана тое, што мне падабаецца, тое, за што я адказваю. Больш за тое, я заплацію за гэта грошы!».

— Якім жа тады чынам пісьменнікі зарабляюць?

— Вельмі няпроста. Тут заўсёды працуе імя. Калі ты вядомы, то зможаш надрукавацца і атрымаць нейкія грошы. Калі ты не вядомы ўвогуле, то павінен напісаць нешта геніяльнае і пры гэтым натраціць на выдавецтва, у якім працуе вельмі вясёлы і вельмі не стомлены чалавек. Які, да таго ж, вельмі смелы. І дырэктар выдавецтва павінен быць адпаведны. Альбо — знаёмствы. Знаёмстваў у мяне ніякіх не было.

— Як жа так? Ты ж супрацоўнічаў пераважна з буйнымі выдавецтвамі.

— У нас былі фінансавыя адносіны. Усё ж такі адна кніга выйшла пад маім уласным псеўданімам (прозвішча выдаўцу паказалася немілагучным). Рэдактар спадзяваўся, што я заяўляю як бы новае імя. І пасыпаюцца наступныя творы пад гэтым псеўданімам як з рогу дастатку. Гэта неабходна — каб імя раскруціць. Творы не пасыпаліся. Бо наступіў дэфолт. Летам 1998 года я павінен быў аддаць наступную кнігу пад гэтым псеўданімам, але пасля размовы з рэдактарам зразумеў, што справы — дрэнь. Мне прапанавалі зусім іншыя грошы, не тыя, ра якія мы дагаворваліся спачатку. І тады я яе прадаў пад іншым, раскручаным, але нерэальным імем. Такія імёны называюць у літаратурным коле «брацкай магілай» — бо за імі можа стаяць дзесятак «літаратурных неграў».

— Тым не менш пазней ты заключыў некалькі дагавораў з выдавецтвамі...

— Гэтыя дагаворы нічога не дказваюць, яны заключаліся на асабістым узроўні. Я бярэся за рукапіс і падпісваю дагавор. У дагаворы стаіць маё імя, сапраўднае, мае пашпартныя даныя, рэквізіты выдавецтва. Але назва кнігі там умоўная. Заўсёды кніга потым называлася па-іншаму. Альбо я мяняў назву, альбо выдавецтва.

Адну кнігу, якая выйшла пасля дэфолту пад «калектыўным псеўданімам», я спрабаваў перавыдаць. Новае маскоўскае выдавецтва набірала партфель, але потым там змяніўся дырэктар, і выдавецтва рэзка змяніла нішу:

ЛЮДЗІ БОСЫЯ НЕ БУДУЦЬ

Станіслаў ПЛЮТО (злева) і Сяргей БУБЕН.

Дзелавыя людзі ва ўсім свеце адносяцца з павагай. Яны ведаюць, што такое канкурэнцыя, і ведаюць, як яе пераадолець. Яны ведаюць, што такое прыбытак, і ведаюць, як яго атрымаць. Яны ведаюць, што такое рызыка, і ведаюць, як яе мінімізаваць. Яны ведаюць, што такое поспех, і ведаюць, як яго дасягнуць. Яны ведаюць, што такое поспех, і ведаюць, як яго ўтрымаць. Яны ведаюць, што такое поспех, і ведаюць, як яго ўмацаваць. Яны ведаюць, што такое поспех, і ведаюць, як яго павялічыць. Яны ведаюць, што такое поспех, і ведаюць, як яго перадаць. Яны ведаюць, што такое поспех, і ведаюць, як яго...

Дзелавыя людзі ва ўсім свеце адносяцца з павагай. У іх ёсць хватка, прагматызм і па сваёй натуры яны не рамантыкі.

У часы Хрушчова мой дзядзька, паверыўшы, што з першым спадарожнікам у СССР наступіў камунізм, вярнуўся з Аргенціны на Радзіму. Запомнілася, як расказваючы пра жыццё ў Буэнас-Айрасе, дзядзька ўспомніў абшчыну, якая не пакідала сваіх у бядзе і падтрымлівала, але толькі на першым часе.

Адзін, атрымаўшы тую падтрымку, спачатку на вугле прадаваў розную драбязу: ніткі, іголкі, мыла... Праз нейкі год у чалавека з'явілася невялікая крама, а гадоў праз дзесяць ён ужо меў магазін. Як бачым, атрымаўшы шанц чалавек яго не ўпускаў, а той, хто не здолеў выбрацца, застаўся са сваімі праблемамі сам-насам — абшчына ўжо не звяртала на яго ўвагу.

❑ ❑ ❑

...Стрэлка на доме па вул. Леніна паказвае, што рамонт абутку знаходзіцца ў дварэ, зайшоў за кут і апынуўся каля дзвярэй, за якімі сходкі вялі ў падвал дома. Вось тут і адкрыў сваю майстэрню Станіслаў Плюто. І хоць сёння ў яго ўжо тры пункты рамонту абутку, тым не менш ён сам працягвае працаваць. Падчас майго прыходу С. Плюто сядзеў у цяльняшцы і пастукваў малатком па падэшве.

Успомнім, як у мінулым загадчык ці дырэктар нават невялікага Дома быту меў свой кабінет, наместніка, бухгалтара, і ні аднаго, і заўсёды быў пры гальштуку. І гэты факт таксама спрыяў таму, што наша сістэма бытавых паслуг ужо амаль поўнасцю развалілася. Тыя ж цырульні, фотастудыі даўно апынуліся ў прыватных руках, а цяпер вось майстэрні па рамонту абутку ў Баранавічах, за выключэннем дзвюх, у індывідуальных прадпрымальнікаў.

А С. Плюто пачынаў, як той знаёмы ў аргенцінскай сталіцы, толькі яго ніхто не падтрымаў — сам падымаўся. Па спецыяльнасці ён тэхнік-тэхнолаг прадзільнай вытворчасці, але, калі жыў у Брэсце, пайшоў на абутковую фабрыку і пачаўшы з вучня атрымаў прафесію. Затым вярнуўся да бацькоў у Новую Мыш пад Баранавічамі і падаўся працаваць у пасёлак Жамчужны — рамантаваў абутак у майстэрні райбыткамбіната. Папрацаваўшы і агледзеўшыся, стаў прадпрымальнікам, адкрыў свой пункт у пасёлку і ўзяў на работу чалавека. Але неўзабаве ўбачыў, што ў пасёлку асабліва не развернешся — няма людской плыні. Вось і давялося падацца ў горад.

Людзі, нягледзячы на агромністы выбар абутку ў магазінах, ідуць заказваць яго ў майстра.

А тут заказаў хапае, ва ўсякім разе, усе паліцы застаўлены абуткам. Падумалася, што рамантуюць туфлі ды боты найперш бедныя.

— Ды не, прыносяць і дарагі абутак, а куды падзенешся, калі абцас адваліўся, — усміхнуўся гаспадар, — ідуць бедныя, багатыя і мясцовыя чыноўнікі.

І як спецыяльна, пакуль мы размаўлялі, дзве жанчыны прыйшлі са сваёй бядой — абцасы падвялі проста на вуліцы.

Акрамя рамонту, С. Плюто вырабляе і новы абутак па індывідуальных заказах. Цікава, што людзі, нягледзячы на агромністы выбар абутку ў магазінах, ідуць заказваць у майстэрню, а яшчэ абутак вывозіцца на продаж па раёне.

Пакуль у прадпрымальніка тры работнікі, а з новага года, прайшоўшы перарэгістрацыю, Станіслаў Антонавіч адкрые фірму і ў штаце ўжо будзе 11 чалавек.

С. Плюто знайшоў сваю нішу — гэта не вялікае прадпрыемства і не цэнтр камп'ютарных гульняў, але тое, што ён робіць, — вельмі патрэбна людзям і Плюто ўжо адзначылі, ён быў лепшым прадпрымальнікам вобласці ў сваёй намінацыі.

Мясцовая ўлада адносіцца добра, ідзе насустрач, а яшчэ дзейнічае паніжальны каэфіцыент для бытавых паслуг, а гэта скідкі на арэнду памяшканняў.

С. Плюто нікому не перашкаджае, і ў яго ёсць прыбытак. Няхай і не такі ўжо вялікі, але ўсё залежыць ад работы. Рабочыя на здзельшчыне, і кожны мае тое, што зарабіў.

А яшчэ мне падумалася, што С. Плюто моцна стаіць на зямлі, бо што б у грамадстве ні адбывалася, людзі босыя хадзіць не будуць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Магчыма, чалавек з такім характарам і не выклікае прыхільнасць, але без яго ні адно грамадства не можа абысціся.

СВАЯ СПРАВА

4 81

БІЗНЭС, ЭКАНОМІКА, ФІНАНСЫ

Усё ў прыродзе мае свой пачатак: дзень пачынаецца з раніцы, навучальны год — з чыстай старонкі ў дзённіку, духмяны бохан хлеба — з маленькага зярняці. Куфель добрага піва пачынаецца на плантацыях хмелю.

МАЛАРЫЦКАЯ БАВАРЫЯ

У Беларусі прафесійным вырошчваннем хмелю займаюцца толькі ў адным месцы — на беларуска-германскім прадпрыемстве «Бізон», што на Маларытчыне.

У пачатку 1990-ых гадоў піваварны заводзік, які ў той час паспяхова працаваў пры калгасе «Маларыцкі», наведаў нямецкі доктар навук па піваваранню Клаўс Вільдынг. Ён загарэўся марай стварыць тут, на маларыцкіх землях, маленькую часцінку Баварыі. Яго мара ажыццявілася: на плантацыі ў 22 гектары сёння ўзнімаюцца ў неба на 7 і болей метраў пышныя, гатовыя да ўборкі, ліяны хмелю.

— Ураджайнасць сёлета нядрэнная, — расказвае дырэктар прадпрыемства Валерый Мікалаевіч Антановіч, — плануем атрымаць больш як 30 тон, гатовай да рэалізацыі прадукцыі. Такой колькасці будзе дастаткова, каб забяспечыць сыравінай ААТ «Брэсцкае піва». Акрамя гэтага пастаўляем хмель у Рэчыцу і Ліду. Попыт на маларыцкі хмель высокі. Тым больш, што набываць яго ў нас піваварным прадпрыемствам краіны ў фінансавым плане значна выгадней, чым у замежных хмеляводаў.

Пасля такіх слоў напрошваецца, здаецца, лагічны вывад: на «Бізоне» павінны з кожным годам павялічваць аб'ёмы вытворчасці. Сапраўды, так тут і робяць. Праўда, дасягаюць гэтага пакуль што за кошт павелічэння шчыльнасці высадкі раслін. Для расшырэння ж плантацыі, патрэбны сур'ёзныя інвестыцыі.

— Усталяваць новыя хмелешпалеры — гэта толькі першы крок, але для таго, каб яго ажыццявіць, колькі сродкаў неабходна ўкласці! На адзін гектар патрэбна каля 40 слупоў, кошт аднаго — 50 доларaў. Нескладана падлічыць. А яшчэ ж насадачны матэрыял! Ад яго якасці залежыць якасць атрыманага хмелю. Першапачаткова пасадачны матэрыял мы завозілі з Германіі, зараз у спецыяльнай «школцы» навучыліся вырошчваць свой. За гады эксперыментаў спыніліся на 4 сартах: двух — араматычнага хмелю і двух — высокаальфавага ці горкага. Самых значных выдаткаў запатрабуе тэхнічнае абнаўленне перапрацовачнага цэху, бо тое абсталяванне, на якім мы працуем сёння, не ў стане перапрацоўваць большыя аб'ёмы хмелю. Вядзем перамовы з «Крыніцай», якая, дарэчы, у год спажывае больш як 180 тон хмелю. Калі ўсё пойдзе гладка — чакай пашырэння! — радасна гаворыць Валерый Антановіч.

Сёння на хмелеплантацыях маларыцкага «Бізона» ва ўсю кіпіць уборка. Адна за адной падаюць ліяны. Сіратліва свецяць ужо голымі спінамі слупы хмелешпалер. З плантацыі хмель вязуць у перапрацовачны цэх. Яго яшчэ чакае шэраг працэдур: аддзяленне шышак, сушка пры тэмпературы не вышэй за 65 градусаў, прэсоўка, грануляванне — усё патрэбна зрабіць з маланкавай хуткасцю і з аптэкарскай дакладнасцю, каб атрымаць якасны хмель. Вядома каля 300 крытэрыяў ацэнкі якасці хмелю. Маларыцкія хмеляводы на практыцы пераканаліся, што іх хмель адпавядае сучасным патрабаванням.

Так што ўзнікае пытанне: «Чаму б БЕЛАРУСКАМУ піву не мець БЕЛАРУСКІ пачатак?!».

НА ЗДЫМКУ: уборачная брыгада: «Лахматы шмель, ды на маларыцкі хмель!».

Аляксандр АЛЕСІК.
Фота аўтара.

Першыя!

ЛЕПШАЯ МАЛАДАЯ ДАЯРКА МІНШЧЫНЫ ПРАЦУЕ Ў КЛЕЦКІМ РАЁНЕ

Днямі на клецкай зямлі прайшоў абласны конкурс маладых аператараў машыннага даення. Традыцыйна аператарамі машыннага даення працуюць жанчыны. Што і прадэманстраваў фэст у Клецку. Першае заданне — візітная картка кожнай удзельніцы. Пасля журы правярала тэарэтычныя веды па дзесяці тэстах, за кожны правільны адказ залічваўся адзін бал. Трэці этап — разборка і зборка даільнага апарата. Конкурснае заданне № 4 адбылося на вядомым племянным заводзе «Чырвоная Зорка». Тут удзельніцы прадэманстравалі навыкі ў тэхналогіі машыннага даення кароў. Трэцяй стала Святлана Гусакова з Мядзельшчыны, другой — Наталля Лагузава са Смалявіччыны, а лепшай маладой даяркай Міншчыны журы прызнала Тамару Есіс, якая прадстаўляла Клецкі раён.

Тамара вось ужо амаль дзесяць гадоў працуе ў сельскагаспадарчым вытворчым кааператыве «Кухчыцы». Занятак, можна сказаць, атрымала ў спадчыну — даяркамі працавалі маці і бабуля. У маладой жанчыны двое дзяцей: старэйшая дачка Надзейка вучыцца ў чацвёртым класе, а малодшы сын Алег сёлета толькі пайшоў у школу. Муж працуе будаўніком у той жа гаспадарцы, два гады таму маладая сям'я атрымала добры дом, у якім будзе дарэчы новенькі тэлевізар, які Тамара атрымала ў якасці каштоўнага падарунка за перамогу ў абласным конкурсе. «Безумоўна, вельмі хвалявалася, — усміхаецца лепшая сярод лепшых, — а самым складаным конкурсам для мяне пэўна стала разборка і зборка даільнага апарата. Каб усё добра і хутка зрабіць, ведаеце якую сілу трэба мець».

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ,
Клецкі раён.

Святлана Гусакова і Тамара Есіс — прызёры абласнога конкурсу маладых даярак.

Як зарабіць студэнту

ХТО ТАКІ «КАФЕЙНІК»?

— Кофф-ф-ф-э-э-э-э! — немалады ўжо мужчына каўказкай знешнасці выгляну ў сваёй гандлёвай палатцы на рынку і пацягнуўся ў сумку на поясе за грашыма. А да яго на гэты вокліч рушыла маладая дзяўчына ў аранжавай камізэльцы, штурхаючы перад сабой тачку з чатырма тэрмасамі. Такіх гандляроў кавай на рынках у народзе празвалі «кафейнікамі», дый, дарэчы, яны і самі сябе так называюць. «Ці цяжка працаваць «кафейнікам»? Ці шмат можна зарабіць такой працай?» — спрабую запытацца ў Лізы, у той самай дзяўчыны з тэрмасамі, якая паспела ўжо зрабіць мужчыне каву і нават даць рэшту.

— Ай, пачакай са сваімі пытаннямі! Унь, бачыш, насупраць жанчына таксама нешта хоча ў мяне набыць? — Ідзём! Ліза спрытна разварочвае сваю тачку і кіруе да жанчыны, грукочучы пластыкавымі коламі па асфальце.

Ну і добра. Пакуль яна забяспечвае кавай чарговага кліента, я вам трохі раскажу пра яе. Ліза вучыцца на другім курсе дзённага аддзялення Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М.Танка, а ў вольны ад заняткаў час працуе на сталічным рынку «Ждановічы» прадаўцом кавы. Вось ужо трэці тыдзень запар яна прачынаецца штодня (акрамя панядзелка) а палове шостай раніцы, збіраецца і едзе на «Жданы». Там з сямі да дванаццаці гадзін возіць цялежку з кіпнем па «сваіх» чатырох базарных радах, паглядваючы то направа, то налева ў пошуках чалавека, якому не хапае ў жыцці для поўнага ці частковага шчасця кубачка кавы або гарбаты. А пасля ляціць на маршрутцы ва ўніверсітэт, каб паспець на сваю другую змену. Пытаюся ў Лізы:

— Напэўна, цяжка вучыцца і працаваць адначасова?

— Вядома ж, цяжкавата... Але што рабіць: вучуся на платным аддзяленні, вось і трэба неяк круціцца. Дый заробак у мяне неблагі: недзе каля 180 тысяч за тыдзень. Калі трохі больш, калі менш — у залежнасці ад тавару, колькі прадам.

Параіў уладкавацца «кафейнікам» Лізе знаёмы хлопец, які сам працуе на «Ждановічах» і таксама прадае каву (дарэчы, калі дзяўчаты возяць каляску з тэрмасамі, то хлопцы кіпень носяць у спецыяльным заплечніку вагой каля 30 кілаграмаў). Ліза за трохі паразважала і згадзілася. У першы дзень яна паўгадзіны пабыла стажорам — пахадзіла разам з вопытнай дзяўчынай-«кафейнікам» і пераймала вопыт, а назаўтра ўжо сама працавала паўнавартасным прадаўцом гарачых напояў. Прайшло ўсяго тры тыдні, а ў Лізы ўжо ёсць невялікія сакрэты майстэрства:

— Галоўнае — не распыляцца, а вызначыць сабе некалькі гандлёвых радоў і па іх круціцца. Тады праз некаторы час прадаўцы будуць цябе ведаць і з'явіцца заўсёдныя кола кліентаў. А калі бегаць па ўсіх «Жданах», то пастаянных кліентаў не будзе. Дарэчы, тыя, хто мяне ведаюць, клічуць ужо не «кофе», а па імені — Ліза... А так, да кожнага чалавека трэба знайсці асабісты падыход: з кімсьці і пагутарыць паўхвілінкі трэба, а кагосьці — «завяваць» хуткасцю прыгатавання кавы ці гарбаты.

— А як да цябе ставяцца? Не хамяць пакупнікі? — пытаю ў дзяўчыны.

— Усякае бывае, — Ліза цяжка ўздыхае. — Але ў асноўным людзі ставяцца нядрэнна, асабліва жанчыны. Ад мужчын дык калі-некалі можна пачуць і непрыстойныя жартачкі... Тым больш што некалькі гадоў таму «кафейнікамі» працавала пара верш Кіплінга і маральна рыхтавалася да фанетыкі. А я глядзеў на яе і разважаў: «Такі чалавек не прападзе ў жыцці. Усяго толькі другі курс — а дзяўчына ўжо амаль што забяспечвае сваё самастойнае існаванне, а не сядзіць на бацькоўскай шыі да трыццаці гадоў... Многія не вераць, што студэнт можа зарабляць рэальныя грошы і пры гэтым не кідаць вучобу. Я дык лічу, што калі ёсць ахвота, то месца часовай працы заўсёды можна знайсці. І проста парада мной — жывы прыклад, які сцілла сядзіць на сядзенні ў маршрутцы і бубніць пра сябе нешта па-англійску».

Павел БЕРАСНЕЎ.

АНТУАНЕТА І ТАЙС МАЦІСЫ — ПРУЖАНСКІЯ ФЕРМЕРЫ

Мацісы — звычайныя фермеры. Яны арандуюць кавалак зямлі і гадуюць авечак. Летам статак пасецца на травах, зімой ферма ўтрымліваецца ў памяшканні і корміцца загадзя нарыхтаваным сенам. Асноўны прыбытак гаспадар атрымлівае ад продажу мяса. Апошнім часам ён, праўда, знайшоў партнёраў, каб перапрацоўваць воўну і шыць з яе коўдры. Ну і што ж тут асаблівага? — спытае нехта. — У кожным раёне цяпер ёсць фермеры. І сапраўды, нічога асаблівага, калі не ўлічваць, што Антуанета і Тайс выраслі ў далёкай Афрыцы на беразе цёплага акіяна.

Дома ў іх усе сцены завешаны прыгожымі, незвычайнымі, у нечым экзатычнымі для нас афрыканскімі пейзажамі. І хоць гаспадар рашуча гаворыць, што яны прыкіпелі душой да нашых мясцін, што не збіраюцца пакідаць Беларусь, туга па радзіме праступае нават у нотках голасу, калі Тайс згадвае пра Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку, адкуль яны прыехалі, і сваю родную Намібію, дзе ён нарадзіўся.

Калі я ехала да іх, то думала, што сустрэнуся з тыповымі афрыканскімі сялянамі, а пазнаёміцца давялося з адукаванымі, вельмі інтэлігентнымі людзьмі. Антуанета па спецыяльнасці педагог-псіхолаг, Тайс — інжынер-хімік. Як трапілі ў Пружаны?

Гэта цэлая гісторыя. Па вераванні Мацісы — прысцяжне, накшталт нашых баптыстаў. Пра невядомую Беларусь расказалі адзінаверцы як самую спакойную і бяспечную для жыцця. Антуанета кажа, што раней яна ведала толькі пра Расію. Гэтак жа і мы, ці многа ведаем пра Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку, акрамя таго, што яна самая развітая і багатая на кантыненце? Але там зараз, паводле слоў Мацісаў, шмат праблем. Некаторыя з іх родзічаў загінулі ад бандыцкіх куль. Дзядзьку Антуанеты, сяроднята фермера, расстралялі ў дварэ яго дома сярод белага дня. Самы прыбытковы бізнэс на іх радзіме, як яны кажуць, абсталяванне дамоў сістэмай бяспекі.

Тайс расказаў пра першае самае моцнае ўражанне ад Беларусі. Калі ён прыехаў сюды 13 гадоў таму, у першы ж дзень каля Кобрына ўбачыў карціну: жанчына прагаласавала і села ў спадарожную машыну. Потым яны паступова прывыкалі да таго, што вечарам на вуліцы горада можна ўбачыць дзяцей, падлеткаў без дарослых. У іх такое проста немагчыма. І тады яны вырашылі, што будуць жыць тут. Першай задачай стала вывучэнне мовы. Бо без ведання мовы, як сказала Антуанета, хлеба амаль нельга было купіць. Цяпер большасць магазінаў працуе па сістэме маркетаў, а раней гандаль ажыццяўляўся цераз прылаўкі. Значыць, патрабавалася веданне асноўных слоў. Так і вучылі рускую мову, пачынаючы з прадуктовай лексікі.

Зараз Мацісы добра валодаюць рускай, ведаюць таксама многа слоў і фраз па-беларуску. А вось дзеці гавораць па-руску нават без акцэнту. Яно і зразумела, малодшая частка сям'і нарадзілася тут і, хоць дома ўсе размаўляюць на роднай мове, адаптацыя дзяцей да мовы знаходжання праходзіць і больш хутка, і больш паспяхова. Бацька шкадуе, што выхоўваюцца дзеці ў адрыве ад бабуль і дзядуляў. Дазволіць себе ездзіць у госці хоць раз у год, пакуль цяжка матэрыяльна. Але ж некалькі разоў за гэты час сустракалі Каляды ўсёй сям'ёй на беразе акіяна.

Дзеці Рузана, Джон і Мац, вучацца ў мамінай школе. Антуанета навучае дзяцей сама згодна з праграмай, якая прынята ў іх на радзіме. Так вырашылі ў сям'і. Маці гаворыць, што пасля паўналецця яны самі вырашаць, дзе ім жыць — заставацца ў Беларусі ці ехаць у Афрыку. Таму адным з галоўных прадметаў стала родная мова. Распарадак дня ў сямейнай школе вельмі строгі. Зранку — дзве гадзіны заняткаў, затым перапынак на чай, потым зноў дзве гадзіны працягваюцца ўрокі. Пасля абеду Антуанета вязе дзяцей у горад, там яны наведваюць урокі рускай мовы ў звычайнай школе, далей — гурткі па інтарэсах: хто ідзе на секцыю ў Лядовы палац, хто на ўрок музыкі ў музычную школу. Дома ўсе збіраюцца толькі вечарам.

З фермай спраўляецца ў асноўным галава сям'і. Гаспадыні хапае клопату з дзецьмі. Як яна кажа, тэарэтычныя веды псіхолага не заўсёды дапамагаюць на практыцы. Кожны дзень прыносіць нейкія новыя педагагічныя праблемы, якія мусіш вырашаць прымяняючы не столькі псіхалогію і педагогіку, а чыста жыццёвую логіку. Маці шчыра радуецца, што ёсць магчымасць развіваць нейкія творчыя здольнасці дзяцей. Спортам і музыкай яны займаюцца з задавальненнем. Антуанета радая, што ў Пружанах з'явіўся Лядовы палац. Яна чула шмат скептычных выказванняў вакол гэтага аб'екта, асабліва пакуль ён будаваўся. «Цяпер аказалася, што гэта не белы слон, — кажа жанчына. І пытаецца, — ведаеце, што азначае гэта афрыканская прымаўка?». У адказ адмоўна ківаю галавой, і гаспадыня тлумачыць: «У нас белым слонам называюць нешта вялікае, звонку прывабнае, але ўнутры пустое, накшталт таго, што знешнасць падманлівая. А новая спартыўная ўстанова карыстаецца попытам, там я бачу многа дзяцей».

Цяпер у горад Мацісы ездзяць толькі па неабходнасці: зрабіць пакупкі ды ў сувязі з заняткамі дзяцей. А жывуць, як сапраўдныя фермеры, за горадам. Пяць гадоў таму яны набылі некалькі памяшканняў былога ваеннага гарадка каля вёскі Куплін. Адзін з будынкаў перабудавалі ў жылы дом. Будаўнічыя работы яшчэ далёка не закончаныя, але жыць можна, пакоі клапатлівай рукой гаспадыні паступова набываюць мілую хатнюю ўтульнасць. Адзін з яе галоўных «рабочых кабінетаў» — прасторная кухня з вялікім сталом, за якім памесцяцца не толькі сямейнікі, але і шмат гасцей. Цікаўлюся ў Антуанеты, аддае яна перавагу сваёй кухні ці прызвычаілася да нашай, беларускай? Яна кажа, што беларуская ёй вельмі падабаецца, але яна складаная. На прыгатаванне страў патрабуецца шмат часу. А ў іх дома прынята гатаваць ежу хутка з паўфабрыкатаў. Таму і загарэлася ідэяй купліянская фермерка адкрыць сваё кафэ ў Пружанах. Па задумцы, там будуць стравы афрыканскай кухні і шмат розных паўфабрыкатаў.

Праўда, задумка гэта прасоўваецца марудна. Шмат часу займае збор дакументаў, іх узгадненні. Аб гэтым мы гаварылі ў самым пачатку знаёмства. А як даведалася гаспадыня, што я з газеты, адразу паспяшалася перамяніць тэму: «Я не хачу нікога пакрыўдзіць. Калі такія законы і правілы, значыць, іх трэба выконваць». Але ж яна не губляе надзею, што задуманае спраўдзіцца, не цяпер, дык крыху пазней. Філасофскае стаўленне да жыцця, падобна, у іх сямейным характары. Тайса паважаюць усе суседзі, побач з авечай фермай ёсць некалькі прыватных прадпрыемстваў, яго палі мяжуюць з землямі «Агра-Калядзічы». Кіраўнік мясцовай гаспадаркі часам просіць фермера дапамагчы на сваім трактары справіцца з якой-небудзь тэрміновай работай. І Тайс, як правіла, не адмаўляе. «Памяркоўны, як сапраўдны беларус». — давялося пачуць такую ацэнку з вуснаў аднаго з суседзяў.

На пытанне, чаму менавіта авечкагадоўлю выбралі паўднёваафрыканскія пружанцы, гаспадар адказаў, што гэтым усё жыццё займаўся яго бацька. Таму і для сына ўсё аказалася не новым. Зараз ферма налічвае 300 галоў. Набылі свой трактар «Беларус» з разнастайнымі агрэгатамі, якія фермер увесь час удасканальвае, нешта прыдумвае, прыстройвае новае, — гаворыць жонка, — так і рэалізоўвае сябе як інжынер. А сакрэты жывёлагадоўлі, відаць, добра засвоіў ад бацькі, таму ферма дае прыбытак. Калі мы са старшынёй раённага Савета Віктарам Макарэвічам прыехалі да Мацісаў, выдаўся пагодлівы дзень і гаспадар спяшаўся дасушыць скошную атаву. А мы акурат трапілі на чай, які ладзіцца для дзяцей а 11-й гадзіне ў перапынку паміж заняткамі. Перад любой трапезай у іх найперш узносіцца хвала Госпаду. І прамаўляе яе галава сям'і, калі ён ёсць у гэты час дома. З павагі да гасцей Тайс сказаў малітву па-руску. І чаепіцце ад гэтага стала прыемным і светлым, нібы нейкі асаблівы абрад.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Пружанскі раён.
Фота аўтара.

У БЕЛАРУСІ З 1 ЛІСТАПАДА ЎВОДЗІЦЦА МАРКІРОЎКА КАНТРОЛЬНЫМІ ЗНАКАМІ ТЭЛЕВІЗАРАЎ

У Беларусі будзе пашыраны пералік тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы кантрольнымі (ідэнтыфікацыйнымі) знакамі. Аб гэтым паведамілі ў прэс-цэнтры Міністэрства па падатках і зборах.

У мэтах узмацнення дзяржаўнага кантролю за абаротам асобных груп тавараў з 1 лістапада гэтага года будзе ўведзена маркіроўка кантрольнымі знакамі тэлевізараў, за выключэннем тых, што былі ў выкарыстанні, пітной і мінеральнай вады ў спажывецкай тары, а таксама мыйных вадкападобных і пастападобных сродкаў.

Пералік тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы кантрольнымі знакамі, пашырыцца таксама з 1 сакавіка 2008 года. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў № 1178 ад 15 верасня 2007 года. У прыватнасці, да пераліку тавараў будуць дабаўлены яшчэ дзве таварныя пазіцыі — гадзіннікі, за выключэннем тых, што былі ў выкарыстанні, і вопат і яго заменнікі, атрыманыя з вопатнай кіслаты, у спажывецкай тары.

«Увядзенне маркіроўкі дасць магчымасць абараніць інтарэсы айчынных вытворцаў названых груп тавараў, павысіць уплыў і кантроль дзяржавы за іх абаротам», — адзначылі ў прэс-цэнтры.

Цяпер у пералік тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы кантрольнымі знакамі, уключаны: піва, маторныя маслы, алеі, ікра асятровых, гатовая або кансерваваная рыба, газіраваныя і слабаалкагольныя напіткі, парашкападобныя мыйныя сродкі, кава, чай, абутак, мабільныя тэлефоны, аўдыё- і відэакасеты і дыскі. Маркіроўцы падлягаюць як імпартуемыя, так і айчынныя тавары.

БЕЛТА.

Начны час

УПАСЦІ Ў СПЯЧКУ

Вядома, што добра спіцца здароваму, і наадварот, бяссонніца — прыкмета разладу ў арганізме.

УЦЁКІ АД АРТЭРЫЯЛЬНАЙ ГІПЕРТЭНЗІІ

Працяглае захворванне прыводзіць да змяненняў у галаўным мозгу. Гэта праяўляецца рознастайнымі сімптомамі, у тым ліку бяссонніцай. Да таго ж, у b-блакатараў, якія прымяняюцца для лячэння, ёсць падобны пабочны эфект. Яны часта выклікаюць парушэнні сну і з'яўленне кашмараў.

Калі ўрач ставіць гэты дыягназ, то медыкаменты неабходна прымаць усё жыццё, як і вытрымліваць дыету. Калі ж на фоне тэрапіі бяссонніца ўзмацняецца, доктар заменіць b-блакатары альтэрнатыўнымі сродкамі.

АДНАЎЛЕННЕ ПАСЛЯ ПЕРАГРУЗАК

Фізічныя нагрузкі, разавыя ці пастаянныя, могуць парушаць нармальны сон. Пасля спынення нагрузкі частка нейронаў працягвае працаваць, і ад іх працягваюць паступаць сігналы ў мозг. Пры хранічных нагрузках развіваецца астэнія — псіхафізічнае знясіленне.

Аднавіць сілы дапамогуць спакой, вітамінізаванае харчаванне, прагулкі два разы на дзень, адладжаны пітны рэжым. Добра дапамагаюць масаж і ванны з травамі.

СТРЭСАВАЕ ПАШКОДЖАННЕ

У многіх людзей, якія перажылі глыбокі стрэс, праз некалькі тыдняў, месяцаў і нават гадоў надыходзіць стан постстрэсавага расстройства. Гэтыя парушэнні часам застаюцца назаўсёды і суправаджаюцца трывогай і парушэннем сну.

Лячэнне тут звязана з працяглым прымяненнем лекавых прэпаратаў, а таксама адаптагенаў, у асноўным раслінная паходжання. Выкарыстоўваецца і фізіятэрапія. Без дадатковай дапамогі псіхатэрапеўта з сітуацыяй не справіцца.

ПРАВЕРЦЕ ЎНУТРАНЫЯ ОРГАНЫ

Парушэнні сну могуць выклікаць многія хваробы — ад нясмарку да астмы. Вядомы прыклады, калі чалавеку, у якога балела горла, снілася, што яго душаць і г.д. Падчас сну на пярэдні план выходзяць падаўленыя і слабыя ўнутраныя імпульсы. Таму бяссонніца можа быць прадвеснікам сур'ёзнага захворвання.

Бессэнсоўна змагацца з бяссонніцай, пакуль не пераадолеш хваробу, якая яе выклікае. Неабходна пракансультавацца з тэрапеўтам і прайсці абследаванне.

ГУДБАЙ, ДЭПРЭСІЯ

Астэнавегетатыўны сіндром і дэпрэсія — не адно і тое ж, хоць часта звязаныя. Ва ўсіх выпадках прысутнічаюць адчай, трывога, песімізм, парушэнне сну, раздражняльнасць, павышаная стомленасць, змены апетыту. Аднак пры дэпрэсіі самы дрэнны настрой адчуваецца адразу пасля абуджэння. Пры АВС самае горшае самаадчуванне — увечары.

Сярод медыкаментозных сродкаў найбольш часта прымяняюцца антыдэпрэсанты. Выкарыстоўваюцца таксама транквілізатары, вітаміны, гармоны, антыаксіданты, медыкаменты, якія паляпшаюць метабалізм клетак мозга і г.д. Прызначае іх урач-псіхіятр або псіхатэрапеўт.

ТОЛЬКІ НЕ АЛКАГОЛЬ

Алкаголь не ўсыпляе, а толькі часова «адключае» мозг. Ён выклікае скарачэнне цыклаў сну, недастатковасць глыбокага сну. У выніку чалавек прачынаецца, і сон становіцца менш паўнацэнным. Некаторыя ж пасля прыёму алкаголю спачатку моцна засынаюць, а праз некалькі гадзін прачынаюцца і ўжо не могуць заснуць. Нікацін з'яўляецца стымулятарам нервовай дзейнасці, таму адмова ад гэтай звычкі дапаможа вярнуць сон.

Для таго, каб вывесці з арганізма таксічныя рэчывы, выкарыстоўваюць мачагонныя сродкі, унутрывенныя ўліванні. Пасля прызначаюць вітаміны і іншыя прэпараты для аднаўлення.

ІНШЫ РЭЖЫМ ХАРЧАВАННЯ

Недахоп харчовых элементаў і праблемы са страўнікава-кішачным трактам спрыяюць развіццю бяссонніцы. Амінакіслата трыптафан, наадварот, спрыяе засыпанню. Народны снатворны сродак — выпіць на ноч цёплага малака з пячэннем — відаць, заснаваны на аблягчэнні ўсмоктвання трыптафану ў прысутнасці вугляводаў. Снатворны эфект могуць аказваць таксама індычка і бананы — прадукты з высокім утрыманнем трыптафану.

Ешце менш цукру — ён хутка засвойваецца і стымулюе работу галаўнога мозга. Імкніцеся выпіваць восем шклянак вады на дзень. Знішэйце спажыванне солі. Выдаліце кафеін. Ужывайце ежу, багатую на вітамін B, — рыбу, збожжавыя, арахіс, бананы і семкі.

Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

Краіна здароўя

Выпуск № 25 (38)

Доктар адкажа

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

На будучым тыдні дзяжурыць на «гарачай» тэлефоннай лініі Міністэрства аховы здароўя (222-70-80) будуць:

24 верасня — галоўны спецыяліст упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Вікторыя Пятроўна ВАЙЦЯХОВІЧ.

25 верасня — загадчык кансультацыйнага паліклінічнага аддзялення Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі Мая Анатольеўна ШЧУРЭВІЧ.

26 верасня — намеснік дырэктара НДІ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі па лячэбнай рабоце Анатоль Сяргеевіч МАЎРЫЧАЎ.

27 верасня — начальнік упраўлення медыцынскай статыстыкі, інфармацыйных тэхналогій і справаводства Міністэрства аховы здароўя Барыс Мікалаевіч АНДРАСЮК.

28 верасня — галоўны спецыяліст упраўлення кадравай палітыкі, установ адукацыі і знешніх сувязяў Міністэрства аховы здароўя Марына Анатольеўна ПЕЧАНКО.

У графіку магчымыя змяненні.

Супрацоўніцтва

ЕЎРАПЕЙСКІЯ МІНІСТРЫ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ ЗВЕРЫЛІ СТРАТЭГІЮ

Міністр аховы здароўя нашай краіны Васіль Жарко ўзяў удзел у 57-й сесіі Еўрапейскага рэгіянальнага камітэта Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, якая завяршыла сваю работу ў Бялградзе (Сербія).

Спектр тэм і праблем, якія ўзнімаліся ў ходзе сесіі, аказаўся надзвычай шырокім: гэта і стратэгія развіцця кадравых рэсурсаў сістэм аховы здароўя ў Еўропе, і барацьба з неінфекцыйнымі захворваннямі, у прыватнасці, абмяркоўваўся Другі еўрапейскі план дзеянняў у галіне харчовых прадуктаў і харчавання. Васіль Жарко выступіў на сесіі з дакладамі «Развіццё кадравых рэсурсаў сістэмы аховы здароўя Беларусі» і «Здароўе маці і дзяцей — назапашаны вопыт», а таксама ўзяў удзел у абмеркаванні справаздачы аб рабоце Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.

У ходзе сесіі былі запланаваны афіцыйныя сустрэчы міністра аховы здароўя Беларусі з дырэктарам Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Маркам Данзонам, міністрамі аховы здароўя краін СНД і міністрам аховы здароўя Турэцкай Рэспублікі.

«Удзел Васіля Жарко ў рабоце 57-й сесіі Еўрапейскага рэгіянальнага камітэта Сусветнай арганізацыі аховы здароўя паспрыяе далейшаму развіццю супрацоўніцтва нашай краіны з Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя і пашырэнню выкарыстання магчымасцяў гэтай арганізацыі», — спадзяюцца ў Міністэрстве аховы здароўя.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Супраць СНІДу

Сэксуальны небяспечны шлях

У Беларусі зарэгістравана каля 8,4 тысячы выпадкаў ВІЧ-інфекцыі. Толькі ў гэтым годзе выяўлена 648 ВІЧ-інфекцыяваных.

Паводле інфармацыі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, каля 65 працэнтаў заразіліся сёлета падчас сэксуальных кантактаў. Дарэчы, у 2005 годзе гаворка ішла пра 57 працэнтаў такіх выпадкаў, у 2006-м — пра 63 працэнты. На працягу 1996—2006 гадоў сярод ВІЧ-інфекцыяваных зменшылася ўдзельная вага 15—19-гадовых з 24 да 3 працэнтаў. У цэлым жа абсалютная большасць носьбітаў віруса — гэта моладзь ва ўзросце ад 15 да 29 гадоў. Ва ўзроставай групе ад 0 да 14 гадоў зарэгістравана 126 выпадкаў ВІЧ-інфекцыі. На першым месцы па колькасці зарэгістраваных выпадкаў знаходзіцца Гомельская вобласць, на другім — Мінская, на трэцім — горад Мінск.

Зараз у краіне 822 хворыя на СНІД. Сёлета гэты дыягназ быў выстаўлены 219 пацыентам.

Спецыялісты нагадваюць аб неабходнасці выкарыстання прэзерватыва падчас «выпадковых» палавых кантактаў, а таксама аб магчымасці ананімнай праверкі на ВІЧ у медустановах краіны.

Вета РУЖАНСКАЯ.

Дэмаграфічная бяспека

МАМА, ТАТА І ДЗІЦЯ

У Гродне адкрыты першы ў краіне абласны клінічны перынатальны цэнтр

Гродзенскі радзільны дом першым у Беларусі атрымаў статус абласнога клінічнага перынатальнага цэнтра. І гэта азначае не проста змену шыльды, а куды больш шырокае, чым у звычайным раддоме, кола абавязкаў: ва ўмовах адной клінікі будзе аказвацца спецыялізаваная стацыянарная і амбулаторна-паліклінічная дапамога сямейным парам, жанчынам рэпрадуктыўнага ўзросту, цяжарным і нованароджаным.

Рэканструкцыя чатырохпавярховага будынка галоўнай рододапаможнай установы Гродзеншчыны, падкрэслівае галоўны ўрач, выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Віктар Лісковіч, стала для абласной улады пытаннем прыярытэтным. З бюджэту вобласці толькі на будаўніча-аддзелачныя работы, якія былі выкананы ААТ «Гроднапрамбуд», выдзелілі сем мільярдаў рублёў. А яшчэ 5,2 мільярда рублёў за апошнія тры гады накіравалі на закупку 176 адзінак медыцынскага абсталявання сусветнага ўзроўню. Аб набыцці яшчэ 39 адзінак медтэхнікі на суму 2,2 мільярда рублёў паклапацілася Міністэрства аховы здароўя.

Абноўлены будынак радуе вока і знешне, і ўнутры. А асабліва важна тое, што аперацыйныя блокі і радзільныя залы аснашчаны медтэхнікай зусім не горш, чым еўрапейскія клінікі. Кіраўнік перынатальнага цэнтра Віктар Лісковіч знаёміць толькі з некаторымі навінкамі. У прыватнасці, устаноўлены хірургічныя і анэстэзіялагічныя кансолі з разводкай лячэбных газаў і сістэмай жыццезабеспячэння. Увод лекавых сродкаў ажыццяўляецца выключна шпрыцавымі дазатарамі. Рэспіраторная падтрымка ў аддзяленнях дарослай і дзіцячай рэанімацыі праводзіцца высакакласнымі апаратамі штучнай вентыляцыі лёгкіх. Апараты для размарожвання крыві дазволілі пазбегнуць трансфузійных ускладненняў. Мінімізацыі страты крыві пры аперацыях паслужыць апарат для лігіравання буйных сасудаў і электрахірургічныя нажы. Аддзяленні паталогіі і радзільныя залы аснашчаны кардыяманітарамі экспертнага класа «Оксфард». Сучасныя кювезы і апараты штучнай вентыляцыі лёгкіх дапамогуць у выхаджванні нованароджаных нават з паўкілаграмовай вагой. Дарэчы, за апошнія пяць гадоў узровень захворванняў нованароджаных скараціўся больш чым удвая, паказчык дзіцячай смяротнасці — больш чым у шэсць разоў і сёлета па выніках першага паўгоддзя склаў 0,7 праміле. З 2000 года не было выпадкаў мацярынскай смяротнасці.

Значна пашыраны цяпер і магчымасці клініка-дыягнастычнай лабараторыі цэнтра. Высакакласныя апараты дазваляюць пры мінімальным заборы крыві ў найкарацейшыя тэрміны правесці ўвесь неабходны спектр лабараторных даследаванняў. А ўльтрагукавыя сістэмы трохмернага і чатырохмернага адлюстравання забяспечваюць аб'ёмнае сканіраванне ўсіх органаў і сістэм, каб своечасова выявіць паталогію ў будучых мам і парокі развіцця ў дзяцей...

У складзе абласнога перынатальнага цэнтра 14 стацыянарных аддзяленняў на 215 ложкаў, кансультацыйна-дыягнастычнае аддзяленне «Шлюб і сям'я» (12 спецыялізаваных кабінетаў), аддзяленне медыка-генетычнага кансультавання, клініка-дыягнастычная лабараторыя, аддзяленне прамянёвай дыягностыкі, унутрыбальнічная аптэка. Пры гэтым кваліфікаваная дапамога даступна не толькі гродзенцам, але і жанчынам з паталогіяй цяжарнасці з усёй вобласці. Цэнтр займаецца пытаннямі планавання сям'і, прафілактыкай, дыягностыкай і лячэннем захворванняў рэпрадуктыўнай сістэмы, ускладненняў цяжарнасці і родаў, паслядородавага перыяду, захворванняў нованароджаных. На праблемах рэпрадуктыўнага здароўя ўсіх ахвотнікаў пракансультуюць вучоныя Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

Загадчыка педыятрычнага аддзялення Святлана ЛУКАШЫК і медсястра Таццяна СМОЛА каля кювеза, дзе праводзіцца штучная вентыляцыя лёгкіх нованароджанага і падтрымліваецца адпаведны тэмпературны рэжым

Сям'я ЮКАЛЬЧУК у палаце індывідуальнага догляду ў пасляродавы перыяд.

Фота Ярослава ВАНЮКЕВІЧА.

А яшчэ ў цэнтры створана лакальная камп'ютарная сетка, якой на сёння аб'яднаны ажно 130 камп'ютараў. Укаранілі камп'ютарныя праграмы па статыстыцы стацыянара і паліклінікі, персаніфікаванаму ўліку медыкаментаў, харчаванню хворых і іншыя. Створаны свой Інтэрнэт-сайт. А сістэма відэаназірання дазваляе ў рэжыме рэальнага часу кантраляваць арганізацыю лячэбна-дыягнастычнага працэсу. Таксама яна выкарыстоўваецца ў вучобе кадраў.

Барыс ПРАКОПЧЫК, Надзея НІКАЛАЕВА.

Інфарм-укол

ДАРОСЛЫМ ДЗІЦЯЧАЕ НЕ ПАДЫХОДЗІЦЬ

Разрэкламаваны дзіцячы прадукт «Расцішка» расійскай вытворчасці прызначаны для малых ад 3 да 6 гадоў. Аднак ці варта ўжываць яго «дзяўчынкам», якія даўно выйшлі з гэтага ўзросту?

Сапраўды, утрыманне кальцыю ў гэтым малочным прадукце ў 1,5—2 разы вышэйшае, чым у іншых. Аднак засваенне кальцыю залежыць не ад яго колькасці ў прадуктах, а ад суаднесенасці з фосфарам і магніем, а таксама ад віду солі. «Расцішка» — не самая лепшая крыніца кальцыю для дарослага чалавека. Утрыманне вітамінаў і мікраэлементаў, у тым ліку фосфару і магнію, у дзіцячых прадуктах адпавядае сутачнай патрэбе дзіцяці, але не дарослага, таму пераводзіць сябе на дыету з дзіцячых каш і пюрэ — значыць, поўнасцю адмаўляць сабе ў неабходных рэчывах, якія вызначаюць нашу актыўнасць, здароўе, знешні выгляд.

Дый ці ёсць неабходнасць у падобных ахвярах сёння, калі няцяжка купіць практычна любую гародніну, садавіну, сокі, нізкакаларыйныя малочныя прадукты, добрае мяса, што дае магчымасць шырокага выбару дыет? Тым больш, усе сакрэты добрых формаў зорак экрана ўтрымліваюць шмат агульных правілаў:

1. Не пераядаць, не есці перад сном.

2. Ежа павінна быць разнастайнай.

3. Больш агародніны, садавіны, сокаў.

4. Пазбягаць тлустага, салодкага, смажанага.

5. Выкарыстоўваць нізкакаларыйныя малочныя прадукты.

6. Выдаліць алкаголь і курэнне.

7. РЭГУЛЯРНАЯ фізічная нагрузка.

Лад жыцця

Самае масавае захворванне ў практалогіі — гемарой: бліжэй да 40 гадоў у той ці іншай ступені ад яго пакутуе палова насельніцтва свету. Прыкладна гэткая ж сітуацыя характэрная і для Беларусі. Толькі беларусы значна пазней за іншаземцаў «адкрываюцца» доктару і пачынаюць лячэнне. Між тым на першых стадыях захворвання магчыма прымяненне нетраўматычных і эфектыўных метадаў. Загадчык кафедры хірургіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра практалогіі доктар медыцынскіх навук, прафесар Аляксандр ВАРАБЕЙ заклікае не чакаць, пакуль хваробы тоўстага кішэчніка зробяць жыццё невыносным, а іх лячэнне — вельмі складаным.

Дзёгкі выхад

— Чалавека павінны насцярожыць і падштурхнуць звярнуцца да тэрапеўта, хірурга ці практолага любыя непрыемныя адчуванні ў заднім праходзе, запаленне, боль, з'яўленне крыві падчас наведвання прыбіральні. Гэтыя сімптомы могуць сведчыць аб 1—2-й стадыях з'яўлення гемарою. На 3-й стадыі ўтварэнні вялікія вузлы, а на 4-й яны выпадаюць не толькі пасля наведвання прыбіральні, але і пры хадзьбе.

— Што гэта за вузлы і колькі іх можа быць?

— У фінальным аддзеле — выхадзе з кішэчніку, заднім праходзе размяшчаюцца венозныя спляценні. Калі ў гэтай зоне парушаюцца ператокі артэрыяльнай і вянознай крыві, утвараюцца вузлы. Яны падобныя на вянозныя вузлы, якія маюць месца падчас варыкознай хваробы. Класічна ёсць тры кропкі для ўтварэння вузлоў, але бывае і татальны гемарой, калі імі заняты ўвесь задні праход. Паступова вузлы павялічваюцца ў памеры і расцягваюць слізістую, з'яўляецца кроватачывасць, паколькі слізістая пастаянна траўмуецца. У рэшце рэшт слізістая празмерна расцягваецца і вузлы выпадаюць.

— Верагодна, будучы хворы на гемарой доўга і ўпарта дапякае нечым сваю сістэму стрававання...

— Так і ёсць. Гемарой бывае, праўда, і другасным, пры хваробах печані, напрыклад, пры такім цяжкім захворванні, як цыроз, назіраецца расшырэнне венаў у сістэме стрававання. Але праблемы звычайнага чалавека пачынаюцца з бытавых запораў, сядзячага ладу жыцця, цяжкай фізічнай работы, злоўжывання алкаголем...

— І тоўстаму кішэчніку алкаголь не падабаецца?

— Ён выклікае застой крыві ў тазе. Пры ўжыванні алкагольных напояў парушаецца вянозны адток у гэтай зоне. Падобнае дзеянне аказвае кава ў вялікіх дозах, вострыя прадукты.

— А якім чынам гемарою «спрыяе» цяжарнасць?

— Сама па сабе цяжарнасць, паступовае павелічэнне аб'ёму жывата выклікае застой крыві ў тазе. Плюс самі роды могуць справакаваць гемарой, якога падчас цяжарнасці не назіралася. Дарэчы, цяжарнасць і роды — аснoўныя прычыны гемарою ў жанчын, а ў мужчын — празмерныя фізічныя нагрузкі і алкаголь.

— Будучым маці можна параіць што-небудзь у якасці прафілактыкі?

— Спецыфічнай прафілактыкі тут не існуе. Ускосны шлях — комплекс пэўных мерапрыемстваў ёсць, і ён агульны для ўсіх. Перш-наперш нельга дапускаць рэгулярных запораў. Ёсць, вядома ж, шэраг хвароб, якія іх правакуюць, але ў цэлым бытавыя запоры — гэта праблема сучаснага ладу жыцця. Менавіта яго можна смела абвінавачваць у страце натуральнага анальнага рэфлексу. Дзень павінен пачынацца павольна. Прачынацца варта хоць бы за гадзіну да выхаду на работу. Лежачы ў ложку, робім масаж жывата плоскай далонню па стрэлцы гадзінніка, устаём, нахіляемся, пацягваемся, выпіваем шклянку халоднай вады, што ўзбуджае харчовы рэфлекс, выконваем нескладаную гімнастыку і нармальна снедаем, а не выпіваем кубак кавы на бягу. І арганізм павінен спрацаваць належным чынам. На працягу дня трымаемся рацыянальнага і рэгулярнага харчавання, ужываем прадукты, багатыя на клятчатку, і здольныя ўтварыць добрую харчовую масу — хлеб (толькі не свежы), кашы, вотруб'е, любыя малочныя прадукты — не абавязкова кісламалочныя. Малако і тварог таксама запораў не выклікаюць. Ужываем курагу, чарнасліў, буракі, капусту, паболей садавіны і любой агародніны. Не толькі дзеля прадухілення мочакаменнай хваробы, але і для рэгуляцыі стула важна наблізіць да нормы пітны рэжым — 2 літры ў суткі.

— Некаторыя вымушаюць свой арганізм «самаачышчацца» штодня...

— Гэтага абсалютна не патрабуецца. У норме стул можа быць ад двух разоў у дзень да аднаго разу ў тры дні. Безумоўна, здараюцца збоі, напрыклад, падчас камандзіровак, працяглых паездак, але ў звычайным жыцці неабходна праналізаваць затрымку і выправіць сітуацыю. Дарэчы, яшчэ адзін важны момант — «мінус» сучаснага ладу жыцця — хаваецца ў нашых прыбіральнях. Керамічны ўнітаз — вораг кішэчніка. Натуральная поза для апраўлення — калені на ўзроўні падбародку. У іншым выпадку мышцы фінальнага аддзела размяшчаюцца не фізіялагічна. І нарэшце, застаецца назваць дастатковую фізічную актыўнасць, якая паляпшае і агульны краватак, і тонус кішэчніка. Карысна ў гэтым сэнсе плаванне, бег — такія віды спорту, дзе нагружаецца ўвесь арганізм.

— Калі «застой» усё ж такі ўзнік, ці можна выкарыстоўваць клізмы?

— Можна, толькі рабіць гэта варта правільна. Частыя і аб'ёмныя клізмы са звычайнай вадой вымываюць абаронча карысны слой, парушаюць мікробную флору. Лепей рабіць масляную клізму — са звычайным алеем. Тады мы проста справакуем прыродны рэфлекс, і ўсё адбудзецца натуральна.

— Якія метады прымяняюцца ў нас для лячэння гемарою на розных стадыях захворвання?

— На першых стадыях выкарыстоўваецца склеразуючы прэпарат, той, што ўводзіцца ў варыкозныя вузлы на нагах. Вузел пад яго ўздзеяннем трамбуецца. На 3-й стадыі разам з ваннамі, гідрамасажам, свечкамі прымяняецца латэкснае лігіраванне, калі на вузлы накідваюць спецыяльныя сціскаючыя калечкі, што правакуе іх адміранне. На 4-й даводзіцца выконваць, як правіла, класічныя аперацыі па выдаленню гемарою. У серцы для лячэння 3-й і 4-й стадый выкарыстоўваюцца і іншыя, малатраўматычныя метады, але яны вельмі дарагія. Неабходна заўважыць, што ўсе метады эфектыўныя толькі ў тым выпадку, калі чалавек змяніў лад жыцця. Пазбавіцца ад гемарою, які наступіў, амаль немагчыма, можна зменшыць яго праяўленні.

— Гемарой можа стаць «правакатарам» развіцця раку тоўстай кішкі?

— Калі ёсць сур'ёзнае працяглае раздражненне скуры вакол задняга праходу, то можа развіцца рак у гэтым месцы.

— Якія яшчэ распаўсюджаныя праблемы тоўстага кішэчніка і яго фінальнага аддзела можна назваць?

— Розныя запаленчыя захворванні тоўстага кішэчніка, сіндром раздражнёнага кішэчніка, калі хваробы быццам бы і няма, але чалавек адчувае пастаянны дыскамфорт. Такіх хворых становіцца ўсё больш. Гэта праблема ўсіх урбанізаваных краін. Назву ёй прыдумалі літаральна ў другой палове мінулага стагоддзя. Ва ўзнікненні сіндрому ёсць, безумоўна, і псіхалагічны аспект, рэакцыя на наваколле. Пад уздзеяннем пастаяннага раздражнення, стрэсаў кішэчнік не здольны працаваць, як трэба.

Рак тоўстага кішэчніка ў свеце знаходзіцца па распаўсюджанасці на 2—3 месцы, у Беларусі — дзесьці на 5—6-м у залежнасці ад рэгіёна. Па тэмпах прыросту гэты від раку — адзін з самых актыўных. 5—7 працэнтаў ад агульнай масы раку тоўстага кішэчніка абумоўлена спадчыннасцю. Сёння з дапамогай генетычнай дыягностыкі можна дакладна выявіць такія варыянты раку і прыняць адпаведныя меры па прадухіленню развіцця цяжкіх наступстваў захворвання. Астатнія прычыны развіцця раку кішэчніка вывучаюцца. Таму самым важным сёння з'яўляецца ранняе яго выяўленне і хуткае прымяненне хірургічнага лячэння. У 1-й стадыі гэта абяцае 5-гадовую выжывальнасць для 98 працэнтаў пацыентаў.

Дарэчы, на пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя міністрам аховы здароўя СССР быў падпісаны загад аб абавязковым даследаванні прамой кішкі ўсім, хто звяртаецца ў паліклініку. Гэта была цудоўная спроба прафілактаваць гэты від раку. На жаль, яна не стала магчымай па фінансавых і іншых прычынах. Значыць, варта параіць бацькам размяшчаецца даволі нізка, выведзеная стома застаецца на ўсё жыццё. Хворых з кішэчнымі стомамі ў нашай краіне каля 5 тысяч.

— Трапіць на прыём да практолага зараз, спадзяюся, не праблема.

— На базе кожнай абласной бальніцы ёсць і аддзяленне практалогіі, і практолаг на кансультацыйным прыёме. У Мінску — аддзяленне практалогіі на базе 3-й клінікі, дзе функцыянуе гарадскі цэнтр калапракталогіі, практолаг на прыёме — у гарадскім дыягнастычным цэнтры, прыватных медцэнтрах, Рэспубліканскім прафесарска-кансультацыйным цэнтры, што на базе Рэспубліканскага цэнтра рэабілітацыі і бальнеалячэння. На базе абласной бальніцы — наш Рэспубліканскі цэнтр, які прызначаны для лячэння складаных выпадкаў і выканання складаных аперацый для жыхароў Беларусі. У некаторых паліклініках Мінска і буйных гарадоў ёсць практолагі на прыёме.

— Як навука практалогія развіваецца сёння ў Беларусі?

— Нагадаю, што гэта развіццё адбываецца на базе Рэспубліканскага цэнтра практалогіі, які існуе з 1979 года. За апошнія чатыры гады ў галіне практалогіі былі абаронены сем кандыдацкіх дысертацый. Крыху раней — тры доктарскія, і гэта толькі ў агульнай практалогіі, без уліку анкалогіі. Мы, дарэчы, цесна супрацоўнічаем з анколагамі, фізіёлагамі, патолагаанатамамі. У выніку — каля 15 вынаходніцтваў па новых аперацыях. Шэраг аперацый зроблены намі ўпершыню ў свеце. Яны, вядома ж, пераймаюцца, і адначасова мы пераймаем тое новае, што ствараецца ў іншых краінах. Так, мы навучыліся рабіць складаныя аперацыі пры язвавым каліце з дапамогай сусветнай навуковай літаратуры і пастаяннага навучання ў зямежнікаў. Як толькі навучыліся, пачалі рабіць унікальныя аперацыі ў сітуацыях, калі яны раней не магчыма выконвацца з-за нейкіх анатамічных асаблівасцяў — з прымяненнем сасудзістага элементу кішэчнай пластыкі. Вось ужо звыш дзесятка гадоў па агульнай практалогіі хворыя не адпраўляюцца па хірургічную дапамогу за мяжу. У апошнія чатыры гады ўсе абласныя бальніцы перажылі перааснашэнне, былі адрамантаваныя рэанімацыйныя аддзяленні і аперацыйныя блокі шэрагу бальніц.

Напраканцы кастрычніка правядзём майстар-клас па цікавай методыцы выдалення вузлоў — шляхам прашывання артэрыі. Без прытоку крыві гемарой знікае. Гэтай аперацыі ў свеце — гады тры. Сёлета я вучыўся рабіць яе ў Аўстрыі. У кастрычніку да нас прыедзе аўстрыйскі прафесар. Правядзём для нашых практолагаў і агульных хірургаў шэраг лекцый і прамую відэатрансляцыю з аперацыйнай у аўдыторыю.

Гутарыла Святлана БАРЫСЕНКА.

ВЕРАСЕНЬ — ЧАС ЭНТЭРАВІРУСАЎ: БЕРАЖЫЦЕ ДЗЯЦЕЙ...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Са жніўня ў сталіцы распачаўся сезонны пад'ём захворваемасці энтэравіруснымі інфекцыямі, пік якой звычайна прыпадае на верасень

Энтэравірусы вызначаюцца высокай устойлівасцю ў знешнім асяроддзі, што спрыяе іх інтэнсіўнаму назапашванню ў цёплы час года і актыўнай цыркуляцыі сярод насельніцтва. Узбуджальнік трапляе ў арганізм чалавека праз слізістую абалонку верхніх дыхальных шляхоў ці харчовага тракта. Энтэравірусная інфекцыя можа мець разнастайныя клінічныя праявы. Даволі часта захворванне працякае ў форме везікулярнага фарынгіту з паражэннем слізістай ротаглоткі. Таксама рэгіструюцца гастраэнтэрыты і ліхаманкавы стан энтэравіруснай прыроды. А пры пранікненні ўзбуджальніка ў кроў энтэравірусы разносяцца па ўсім арганізме і іх мішэнню могуць стаць цэнтральная нервовая сістэма, мышцы і скураныя покрывы чалавека.

Хварэюць на энтэравірусную інфекцыю пераважна дзеці першых двух гадоў жыцця — іх доля сярод захварэлых дасягае 50 працэнтаў. Спецыялісты тлумачаць гэта асаблівасцямі фарміравання імунітэту, а з узростам успрымальнасць да энтэравіруснай інфекцыі зніжаецца, таму сярод дарослых рэгіструюцца ўжо толькі адзінкавыя выпадкі захворвання.

— Я спадзяюся, што пік захворваемасці энтэравіруснай інфекцыяй, калі на працягу тыдня ў Мінску рэгістравалася больш за 50 выпадкаў гэтага захворвання, пераадолены, — паведаміла журналісту «Звязды» ***загадчыца эпідэміялагічнага аддзела Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Алена ФІСЕНКА.*** — Але энтэравірусная інфекцыя не страчвае пакуль сваёй актуальнасці. Таму каб папярэдзіць магчымыя непрыемнасці, я параіла б бацькам пазбягаць без вострай неабходнасці наведванняў з маленькімі дзецьмі месцаў масавага знаходжання людзей (супермаркетаў, рынкаў, грамадскага транспарту), сачыць за чысцінёй дзіцячых цацак і прадметаў, з якімі кантактуюць іх дзеці, старанна мыць садавіну, гародніну і зеляніну перад ужываннем. Калі садавіна прызначана для дзяцей, то яе трэба абавязкова абдаць кіпнем. Ну і, зразумела, трэба часцей мыць рукі, асабліва маленькім дзецям. Для дзяцей крыніцай інфекцыі, як правіла, становяцца іх бацькі, у якіх сімптомы захворвання або адсутнічаюць, або слаба выражаныя.

Алена Фісенка таксама паведаміла, што ў верасні ў сталіцы актывізаваліся і рэспіраторныя захворванні. Так, за апошні тыдзень у медыцынскія ўстановы горада звярнуліся з прастуднымі сімптомамі ўжо каля 15 тысяч чалавек. Для прыкладу, падчас эпідэміі грыпу такая ж колькасць захварэлых можа рэгістравацца на працягу адных толькі сутак. Большую палову захварэлых складаюць зноў-такі дзеці, якія пасля летніх канікулаў аказаліся ў калектывах і пачалі хварэць.

Надзея НІКАЛАЕВА.



ЧАМУ Ў ПАНЯДЗЕЛАК — ЯСНА, У ПЯТНІЦУ — ДАЖДЖЫ?

альбо Хто адказны за «аблокі Фантоцы»?

Вы чулі пра «аблокі Фантоцы» (Фантоцы — галоўны герой вядомай італьянскай камедыі, няўдачнік па жыцці, які нават у раі патраліў пад дождж)? Яшчэ іх называюць «праклёнам уік-энда» ці «суботнім праклёнам». Яны з'яўляюцца напярэдадні выхадных і на два дні псуюць надвор'е. З надыходам панядзелка яны знікаюць, каб зноў вярнуцца ў канцы працоўнага тыдня.

Прыкметы пра сямідзённыя цыклы надвор'я ў народзе бытавалі даўно. Першыя навуковыя даследаванні ў гэтым накірунку правялі нямецкія метэаролагі Дамінік Боймер і Бернхард Фогель (Інстытут метэаралогіі і кліматычных даследаванняў, Карлсруэ). Яны вывучылі каля 70 тысяч запісаў тыднёвых змен тэмператур, навяўнасці сонца, дажджоў і колькасці аблокаў за 15 гадоў і прыйшлі да высновы, што добрае надвор'е, сапраўды, часцей усталёўваецца на пачатку тыдня і пагаршаецца — бліжэй да выхадных. Яны сцвярджаюць, што «суботні праклён» «працуе» па ўсім свеце, ва ўсякім выпадку, там — дзе жывуць і адпачываюць людзі. А ў месцах, дзе дажджы — з'ява рэдкая, перад выхаднымі абавязкова пахаладае. У прыроды няма 7-дзённага падзелу, таму Боймер і Фогель тлумачаць з'яўленне «аблокаў Фантоцы» чалавечым фактарам. Іх ідэю падтрымаў італьянскі кліматолаг Антанэла Пазіні. Ён сцвярджае, што на працягу працоўнага тыдня ў атмасферы буйных гарадоў накопліваецца пыл, часцінкі якога адбіваюць і рассейваюць сонечныя промні, у выніку чаго ў уікэнд адбываецца пахаладанне. Акрамя таго, часціцы пылу становяцца цэнтрамі кандэнсацыі вільгаці — выпадае дождж. За выхадныя пыл асядае і ў панядзелак зноў усталёўваецца добрае надвор'е. Ці падзяляюць гэтую гіпотэзу нашы навукоўцы? Па каментарыі мы звярнуліся да дырэктара Інстытута праблем выкарыстання прыродных рэсурсаў і экалогіі НАН Беларусі, акадэміка, прафесара Уладзіміра ЛОГІНАВА.

— Вывучэннем клімату гарадоў мы займаемся даволі даўно і з упэўненасцю можам пацвердзіць, што буйныя гарады з'яўляюцца так званымі «астравамі цяпла»: у горадзе — у сярэднім — тэмпература паветра вышэйшая, чым у прыгарадзе. Гэта бачна пры параўнанні, напрыклад, Мінска і Мар'інай Горкі, якая знаходзіцца за 50 км ад сталіцы. Аднак на працягу сутак сітуацыя змяняецца. Летам у буйных гарадах днём тэмпература паветра ніжэйшая, чым у прыгарадзе, а ноччу — наадварот, вышэйшая. Гэта абумоўлена забруджанасцю паветра аэразолямі (пылам і іншымі часцінкамі), якія памяншаюць прыток прамой сонечнай радыяцыі. «Аэразольная папраўка» можа складаць ад 0,5 да 1 градуса па Цэльсію.

— Гэта значыць, што летнім днём у Мінску будзе на 0,5—1 градус халаднеў, чым у Мар'інай Горцы?

— Так, а ноччу — на 0,5—1 градус цяплей. Гэта абумоўлена яшчэ і тым, што аэразолі з'яўляюцца ядрамі кандэнсацыі пры ўтварэнні аблокаў. Умовы ўтварэння аблокаў у горадзе больш аптымальныя, чым у прыгарадзе.

— Вы падкрэслілі, што такая заканамернасць назіраецца летам, а што адбываецца зімой?

— Зімой такая залежнасць выражана слаба. Існуе пэўная колькасць фактараў, якія вызначаюць надвор'е і клімат. Першы з іх — радыяцыйны. У большай ступені ён праяўляе сябе ў цёплы перыяд года, калі прыток сонечнай радыяцыі істотна вышэйшы. Зімой на першы план выходзіць цыркуляцыйны фактар. Калі прыйдзе паветраная маса з Антарктыкі, яна будзе настолькі моцным фактарам, што «перакрые» ўплыў сонечнай радыяцыі. І наяўнасць аэразоляў не будзе вызначальным момантам у перамене надвор'я. Акрамя таго, магчыма, вы заўважалі, што ў халодны перыяд няма такога значнага перападу сутачных тэмператур, як летам, калі ноччу можа быць +15, а днём +25. Зімой тэмпературны «разбег» у сярэднім меншы, што ў тым ліку абумоўлена слабасцю ўплыву радыяцыйнага фактара.

— Летам, калі галоўную ролю іграе радыяцыйны фактар, колькасць прамой сонечнай радыяцыі залежыць і ад колькасці аэразоляў у паветры, а гэты паказчык напрыканцы працоўнага тыдня значна большы, чым у панядзелак...

— Сапраўды антрапагенны ўплыў на надвор'е нельга скідваць з рахунку, аднак адназначныя высновы наконт 7-дзённага цыкла рабіць рана. Гэтае пытанне патрабуе далейшага вывучэння і аналізу.

— Уладзімір Фёдаравіч, увогуле, ці назіраецца ў атмасферы цыклічнасць з перыядам у некалькі сутак?

— Падобныя цыклы ёсць. Гэта так званы натуральны сінаптычны перыяд. Яго працягласць у сярэднім 4—5 дзён. У яго межах (на блізкэйшыя некалькі сутак) можна спрагназаваць надвор'е з вялікай доляй верагоднасці. Затое цяжка прадказаць, калі наступіць «пералом» надвор'я. Строгага 7-дзённага цыкла ў атмасферы няма, таму нельга адназначна сцвярджаць, што ў панядзелак надвор'е абавязкова будзе добрым, а ў суботу-нядзелю — дрэнным (напрыклад, у гэтыя суботу і нядзелю надвор'е будзе ясным і цёплым). Паўтаруся: у пэўнай ступені гэты механізм можа «спрацоўваць» летам у буйных гарадах (па прычыне назапашвання аэразоляў у паветры).

— Прынамсі, аб аэразолях. Прынята лічыць, што ў гарадах з-за забруджанасці паветра выпадае значна больш туманаў...

— Гэта памылковае сцвярджэнне. Сапраўды, часціцы аэразолю з'яўляюцца ядрамі кандэнсацыі вільгаці, аднак не трэба забываць, што ў сярэднім температура паветра ў буйных гарадах вышэйшая, чым у прыгарадах. Для таго ж, каб адбылося перанасычэнне паветра і ўтварыўся туман, пры больш высокай температуры патрэбна значна больш вільгаці ў атмасферы. Таму нельга казаць, што ў мегаполісах туманаў больш, чым у прыгарадах, нягледзячы на «аэразольны» фактар.

— Вывучэннем клімату буйных гарадоў вучоныя займаюцца не адно дзесяцігоддзе, якімі асаблівасцямі ён вылучаецца сёння?

— Як я ўжо казаў, там у сярэднім цяплей, чым у прыгарадзе, больш ліўневых ападкаў і воблачнасці, меншая хуткасць ветру (ападкаў больш на ўсходзе Мінска, у Калодзішчах, чым на захадзе горада ў сярэднім на 50—70 мм у год). Акрамя таго, прамой сонечнай радыяцыі буйныя гарады атрымліваюць менш. Мы правялі адпаведнае даследаванне: разглядзелі асноўныя мегаполісы розных краін і ўбачылі, што, «дзякуючы» ім, за год у свеце адбываецца зніжэнне сумарнай сонечнай радыяцыі (сумы прамой і рассеянай) прыкладна на 0,04 працэнта ў год. Увогуле, з-за антрапагеннага ўздзеяння на клімат (я зараз кажу пра аэразолі штучнага паходжання) толькі за апошнія некалькі гадоў доля прамой сонечнай радыяцыі знізілася на некалькі працэнтаў (ва параўнанні: буйное вулканічнае вывяржэнне можа прыводзіць да зніжэння сумарнай сонечнай радыяцыі на 3—5 працэнтаў на працягу некалькіх месяцаў і нават года).

— І што нас чакае ў перспектыве?

— Калі не будуць прымацца канкрэтныя меры па змяншэнню аэразоляў у атмасферы, гэтая тэндэнцыя будзе працягвацца.

— Ёсць меркаванне, што прычынай «суботняга праклёну» можа з'яўляцца ўздзеянне Сонца...

— У свой час мы праводзілі аналіз індэксаў сонечнай актыўнасці і геамагнітных індэксаў. І ў апошніх часам знаходзілі 7-дзённы, альбо прыблізна 7-дзённы цыкл. Тлумачэнне простае. Перыяд абарачэння Сонца вакол сябе складае 27,3 сутак (на высокіх шыротах Сонца такі перыяд складае каля 29 сутак). Калі на паверхні Сонца (на тым яго баку, што «глядзіць» на Зямлю) з'яўляецца актыўнае ўтварэнне, яно можа ўздзейнічаць на нашу планету. А калі такіх актыўных утварэнняў з'явіцца 4, то іх уздзеянне Зямля будзе адчуваць кожныя 7 дзён. Аднак такое здараецца рэдка.

— А як гэта ўплывае на змены надвор'я?

— Ёсць статыстыка, якая сведчыць аб наяўнасці 27-дзённага атмасфернага цыкла Зямлі, аднак рабіць прагноз надвор'я, абапіраючыся на яе, нельга. Увогуле, значнасць уплыву Сонца на клімат Зямлі сёння — пытанне дыскусійнае. Кропка тут яшчэ не пастаўлена.

Гутарыла Інга МІНДАЛЁВА.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Львы могуць пераходзіць на іншую работу, а Шалі — заняцца творчымі праектамі

ВАЕН. На гэтым тыдні, хутчэй за ўсё, зможаце ўздыхнуць спакойна. Вы практычна вырашылі ўсе назапашаныя праблемы, засталося толькі нязначныя недапрацоўкі. Прысвяціце больш часу адпачынку. Яшчэ лепш узяць водпуск і накіравацца ў падарожжа. Актыўны адпачынак — цудоўны сродак, які дазваляе назапасіць сілы і сканцэнтравацца на будучых здзяйсненнях. У аўторак можа паступіць цікавая і важная інфармацыя. Магчыма, вам удасца наладзіць усе віды супрацоўніцтва, якія толькі спатрэбяцца. Серада і чацвер удалыя для заключэння партнёрскіх пагадненняў. Проціпаказана праца, якая звязана з агнём, металам і вострымі інструментамі. У пятніцу верагодна павышэнне працаздольнасці, вы можаце паспець практычна ўсё, што запланавалі, — і нават больш.

ЦЯЛЕЦ. Пастарайцеся не перагружаць сябе на рабоце: лепш зрабіць менш, але больш якасна. Абставіны тыдня схіляюць да поспеху ў інтэлектуальнай працы і грамадскай дзейнасці. Першая палова тыдня падыходзіць для завяршэння работ і выпраўлення недапрацовак. Можаце дасягнуць мэты дзякуючы падтрымцы сяброў і саслужыўцаў. Не варта адмаўляцца ад дапамогі. У аўторак не спадзявайцеся на разуменне начальства і правярайце ўсе дакументы, якія да вас трапляюць, перш чым іх падпісаць. У серады будуць удалымі паездкі і камандзіроўкі. У пятніцу вас можа парадаваць выгадная прапанова. У выхадныя не выключаецца павышаная цікавасць да хатніх і сямейных пытанняў і паспяховае іх вырашэнне.

БЛІЗНЯТЫ. Вам неабходна засяродзіцца — лепш на малой, няхай не на самай галоўнай з задач. Для поспеху вельмі важны ўдалы старт, а памер атрыманай перамогі не істотны. Далей паласа шанцавання пашырыцца — неабходна толькі ўхапіць яе за танюсенькі край. Вашу душэўную раўнавагу можа парушыць адчуванне, што згублены нейкі блізкучы шанц. Нічога падобнага! Наадварот, варта падзякаваць лёсу за тое, што вы шчасліва пазбеглі праблем, з гэтым шанцам звязаных. У аўторак не спяшайцеся з ініцыятывай — пастарайцеся спакойна выконваць свае паўсядзённыя абавязкі. Трывога за блізкіх часткова апраўдана. Варта папрасіць іх аб большай асцярожнасці.

РАК. Праявіўшы мудрасць і стрыманасць, вы паспяхова справіцеся з усімі праблемамі. Старайцеся пазбягаць глабальных — тады зможаце ўдала вырашыць менш значныя, але больш рэальныя задачы. Не паддавайцеся эмоцыям — пачуцці могуць прымусіць неапраўдана рызыкаваць. У панядзелак пажадана не абмяркоўваць сур'ёзных пытанняў з начальствам. У аўторак не дазваляйце ўцягнуць сябе ў канфліктную сітуацыю — ён і без таго будзе няпростым днём. У чацвер магчыма падпісанне дагавораў і атрыманне важных дзелавых прапаноў. Субота — цудоўны дзень для прагулак на свежым паветры. Дробны рамонт у доме прынясе задавальненне, а невялікія пакупкі будуць выгадныя.

ЛЕЎ. Ва ўсіх пачынаннях неабходна захоўваць парадак у справаздачнасці. Пастарайцеся не ўступаць у канфлікт з тымі, хто сочыць за парадкам. На службе чакаюць вялікія поспехі, калі не будзеце разменьвацца на дробязі. Тыдзень удалы таксама і для пераходу на іншую работу — без праблем зможаце ўліцца ў новы калектыў. У панядзелак прыліў энергіі і цудоўнае самаадчуванне прымусяць дзейнічаць рашуча. Удасца ажыццявіць самыя смелыя планы. У пятніцу многія праблемы вырашацца самі па сабе, тое, чаго жадаеце, само прыйдзе да вас у рукі — карыстайцеся момантам.

ДЗЕВА. Могуць ажыццявіцца праекты, якія былі даўно адкладзены. Падзеі на рабоце будуць дастаткова непрадказальнымі. Праявіце ініцыятыву і актыўнасць. Пры гэтым памятайце, што партнёры здольны вас падтрымаць, але вам за гэта давядзецца ўдзельнічаць у вырашэнні чужых праблем. Вас чакае даволі цяжкая праца, але намаганні будуць шчодра ўзнагароджаны. Начальства настроена да вас добразычліва. Чацвер — спрыяльны дзень для рэалізацыі доўгатэрміновых праектаў. Зараз вам па сілах самыя складаныя задачы. Аднак верагодны праблемы ў асабістым жыцці. У суботу будзе цяжка схавацца ад непрыемнасцяў. Магчымыя канфлікты ў сям'і, разрыў партнёрскіх адносінаў. Пастарайцеся не адчайвацца.

ШАЛІ. Настае добры час для творчых праектаў, таму вам спатрэбяцца ініцыятыўнасць і рашучасць. У аўторак з'явіцца магчымасць выхаду на больш высокі прафесійны ўзровень з добрымі кар'ернымі перспектывамі. У чацвер не варта прызначаць важныя сустрэчы, бо, нягледзячы на ўсе намаганні, вы абавязкова спозніцеся. У выхадныя праявіце крыху пяшчоты ў дачыненні да блізкіх людзей.

СКАРПІЁН. Вашы поспехі ў прафесійнай дзейнасці вартыя зачаравання. Але вы так заняты работай, што каханы чалавек можа зусім скіснуць — яму не хапае вашай увагі. Будзьце з ім больш міласцівымі. Пажадана распланаваць гэты тыдзень, інакш ён будзе празмерна хаатычным. Пачынаючы з пятніцы ёсць верагоднасць паступлення каштоўнай інфармацыі — магчыма, з зусім нечаканай крыніцы. Дарэчы, пятніца — спрыяльны дзень для завяршэння незакончаных і адкладзеных у доўгую скрыню пытанняў.

СТРАЛЕЦ. Калі для вас кар'ера — адно з галоўных пытанняў светабудовы, то неабходна вызначыць, што вы хочаце ад жыцця. Пастарайцеся змяніць сістэму сваіх каштоўнасцяў — і ўбачыце, як зменіцца ўспрыманне свету. Пастарайцеся дапамагаць навакольным, але не ўзвальвайце ўсе праблемы на сябе. Наведайце цікавую выставу, канцэрт, спектакль — такія мерапрыемствы ўзбагацяць вас новымі ўражаннямі.

КАЗЯРОГ. Пастарайцеся ўціхамірыць свае амбіцыі, інакш ваш аўтарытэт можа апынуцца пад пагрозай. Неабходна правяраць інфармацыю, якую атрымліваеце. У панядзелак можа прыйсці добрая вестка, аднак, верагодна, яна будзе злёгку перабольшана. Зараз не час адхіляцца ад рэчаіснасці і паглыбляцца ў свет ілюзій. Не варта праяўляць сентыментальнасць. У сераду вас могуць парадаваць перспектыўныя дзелавыя прапановамі. Задумайцеся над зменай іміджу. Дзеці запатрабуюць клопату і пільнай увагі — яны будуць то радаваць, то засмучаць.

ВАДАЛЕЙ. Параўнальна лёгка вырашыць ўсе пытанні, якія былі адкладзены ў доўгую скрыню. Надышоў час паказаць, чаму вас навучыла жыццё. Аднак будзьце больш асцярожнымі — не паддавайцеся спакусе крытыкаваць усё і ўсіх. Асабліва шкодна нападаць на калег. Магчыма, вам захочацца кагосьці разыграць, але ёсць рызыка, што вас няправільна зразумеюць. Лепш накіраваць лішнюю энергію на стваральную дзейнасць. У другой палове тыдня магчымы паспяховы рывок да вызначанай мэты. Нядзеля — спрыяльны дзень для вырашэння важных пытанняў.

РЫБЫ. Неабходна дакладна распланаваць тыдзень і вырашыць для сябе, чаго канкрэтна вы хочаце дасягнуць. Як толькі гэта адбудзецца, усё пачне рабіцца як бы само сабой. Можаце стаць цэнтрам усеагульнай увагі. Да вашых ідэй будуць прыслухоўвацца, але, магчыма, не заўсёды лёгка можна будзе знайсці партнёраў для іх рэалізацыі. Сябры дапамогуць развеяцца і падораць цікавыя ідэі. У выхадныя будзеце здольны пакарыць не адно сэрца сваёй рашучасцю, упэўненасцю ў сабе і абаянне.

Анталогія беларускай песні

І ТУДЫ ГАРА, І СЮДЫ ГАРА

У беларускім фальклоры зара — спадарожніца закаханых. Яна пабуджае іх думаць пра высокае, чыстае, вечнае. І чысціня пачуццяў — ад тонкага ўспрымання прыроднага хараства. Так і ў народнай песні «І туды гара, і сюды гара». У ёй па-вясковаму проста падаецца нязмушаная разгортванне пачуцця закаханых, іх непасрэднае захапленне навакольнай красою.

Міхась ШАВЫРКІН.

І туды гара, і сюды гара,
Паміж тымі горанькамі
Ясная зара.

Ясная зара з вечара
ўзышла, —
Маладая дзяўчыненька
Па воду ішла.

Не ўмывалася, не часалася,
А яна ж мне, маладому,
Спадабалася, —

Спадабалася над крынічанькай
Руса коса, сіні вочы,
Бела лічанька.

Ой, не піў бы я,
ой, не еў бы я,
З харошай дзяўчыненькай
Пасядзеў бы я.

І саха ў ралле, і валы ў ярме,
А такі ж мне, маладому,
Дзяўчына на ўме.

Дзяўчына мая,
напой мне каня
З зімненькае крынічанькі,
З поўнага вядра.

Ваду чэрпала,
накланілася,
Дала ж ямy белу ручку
Й зажурылася.

Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца.

Японія за два дні

Фестывалім!

У гэтыя выхадныя акунуцца ў Японію зможа кожны мінчанін і госць сталіцы. Для гэтага варта толькі пад'ехаць у Дом культуры МТЗ (Даўгабродская, 24) і ўзяць удзел у штогадовым фестывалі «Хіган», прысвечаным традыцыйнай і сучаснай японскай культуры. На працягу двух дзён можна будзе не толькі шмат чаго ўбачыць (напрыклад, японскую зброю і японскія прадметы побыту, тэатралізаваныя прадстаўленні), але і шмат чаму навучыцца, напрыклад выбраць фігуркі людзей, жывёл і птушак арыгамі, гуляць у го і сегі — настольныя лагічныя гульні, найбольш распаўсюджаныя ў Японіі.

Абавязкова трэба прыйсці на фестываль і ў суботу, і ў нядзелю. Бо гэта будуць зусім розныя дні: першы — прысвечаны традыцыям Краіны Узыходзячага Сонца, другі — сучаснай масавай культуры. Больш за тое, наведвальнікі тут будуць не проста гледачамі, але і... суддзямі. Яны павінны будуць адзначыць лепшыя тэатральныя пастаноўкі, дэфіле, кліпы і песні. Увогуле праграма фестывалю надзвычай насычаная і пазнавальная. На ім будуць працаваць пяць секцый, у тым ліку секцыі японскага малюнка (фан-арт, іон-ком), кансольных гульняў і Dance,dance revolution! (DDR) — танцавальна-музычнай машыны.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Муз-news

З-ЗА КАХАННЯ ЗГАРЭЛА... ПІЯНІНА

Экс-саліст гурта «Новы Іерусалім», а зараз сольны выканаўца Аляксандр Патліс выпусціў новы кліп на песню «Любоў спусцілася да нас з нябёсаў».

Зараз жа ўсё атрымалася зрабіць за два дні. У першы — рэжысёр Аляксандр Шульга здымаў прыгожыя заслаўскія ландшафты, упрыгожваў вялізнае дрэва штучнымі «нотнымі» лістамі і спальваў пасярод поля піяніна, у другі — часова «прапісаў» спевака ў Нацыянальную школу прыгажосці. «Нам вельмі патрэбна было ў кадры піяніна, якое гарыць — як сімвал таго, што ўсё рана ці позна на гэтай зямлі знікае, а любоў застаецца пасля нас і будзе жыць вечна», — расказвае Патліс. У аховяру планавалася прынесці стары інструмент дачкі спевака, але потым знаёмыя адшукалі ўжо непрыдатнае для ігры, затое добрае па фактуры піяніна.

Напрыканцы верасня кліп з'явіцца ў ратацыі тэлеканалаў. А спявак тым часам рыхтуецца да дабрачыннага канцэрта «Чыстае сэрца» з удзелам нямецкага музыканта Дэні Плэта. 12 кастрычніка ў Мінску, а 13 у Брэсце адбудуцца канцэрты, частка прыбытку ад якіх будзе выкарыстана для дапамогі ВІЧ-інфіцыраваным дзецям.

ЛІТВА ЎПАДАБАЛА «ПРЫГАЖУНЮ»

Спявачка Аня Шаркунова ўсё на свеце паспявае — і пытанне са сваім пераразмеркаванне вырашыць, і новыя творчыя кантакты завесці. Нядаўна, напрыклад, яна выступіла на юбілеі аднаго з элітных клубаў у Клайпедзе. І хаця Аню туды запрасіла дырэкцыя, а перад выступленнем клуб упырыгожваліі афішы амаль у рост спявачкі, завяваць літоўскую публіку аказалася зусім не проста.

«Да рускіх і беларусаў там ставяцца дастаткова скептычна, мясцовыя ўвогуле не размаўляюць па-рускі, — дзеліцца ўражаннямі Аня. — А тут я, са сваімі рускамоўнымі песнямі... аднак пасля трэцяй кампазіцыі наведвальнікі апладзіравалі, падарылі вялізны букет белых ружаў, а пад канец некалькі разоў выклікалі на біс, спявалі са мной «Прыгажуню» і запрашалі прыехаць зноў».

З МІНУЎШЧЫНЫ Ў БУДУЧЫНЮ

Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры» выдаў новы альбом «Распавядальная» пасля доўгага маўчання: апошні дыск быў запісаны ў 2001 годзе, яшчэ пры жыцці Уладзіміра Мулявіна. У альбом трапілі як старыя, так і новыя кампазіцыі гурта, але ўсе ў сучасных аранжыроўках.

Перад выданнем кампазіцыі з альбома былі прадэманстраваны на канцэртах у больш як 100 гарадах Беларусі, а таксама на гастролях у Таджыкістане; у бліжэйшы час калектыў запрошаны з выступленнямі ў Сібір. Пры гэтым БДА «Песняры» не звяжаюць на спробы іншых гуртоў «падзяліць» назву і рэпертуар легендарнага ВІА. «Па-колькі мы пастаянна выступаем, займаемся музыкай, нам няма часу высвятляць адносіны з іншымі калектывамі, якія ўзялі назву «Песняроў», — заўважае кіраўнік ансамбля Вячаслаў Шарапаў. — У нас ёсць права так называцца — права, дэлегаванае дзяржавай і народам».

Адначасова з новым альбомам «Песняры» прэзентавалі і свой абноўлены афіцыйны сайт — www.pesnyary.by, афармлены цалкам у адпаведнасці са стылістыкай калектыву. Напрыклад, на галоўнай старонцы Інтэрнэт-рэсурсу — колавая ліра, любімы інструмент заснавальніка ансамбля Уладзіміра Мулявіна.

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Добрыя людзі

Дубавец і вайна

Эсэіст — Сяргей Дубавец — любіць слова «вайна». У наш час, калі гэтае слова амаль сышло з ужытку, бо старанна замяняецца іншымі словазлучэннямі накшталт «узброены канфлікт» і «контртэрарыстычная аперацыя», выкарыстанне самога тэрміна выглядае архаічна. Але свой патэнцыял слова «вайна» яшчэ не згубіла. Таму і рэагаваць на яго даводзіцца жорстка. Вось што піша Дубавец: «Сёньняшнюю — апошнюю з сэрыі перадач на сотыя ўгодкі «Нашай Нівы» — я прысьвяцiў галоўнаму ўроку першай беларускай газэты. Гаворка пойдзе пра вайну палітыкі з культурай. Сто гадоў таму культура ў гэтай вайне перамагла, дзякуючы чаму мы маем цяпер сваю краіну і называем сябе беларусамі...» Эфектна! Тут і вайна, тут і перамога. Толькі, скажам праўду, ніякай вайны не было, адпаведна — і перамогі ніхто не атрымаў. А што ж было? Было спаборніцтва, але зусім іншае. Спаборнічалі два розныя падыходы да ўвасаблення ў рэальнасць беларускай ідэі. Мастацкі падыход і падыход навуковы. Тут зраблю адно ўдакладненне. Палітыку я залічваю да навуковага, рацыянальнага і прагматычнага падыходу. Для мяне палітыка з'яўляецца толькі часткай навукі наогул. А культура — панятак настолькі шырокі, што патрабуе асобнай гутаркі; бо напрыклад: сельскагаспадарчую культуру, культуру вырошчвання збожжа, я лічу першаснай з усіх адгалінаванняў і разгалінаванняў культуры. Цяпер вернемся да падыходаў. Відавочна, што падыход Купалы, Коласа, Багдановіча значна пераўзышоў падыход Уласава, Луцкевіча і Ластоўскага. Мастацкае пераўзышло навуковае, але не перамагло яго, бо не ваявала з ім. Таму казаць, што мы маем краіну Беларусь, дзякуючы вайне — абсурдна.

Валодзька і недаверлівасць



Нікому чалавек не даверае, нават самому сабе. Ёсць і такое. Валодзька мае ўзорна-недаверлівы характар. Свой танны старэнькі партфельчык ён зачыняе на кодавы замок, а потым яшчэ і на ключ, які хавае ў нагрудную кішэню пінжака, а тую зашпіляе на патаемны гузік. Грошы ён пералічвае па тры-чатыры разы. Лежачы ў ложку, ён некалькі разоў гучна перапытае жонку, ці зачыніла тая дзверы; і хоць тая адказвае сцвярджальна, ён усё адно падымаецца, ідзе і правярае: ці спраўна засунуты ключ у замочную адтуліну. Усіх сваіх пазычантаў ён трымае ў асобным спісе. Усе людзі ў яго ацэньваюцца ў грашовым эквіваленце: гэты не вярнуў дзесяць даляраў, значыцца, ён і каштуе дзесяць баксаў, той на Новы год пабіў фужэр коштам у пяць даляраў, значыцца — пяць. З-за такой недаверлівасці і падазронасці весці якія кольвек справы з Валодзькам амаль немагчыма. Калі чалавек настолькі не верыць табе, дык і ты перастаеш яму давяраць, пачынаеш сачыць, тут і выкрываецца ягоная схільнасць да дробязнага зладзейства. Даводзіцца сварыцца і разыходзіцца ў розныя бакі. Але завесці спіс з прозвішчамі тых, хто пазычыў у цябе грошы і не вярнуў, мусіць варта, ну не трымаць жа той спіс у галаве ўвесь час.

Аляксей Талстой і нядзеля

Граф Талстой, якога злыязыкі Іван Бунін называў Алёшка, так напісаў пра нядзелю ў сваім рамане «Гіперболоід інжынера Гарына»: «Людзі маленькія — прадаўцы з прадавачкамі, чыноўнікі ды служачыя — забаўляліся хто як мог у гэты дзень. Людзі вялікія, дзелавыя, салідныя сядзелі ў дамах каля камінаў. Нядзеля была днём чэрні, аддаддзеным ёй на шкамутанне і раздзіранне». Дзівіць не тое, што граф так напісаў, а тое, што ён гэта друкаваў, выдаваў і перавыдаваў мільённымі накладамі ў СССР. І ніхто савецкага графа за гэта не крытыкаваў. Чаму? А таму, што чырвоныя паны ставіліся да савецкага народа так, як і рускі граф Талстой, грэбліва. І яны аддавалі народу нядзелю на раздзіранне і шкамутанне.

Яўген і згасанне

Ён займаецца антыкварыятам, купляе і перапрадае старыя, але ўсё яшчэ каштоўныя, рэчы. З Яўгенам цікава пагаварыць пра таемныя шляхі дарагіх карцін і малюнкаў, зробленых таленавітымі майстрамі. У свой ненайлепшы час Яўген трапіў за краты і адседзеў у розных турмах пяць гадоў. Выйшаўшы на волю, ён вырашыў вярнуць сабе змарнаваныя гады: пачаў займацца спортам, добра і з густам апрануўся, накупляў выдатнага абутку і дарагой парфумы. Выглядае Яўген проста выдатна; адпаведна, дзяўчаты і жанчыны былі ад яго ў захапленні. Таму можна сказаць, што ён вярнуў сабе згубленую на доўгія гады паўнавартасную эротыку. Але прырода няўмольная. У шэсцьдзесят Яўген разбіў пяту, бег у парку, наступіў на камень, костка і трэснула. Давялося адмовіцца ад ранішніх прабежак. «Думаеш, я моцна расстроіўся? Зусім і не перажываю, бо прырода мудрая, яна так створана, што чалавечыя жаданні з узростам згасаюць. Раней мне і гэтага жадалася, і таго хацелася... І па тры спатканні ў адзін дзень у мяне было, а цяпер і жаданняў такога няма», — Яўген дзеліцца са мною сваімі назіраннямі за ўласнай прыродаю. Ведаючы яго, я не зусім давераю падобным словам, але халадок страху ад думкі пра блізкую старасць усё ж прабягае па спіне. «Смерці не баюся. Што такое смерць? Адно імгненне, а далей — нішто. А старасць страшная са сваімі: нямогласцю, разумовай слабізною і маразмам...» Я спрабую суцешыць антыквара: «Выглядаеш ты добра». — «Ведаю, у свае шэсцьдзесят я выглядаю на пяцьдзесят, але жаданняў у мяне роўна на шэсцьдзесят. І з гэтым нічога не зробіш».

Алег і 50 000 еўра

Тут мусяць быць праклёны, лаянка і брудныя словы... У майго добрага знаёмага — Алега — ўкралі сына. Бандзюкі вырашылі зарабіць 50 000 еўра, а найлепшым варыянтам заробку палічылі кіднэпінг. Крадзеж чалавека спланаваў аднакласнік ахвяры. Міліцыянты спрацавалі хутка. Хлопца яны вызвалілі і затрымалі трох бандзюкоў. Усё, як у трылеры, нават канцоўка, як у кіно, толькі пасля кінадэтэктыва ты спакойна засынаеш, а ў жыцці якраз наадварот. Ты, зразумела, радуешся, бо абышлося без ахвяраў, але разумееш: верагоднасць стаць наступным удзельнікам трылера моцна павялічылася. Халодная жорсткасць напаўняе душу... Як я высветліў пазней, Алег усё ж сам знайшоў бандытаў. Ён абышоў усіх сынавых аднакласнікаў, адзін з іх не начаваў дома, ён і стаў асноўным падазроным. Міліцыянты адно дапаглі Алегу вызваліць сына. Карацей, хочаш зрабіць добрае — рабі гэта сам, і табе дапамогуць.

Адам ГЛОБУС.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал 2007 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе ў рэдакцыю на адрасу: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прыза гадзіннікі, майкі, бейсболкі, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Карткі, наклееныя на паперу ці плёнку, або дасланыя **пасля 29 верасня 2007 года** па паштоваму штэмпелю атрымання да ўдзелу ў гульні не прымаюцца. Розыгрыш прызоў праводзіцца **5 кастрычніка 2007 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 17 кастрычніка**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 снежня 2007 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2007 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 5 верасня 2007 года. Удачы ў гульні!

6 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал 2007 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку_____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў_____
(аддзяленне сувязі)

_____**на IV квартал 2007 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ХЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЬЛЮ»

(індэкс выдання) _____

Колькасць камплектаў _____

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____
(прозвішча, ініцыялы)

Куды _____
(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месца | ліцтар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету _____ (індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ХЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЬЛЮ»

Кошт | падпіскі _____ руб. | пераадрасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____
(прозвішча, ініцыялы)

Куды _____
(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ІНТЭРНЭТ-ПАДТРЫМКА ДЛЯ ШКОЛ ЧАРНОБЫЛЬСКАГА РЭГІЁНА

**Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белтэлекам» стала ўдзельнікам праекта «Інфармацыйна-

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

УСМІХНЁМСЯ!

— Ты чаго такі сумны?

— Маю нявесту замуж аддаюць...

— Ды што ты кажаш?! А за каго?

— За мяне...

☺

Па шматлікіх просьбах удзельнікаў арганізавалі свята з конкурсамі: хто вып'е больш за ўсіх і хто састроіць міну.

Першы конкурс з-за недахопу інвентару выйграў электраманцёр Пятровіч, які з-за недагляду журы схітрыўся выступіць першым.

Другі конкурс безагаворачна выйграў водаправодчык Мітрыч, калі яму сказалі, што ён спазніўся на першы конкурс.

☺

— Што за глупства ты нясеш? Ты ў псіхіятра даўно быў?

— Учора!

— Ну і як?

— Забіў гада!

☺

Настаўнік гісторыі ў школе, якому вучні кожны год капалі бульбу, вырваў з усіх падручнікаў па гісторыі параграф аб адмене прыгоннага права ў 1861 годзе.

☺

— Так, малады чалавек, дзе служыць хочаце?

— У ППА! У ППА вазьміце! У ППА хачу служыць!

— А чаго гэта нервачкі ў вас такія сапсаваныя, гляджу, праблемы са слыхам пачынаюцца?

— Я каля аэрапорта жыву. У ППА мяне вазьміце! У ППА!!!

☺

Вырашыў кінуць піць. Раніцай наступнага дня зразумеў: не дакінуў...

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ВЫ ПРАСІЛІ РАСКАЗАЦЬ

Як правільна прыгатаваць настойку?

Прыгатаванне лекавых сродкаў у хатніх умовах патрабуе пэўных ведаў, аднак авалодаць імі няцяжка.

■ Для прыгатавання спіртавых настоек выкарыстоўваюць толькі посуд, які шчыльна закрываецца, інакш спірт будзе выветрывацца, а настойка не будзе такой моцнай і канцэнтраванай, як гэта неабходна для лячэння.

■ Ніколі не гатуйце і не захоўвайце настойкі ў металічным посудзе — ён акісляе кампаненты настойкі і памяншае яе лекавыя ўласцівасці.

■ Настойвайце інгрэдыенты ў цёплым месцы, але ўдалечыні ад прамых сонечных промняў (калі ў рэцэпце не сказана адваротнае) і не забывайце рэгулярна ўстрэсваць змесціва бутэлькі.

■ Калі ў вас ёсць вінны спірт, то выкарыстоўвайце яго, а на чыстым спірце настойвайце толькі тыя кампаненты, якія дрэнна растваряюцца ў гарэлцы ці вінным спірце (як правіла, гэта смалістыя часткі расліны). Мацунак віннага спірту павінен складаць 60 працэнтаў.

■ Калі ў рэцэпце прыгатавання настойкі ўказана гарэлка, то вы можаце замяніць яе 40-працэнтным спіртам.

■ Звычайна рэкамендуецца настойваць зёлкі ў суадносінах са спіртам 1:5, г.зн. на 20 г зёлак трэба ўзяць 100 мл спірту ці гарэлкі. У гэтым выпадку вы атрымаеце 20-працэнтную настойку.

■ Час прыгатавання настойкі павінен складаць не менш чым тыдзень (бываюць і выключэнні, і аб іх уважліва чытайце ў прапанаваным рэцэпце). У некаторых выпадках час настойвання павялічаны да 3 тыдняў. Столькі даводзіцца настойваць тыя карэньчыкі і зёлкі, якім патрэбны час, каб растварыцца ў спірце і выдзеліць усе свае карысныя рэчывы ў раствор.

■ Калі ў рэцэпце рэкамендуецца працадзіць гатовую настойку, то прафільтруйце яе праз 4 слаі марлі ці фільтравальную паперу, рэшткі сыравіны адцісніце, затым дайце сродку адстояцца некалькі дзён і паўторыце фільтраванне яшчэ раз. Гатовы прэпарат павінен набыць празрыстасць.

■ Ніколі не перавышайце ўказаную дазіроўку на прыём і колькасць прыёмаў у суткі — настойкі з'яўляюцца моцнадзейнымі сродкамі, і перадазіроўка можа толькі нашкодзіць. Асабліва гэта датычыць ядавітых зёлак. Дазіроўка, якая сустракаецца найбольш часта, для дарослых складае 20—30 кропель на адзін прыём. Дзецям урачы прызначаюць столькі кропель, колькі гадоў дзіцяці. Для дзіцяці настойку лепш разбавіць сталовай лыжкай вады.

■ Захоўвайце настойку ў бутэльках з цёмнага шкла, каб захаваць усе карысныя кампаненты. Тэрмін захоўвання настоек — некалькі гадоў.

ДА ВАШАГА СТАЛА

Рулецікі са свініны з яблыкамі

На 250 г свініны 3 яблыкі, 2 ст. лыжкі алею, соль і перац на смак.

Яблыкі абярыце, выдаліце асяродак і разрэжце кожнае на восем частак. Кавалак свініны (мякаць) парэжце на доўгія тонкія палоскі, злёгку пасаліце, паперчыце. Яблычныя лустачкі закруціце ў палоскі свініны і замацуйце драўлянымі шпількамі. Атрыманыя рулецікі раўнамерна абсмажце на алеі.

-2443-

ПАДКАЗКІ БЫВАЛЫХ

Доўгае жыццё букета

Ранняй восенню прысядзібныя і дачныя ўчасткі здаюцца адным вялікім кветнікам. Вялізныя яркія букеты дачнікі вязуць дамоў, у горад. Як захаваць свежасць садовых кветак, каб яны ўпрыгожвалі наша жыллё як мага даўжэй?

Калі вы вырашылі ўпрыгожыць пакой на дачы, лепш пайсці па кветкі зранку ці ўвечары. Прыхапіце з сабою вядзерца, напалавіну напоўненае цёплай вадой, нажніцы, секатар ці нож. Яны павінны быць чыстымі, каб пазбегнуць інфекцыі, і вострымі, каб зрэзы атрымаліся роўнымі. Сам зрэз робіць касым для лепшага ўсмоктвання вады. Выдаліце лісце, якое ў вазе апынецца пад вадой, адразу ж пастаўце кветкі ў вядро і занясіце ў дом.

Перш чым перастаўіць расліны ў вазу, пакіньце іх у цёмным халаднаватым месцы на 2—8 гадзін. Дадайце ў воду крыху цукру (3 ч. лыжкі на 600 мл вады). Кветкі стаяць у букеце добра, калі яны зрэзаны ў пэўнай стадыі распускання. Напрыклад, астры і вяргіні лепш зразаць, калі распусціліся амаль усе кветкі, а цюльпаны, нарцысы, півоні, ружы — на стадыі пачатку раскрыцця бутонаў.

Але, як правіла, зрэзаныя кветкі робяць доўгі шлях з саду ці поля да гарадской кватэры. За гэты час адчуваецца недахоп вады, і расліны апускаюць свае галоўкі. Першае, што трэба зрабіць дома, — падрэзаць сцябліны наўскасяк пад вадою на 2,5—3 см, выдаліць лісце з ніжняй часткі сцяблін і паставіць кветкі ў вядро з вадой ці пакласці іх у ванну.

Памятайце: любое абрэзванне травяністых сцяблін трэба рабіць пад вадой, каб паветраны затор не закрыў праводныя сасуды. Калі кветкі падвялі моцна, загарніце іх галоўкі ў паперу (каб не пашкодзіць гарачай парай), а канцы сцяблін на хвіліну апусціце ў ваду з тэмпературай 90—95 градусаў на глыбіню 2—2,5 см. Вельмі добра на гэту працэдуру адкліканцца ружы і многія іншыя расліны з дравяністым сцяблом.

Яшчэ адна прычына завядання некаторых відаў кветак у тым, што яны змяшчаюць млечны сок, які загусае на паветры і закупорвае праводныя сасуды. Ён ёсць у цыніі, маку, папараці, гартэнзіі. Каб ліквідавацъ гэту прычыну, канцы сцяблін трэба патрымацъ над полымем (свечкі, запальніцы, газавай гарэлкі) да таго часу, пакуль яны не пачарнеюць. Затым іх апускаюць у ваду.

Для многіх садовых кветак існуюць асаблівыя прыёмы, якія дапамагаюць ім доўга захоўваць свой свежы выгляд.

■ **Астра** — сцябліны ламаюць, злёгку дробняць драўляным малатком, перад тым, як апусціць іх у халодную ваду, на некалькі секунд апускаюць канцамі ў кіпень.

■ **Бархоткі**, **каледула, флёксы** — выдаляюць ніжняе лісце, абразаюць канцы сцяблін і ставяць глыбока ў халодную ваду.

■ **Вяргіні** — абразаюць канцы сцяблін, устаўляюць у іх пруткі прыдатнага дыяметра і ставяць у ваду.

■ **Гладыёлусы** — абразаюць канцы сцяблін і ставяць неглыбока ў халодную ваду. Самыя верхнія бутоны абрываюць, каб раскрыліся ўсе астатнія.

■ **Цынія** — абразаюць канцы сцяблін, устаўляюць у іх поласці пруткі і ставяць глыбока ў ваду.

Паклапаціцеся аб букеце кветак для гарадской кватэры загадзя. Не зразайце іх перад самым ад'ездам. У такім выпадку ўвесь тыдзень ваша жыллё будзе вам здавацца казачным лугам ці аранжарэяй.

-2444-

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк»

УВЕДОМЛЯЕТ

о закрытии Заводского отделения ОАО «Белинвестбанк» г. Минска (код 863) и создании на его базе с 10 ноября 2007 Отделения № 521 г. Минск ОАО «Белинвестбанк» (решение Наблюдательного совета банка от 19.07.2007 протокол № 39).

Активы и пассивы закрываемого отделения передаются на баланс ОАО «Белинвестбанк» (код 739), что обеспечит полное, своевременное и неукоснительное исполнение всех обязательств в ОАО «Белинвестбанк» перед вкладчиками и кредиторами.

Все ранее заключенные с физическими лицами договоры банковского вклада (депозита), текущего банковского счета, банковского кредита и иные продолжают действовать на тех же условиях.

САМАГОННЫ МІНІ-ЗАВОД

У лясным масіве ля вёскі Ліпава супрацоўнікі Глыбоцкага РАУС знайшлі маленькі завод па вытворчасці самагону. Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама, канфіскавалана 400 літраў самагоннай брагі. Яе знішчылі, як і «вытворчыя плошчы».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ГАРЭЛКА «АКРЫЛЯЕ»

Малады чалавек звалiўся з трэцяга паверха дома № 22 на вуліцы Сямёнава і атрымаў траўмы. 21-гадовы хлопец, добра выпіўшы, выйшаў на балкон і абапёрся на парэнчы. Аднак не ўтрымаўся і звалiўся ўніз. Небарака шпіталізаваны ў 5-ю гарадскую клінічную бальніцу з дыягназам: чэрапна-мазгавая траўма сярэдняй ступені цяжкасці.

Алена ПАЛЕВІКОВА, «Мінск—Навіны».

ЭКСКАВАТАРШЧЫК АТРЫМАЎ ТРАЎМЫ

Пры разборцы безгаспадарчага дома па вуліцы Меліяратараў у гарадскім пасёлку Асвея Верхнядзвінскага раёна, быў цяжка траўмаваны экскаватаршчык. Як паведамілі «Звяздзе» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама, на экскаватар упала цагляная сцяна. Праводзіцца праверка.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

СКАНВОРД+СУДОКУ (18 верасня). Па гарызанталі: Бабабаб. Фасоля. Тыбр. Нант. Дно. Бадо. Малі. Літке. Дыяганаль: «Сід». Куб. Напітак. «Алека». Агат. Ара. Рута. Доля. Эфа. Азон. Фара. Ранг. Рым. Гаявата. **Па вертыкалі:** Донг. Эпілог. Алыча. Дыяспара. Бардо. Астат. Фарба. Біном. Ніагара. Аладка. Румба. Фенол. Тура. Ілька. Уладар. Тубероза. Калон. Ярмоленка. Янг.

Судоку (адказы гл. у табліцы).

2	4	3	5	9	1	7	6	8
9	5	7	8	2	6	1	4	3
1	8	6	4	7	3	9	2	5
6	7	1	9	5	8	2	3	4
8	3	2	6	4	7	5	9	1
5	9	4	1	3	2	8	7	6
3	1	9	7	6	5	4	8	2
4	2	8	3	1	9	6	5	7
7	6	5	2	8	4	3	1	9

СКАНВОРД (15 верасня). Па гарызанталі: Смолава. Аляхно. Шклоў. Зара. Одра. Аўт. Бор. Кодэкс. Ядро. Раб. Спорт. Нунчакі. Пат. Каша. Барак. Славак. Церам. Сітнік. Тэст. Уран. Рота. Экран. Каласок. Арка. Сіла. Ямб. Даватар. Ура. Нерон. Статак. **Па вертыкалі:** Кунец. Сцэна. Здань. Лес. «Артэк». Крапіва. Калдун. Асака. Амур. Віша. Біток. Раствор. Крот. Ані. Лад. Лятун. Рад. Камар. Лаўка. Брас. Лось. Кастра. Бровар. Нос. Шапіто. Табар. Трак. Какошнік.

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА IV КВАРТАЛ 2007 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ



ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	8200 рублёў на месяц 24600 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	7850 рублёў на месяц 23550 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	13000 рублёў на месяц 39000 рублёў на квартал
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	11850 рублёў на месяц 35550 рублёў на квартал

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.54	19.10	12.16
Віцебск —	6.43	18.59	12.16
Магілёў —	6.44	19.00	12.16
Гомель —	6.41	18.56	12.15
Гродна —	7.10	19.25	12.15
Брэст —	7.10	19.25	12.15

Месяц

Першая квадра 19 верасня. Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Ганны, Аляксея, Васіля, Захара, Іосіфа, Мікіты, Рыгора, Сяргея, Феафана, Фядота, Харытона, Якіма;* ***К.*** *Маўрыцыя, Тамаша*

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+19 — +21 °C	МАСКВА	+16 — +18 °C
ВІЛЬНЮС	+17 — +19 °C	РЫГА	+15 — +17 °C
КІЕЎ	+19 — +21 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+13 — +15 °C

22 верасня

Дзве даты

1862 год — прэзідэнт ЗША Аўрам Лінкальн аб'явіў аб вызваленні ўсіх неграў-рабоў і аб забароне ў краіне рабства.

1935 год — у СССР заснавана званне Маршала Савецкага Саюза, уведзены афіцэрскія званні, акрамя генеральскіх. Першымі савецкімі маршаламі былі К. Варашылаў, С. Будзённы, М. Тухачэўскі, А. Ягораў, В. Блюхер. Трое апошніх расстраляны ў гады сталінскіх рэпрэсій. Усяго ў Савецкім Саюзе такое званне насіў 41 чалавек. Апошні раз яно было прысвоена ў 1990 годзе міністру абароны Дз. Язаву.

Цытата дня:

«Ісціна любіць крытыку, ад яе яна толькі выйграе; хлусня баіцца крытыкі, бо прайграе ад яе».

Дэні Дзідро (1713—1784), французскі філосаф-асветнік.

Прыхаваў самаробны пісталет

Уначы супрацоўнікі Гарадоцкага РАУС у доме беспрацоўнага ў гарадскім пасёлку Язерышча знайшлі самаробны пісталет калібру 5,6 міліметра і 20 спартыўна-паляўнічых патронаў такога ж калібру.

У аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама паведамілі, што згодна з заключэннем экспертызы пісталет з'яўляецца гладкаствольнай зброяй. Падчас праверкі было ўстаноўлена, што пісталет і патроны належаць другому беспрацоўнаму — жыхару вёскі Пільці Гродзенскай вобласці, 1981 года нараджэння, які набыў боепрыпасы ў невядомага. Узбуджана крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Згублены **атэстат аб сярэдняй адукацыі**, выдадзены ў 2001 годзе гімназіяй № 1 г. Ліды Гродзенскай вобласці на імя **Кессо Ілоны Пятроўны,** лічыць **несапраўдным**.

КЛЁВА!

ПРЫНАДЫ

КРЫХУ ПРА СПІНЕР-БЕЙТ

Як асобны від спінінгавых прынад, спінер-бейты вядомыя каля ста гадоў, але свой знешні выгляд яны сталі набываць у сярэдзіне мінулага стагоддзя. Агульная пабудова прынады — злучаныя карамыслам з дроціку цяжкая ніжняя частка і верхняя — з адным ці двума пялёсткамі — усё гэта было спачатку. Толькі да пэўнага моманту на размешчаны ў ніжняй частцы кручок прынаджвалася натуральная мёртвая рыбка, а потым былі варыянты са спецыяльна апрацаванымі свінымі скуркамі, але яны пратрымаліся нядоўга. Прынцыпова ўсё перамянілася, калі нехта прапанаваў у якасці ніжняга элементу для спінер-бейта так званую «спадніцу» з натуральнага каўчуку. Яна была зроблена практычна ў тым выглядзе, у якім яе выпускаюць зараз, і ўяўляла сабой некалькі дзесяткаў гібкіх рухомых нітак, зафіксаваных на свінцовай галоўцы перад кручком. Пазней «спадніцу» сталі рабіць з сінтэтычных матэрыялаў, але гэта сутнасці ўжо не змяніла. Часта замест «спадніцы» ставяць агружаны афсетны кручок і насаджваюць на яго твістар. Пялёсткі, што круцяцца, выконваюць ролю гукавой прынады, якую рыба адчувае бакавой лініяй. Форма пялёстка ўплывае на гукавую частату, якую прынада стварае пры праводцы.

Прынцыповае адрозненне сярод класічных спінер-бейтаў тычыцца колькасці і формы пялёсткаў. Лічыцца, што прынада з адным пялёсткам працуе як пры ярка выражанай вертыкальнай праводцы так і пры ступеньчатай. Тады як спінер-бейт з двума пялёсткамі больш разлічаны на раўнамерную ці амаль раўнамерную гарызантальную праводку. На шчупака наогул трэба ставіць буйнейшыя пялёсткі, чым на акуня. У спінер-бейтах звычайнай канструкцыі задні з двух пялёсткаў мацуецца праз завадное кольца, і змяніць яго зусім няцяжка. Дарэчы, «спадніцу» акрамя эксперыментаў даводзіцца мяняць яшчэ і таму, што гэтая частка прынады даступная і пры актыўнай лоўлі моцна пакутуе ад нападаў драпежнікаў: шчупак рэжа сінтэтычныя стужкі, акунь іх вышчыпвае. Наогул, «спадніца», у адрозненне ад самога спінер-бейта, лічыцца расходным матэрыялам, таму многія кампаніі, у якіх асартымент гэтага тыпу прынад вельмі шырокі, прапануюць і запасныя «спадніцы» да яго.

Класічны спінер-бейт — гэта пераважна прынада для неглыбокай стаячай вады з немалой колькасцю водарасцяў, для вадаёмаў, дзе растуць вертыкальныя расліны, асака, няшчыльны чарот і г.д. Скрозь такую траву ён праходзіць вельмі лёгка. Вось ляжачая трава стварае пэўныя праблемы, але ж варта паспрабаваць лавіць і ў такіх месцах — часам нават пры адным «чыстым» закідзе з трох гэтая прынада сябе апраўдвае. Што тычыцца тэхнікі, то тут галоўнае — не весці прынаду занадта хутка. Часам поспех прыносіць раўнамерная праводка, але можна паспрабаваць весці спінер-бейт хвалепадобна, хістаючы кончык спінінга. Калі вы заўважыце нейкі правал у падводнай расліннасці, варта даць «правалiцца» ў яго і прынадзе. Нямала шчупакоў бярэцца менавіта ў такія моманты. Нарэшце, часам дае нядрэнны вынік тэхніка, пры якой спінер-бейт ідзе амаль па самай паверхні, а пялёсткі ствараюць добра бачны бурун. Рэагуе на такую праводку ў першую чаргу акунь. Выкарыстоўваць спінер-бейт з канца красавіка і да канца кастрычніка.

Спінер-бейты розных відаў

МАЙСТЭРНЯ

СТРЫМЕР НА ШЧУПАКА «ЗРАБІ САМ»

Марскі кручок № 6 моцна зацiскаюць. Мушку вяжуць з дапамогай чырвонай шаўковай ніткі. У пачатку кручка прывязваюць пучок перламутрава-жоўтага люрэксу, які ў вадзе забяспечвае рух прынады ўверх-уніз.



Справа і злева ад люрэксу замацоўваюць два вялікія пеўневыя пяры. Натуральны выгін пёраў выкарыстоўваецца для таго, каб іх кончыкі распушыліся. Такі спосаб вязкі называецца «вываркай», таму што пры кожным падцягванні бародкі пёраў закрываюцца, а пры кожнай паўзе яны зноў адкрываюцца.

Наматаны на цаўё матэрыял фіксуюць кропляй клею, які хутка сохне. Цела робяць з жоўтай сінелі. Але гэтую аперацыю можна і апусціць: стрымер без звязанага цела плавае лепш. Усё залежыць ад таго, што для вас важней: спосаб праводкі ці знешні выгляд.

Пучок люрэксу ўплятаюць такім чынам, каб ён размяшчаўся ад кончыка стрымера і займаў 4—6 сантыметраў у накірунку да кольца. Кароткі пучок разварочваем назад і абмотваем шоўкам. Доўгія крылы ствараюць рух, а кароткія, хутчэй, аб'ём.

На пярэдняй частцы цела з люрэксу справа і злева ўстанаўліваюць і замацоўваюць прыгожыя жоўтыя пеўневыя пёры. Кончыкі яго накіраваныя ўнутр.

Маленькі пучок валокнаў з чырвонага пер'я імітуе жабры ці магчымае раненне ў рыбы.

Некаторыя рыбаловы не робяць шкляныя вочкі, але на прыкладзе гэтага стрымера пакажам, як іх прыладзіць. На такім шкляным воку трэба кусачкамі скарацiць дроцік і ўплесці на ім (воку) з правага і з левага бакоў галаву мушкі. Вочы робяць больш цяжкай усю канструкцыю, таму стрымер ідзе на глыбіню галавой уперад.

Пасля фіксацыі шкляных вочак клеем, гатуем галоўку з сінелі, намотваючы яе вакол кручка васьмёркай паміж вачыма і вакол асновы для іх. Атрымліваецца прыгожая аб'ёмная галоўка. У завяршэнне зрабіце яшчэ некалькі віткоў шоўкам, і хай зараз шчупак вырашае, што яму з гэтай прыгажосцю рабіць.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (*новая версія, якая тэсціруецца*)

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.376 Індэкс 63850. Зак. № 5174. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12